И63 500

И163
500

Е. САЛДАЦЕНКА

# СОВЕЦКАЯ АРМІЯ ВЫЗВАЛІЦЕЛЬНІЦА БЕЛАРУСІ

ОБЯЗАТЕЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
МІНСК · 1949

Е. САЛДАЦЕНКА

И63
500

# СОВЕЦКАЯ АРМІЯ— ВЫЗВАЛІЦЕЛЬНІЦА БЕЛАРУСІ

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР
Рэдакцыя палітычнай літаратуры
Мінск 1949

ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПУБЛИЧНЫЙ ИСТОРИЧЕСКИЙ БИБЛИОТЕКА

971371

Совецкая Армія за трыццаць адзін год свайго існавання прайшла вялікі і слаўны шлях. За гэты час ёй не раз прыходзілася выступаць са зброяй у руках на абарону сваёй Радзімы ад пасяганняў імперыялістычных драпежнікаў. Разам з усім сваім народам яна прайшла праз гарніла многіх суровых бітваў, з якіх заўсёды выходзіла пераможцам.

Авеяная нямеркнучай славай, Совецкая Армія выросла і загартавалася ў непераможную, грозную для ўсіх ворагаў сілу. Яна дастойна і з чэсцю апраўдвала давер'е народа, выконвала ўскладзеную на яе пачэсную і высокародную місію: быць надзейным абаронцам інтарэсаў совецкага народа. Яна з чэсцю і славай абараняла Совецкую соцыялістычную дзяржаву ад пасяганняў імперыялістаў, адстайвала соцыялістычныя заваёвы нашага народа, свабоду і незалежнасць совецкай Радзімы. Яна стаіць на варце міру і бяспекі народа і ўзнімае сваю праслаўленую ў баях грозную зброю толькі ў імя высакародных вызваленчых мэт.

У жорсткіх бітвах са знешнімі і ўнутранымі ворагамі Совецкая Армія пераўзышла ўсе арміі свету сваёй ваеннай арганізацыяй, сваёй першакласнай баявой тэхнікай, баявой вывучкай, багатырскім духам, ідэйнай перакананасцю, сталінскай ваеннай навукай, сваім уменнем біць і перамагаць ворагаў.

Узброеныя сілы Совецкага Саюза прадэманстравалі ў многіх бітвах сваю перавагу над усімі буржуазнымі арміямі, акалаціся невымерна мацнейшымі за сваіх ворагаў і атрымалі [illegible]кія перамогі, якія прынеслі бяссмертную славу нашай [illegible]зіме. Совецкі народ па праву ганарыцца сваімі доблеснымі

ўзброенымі сіламі, іх слаўнымі перамогамі і вялікімі заслугамі перад нашай айчынай.

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, якая звергла рэжым капіталістаў і памешчыкаў, перадала ўладу ў рукі рабочых і сялян. У нашай краіне была ўстаноўлена дыктатура пролетарыята, узнікла новая, совецкая дзяржава. Перамогшая рэволюцыя зламала, разбіла стары дзяржаўны апарат і яго састаўную частку — армію. «Старая армія, армія казарменнай муштроўкі, катавання салдат,—гаварыў вялікі Ленін у 1918 годзе, — адышла ў мінулае. Яна аддана на злом, і ад яе не засталося каменя на камені»[1]).

Перад прышоўшым да ўлады рабочым класам нашай краіны, кіруемым большэвіцкай партыяй, паўстала гістарычная задача арганізацыі ваеннай абароны маладой совецкай рэспублікі. Ленін і Сталін вучылі, што памешчыкі і капіталісты Расіі не могуць прымірыцца са стратай свайго панавання, што імперыялістычная буржуазія ўсіх краін свету таксама пастараецца скарыстаць момант, пакуль рэспубліка не ўзмацнела, каб па-разбойніцку напасці на яе і задушыць совецкую ўладу, аднавіць уладу эксплаататараў.

Узнікла настойлівая неабходнасць у стварэнні новай арміі, якая павінна была з'явіцца аплотам дыктатуры пролетарыята, совецкай улады. Кастрычніцкая рэволюцыя, якая стварыла новы, невядомы яшчэ гісторыі, вышэйшы тып дзяржавы — Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку—выклікала да жыцця і ўзброеныя сілы новага тыпу.

28 студзеня 1918 года В. І. Ленін падпісаў дэкрэт аб арганізацыі Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, а 14 лютага — дэкрэт аб стварэнні Чырвонага Флота.

Наша армія і флот ствараліся ў самы цяжкі для рэволюцыі перыяд, калі маладая совецкая рэспубліка падверглася ваеннаму нападу армій капіталістычных дзяржаў і ў першую чаргу германскага імперыялізма. Беларускі народ адным з першых прыняў на сябе ўдары кайзераўскіх войск. Па-разбойніцку захапіўшы Украіну і Беларусь, нямецкія полчышчы рухаліся ўжо да Петраграда — калыбелі Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі. Соцыялістычная айчына знаходзілася ў небяспецы. У гэты момант, 23 лютага 1918 года, атрады новай арміі нанеслі першае сур'ёзнае паражэнне войскам германскага імперыялізма на подступах да Петраграда — пад Нарвай і Псковам. Гэты дзень лічыцца днём нараджэння Совецкай Чырвонай Арміі.

[1]) **В. І. Ленін.** Творы, т. XXII, стар. 211.

Створаныя Леніным і Сталіным узброеныя сілы совецкай дзяржавы раслі і набіраліся сіл. Трыццаць другі год яны верна служаць справе абароны вялікіх заваёў Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, інтарэсаў працоўных, справе забеспячэння бяспекі айчыны, свабоды і незалежнасці нашай Радзімы.

★

## СОВЕЦКАЯ АРМІЯ — АРМІЯ НОВАГА ТЫПУ

Усякая дзяржава — вялікая і малая — мае сваю армію. Без арміі яна не можа існаваць. Армія — састаўная частка дзяржавы. Які характар дзяржавы, такая і яго армія. Паміж ваеннай арганізацыяй краіны і ўсім яе грамадскім і дзяржаўным ладам існуе арганічная сувязь. Вялікі Ленін у радзе сваіх прац перыяда руска-японскай вайны і першай рускай рэвалюцыі, указваючы на наяўнасць гэтай сувязі, выкрываў крывадушнасць лозунга аб палітычнай нейтральнасці арміі. Як у царскай Расіі ў мінулым, так і цяпер у любой капіталістычнай краіне, — армія з'яўляецца аплотам рэакцыі, верным слугой эксплаататараў у барацьбе супроць працоўных, катам дэмакратыі і палітычнай свабоды народа. У буржуазных краінах арміі нідзе не стаяць па-за палітыкай; яны служаць інтарэсам эксплаататараў, абараняюць інтарэсы пануючых класаў — капіталістаў і памешчыкаў. Буржуазныя пісьменнікі, гісторыкі, прапагандысты і юрысты «даказваюць», што буржуазныя арміі служаць усім класам, усяму грамадству. У сапраўднасці-ж гэтыя арміі ахоўваюць багацці эксплаататараў і шляхам ашуканства і палачнай дысцыпліны скарыстоўваюцца для падаўлення і прыгнечання працоўных сваёй краіны, для захопу чужых зямель і заняволення іншых народаў. Буржуазныя арміі Амерыкі, Англіі, Францыі і іншых імперыялістычных краін, выступаюць супроць тых, хто стаіць за дэмакратыю і свабоду. З'яўляючыся зброяй панавання капітала, яны паслухмяна выконваюць волю сваёй буржуазіі, скарыстоўваюцца як сродак барацьбы з дэмакратычнымі элементамі ўнутры краіны, слу-

жаць мэтам імперыялістычных авантур, заняволення малых дзяржаў і калоній.

Так, напрыклад, імперыялісты Англіі, якія стварылі каланіяльную імперыю, штыкамі сваёй арміі заняволілі і прыгнятаюць многія народы ў розных частках свету. Англійскія войскі арудуюць у Індыі, дапамагаючы сваім гаспадарам— буржуазіі, грабіць і эксплаатаваць яе 390-мільённае насельніцтва. Каланіяльны гнёт і заняволенне многіх народаў трымаецца на штыках англійскіх салдат і афіцэраў. Такія краіны, як Егіпет, Палестына, Ірак, знаходзяцца ў залежнасці ад англійскага імперыялізма, які паставіў тут свае войскі. Урад Злучаных Штатаў Амерыкі арганізуе вайну супроць грэчаскага народа. У студзені 1949 года грэчаскімі патрыётамі збіты амерыканскія самалёты, якія абстрэльвалі і бамбілі мірнае насельніцтва гарадоў Грэцыі.

Англійскія імперыялісты люта распраўляюцца з рабочымі, сялянамі і прагрэсіўнай інтэлігенцыяй Грэцыі, садзейнічаючы манарха-фашыстам у іх барацьбе з уласным грэчаскім народам. Пад надзейнай аховай англійскіх войск і амерыканскіх «ваенных місій» адбываюцца масавыя забойствы грэчаскіх патрыётаў, ганенні на дэмакратычна настроеных людзей, іх зверскія праследаванні.

У краінах Бліжняга і Сярэдняга Усходу Англія мае фактычна цэлую армію, якой камандуе генерал Джон Крокер. Буйныя ваенна-марскія сілы Англіі і ЗША знаходзяцца і ў басейне Сяродземнага мора.

Выконваючы волю сваёй буржуазіі, войскі ЗША ўдзельнічаюць у грамадзянскай вайне ў Кітаі, падаўляючы народна-вызваленчы рух у краіне з многамільённым насельніцтвам. У Паўднёвай Карэі разам з мясцовымі рэакцыянерамі амерыканскія ваенныя ўлады праводзяць масавыя арышты членаў дэмакратычных партый, забараняюць мітынгі і сходы працоўных, дапамагаюць здраднікам карэйскага народа.

Для падаўлення нацыянальна-вызваленчага руху ў Інданезіі выступілі войскі Галандыі, падтрымліваемыя англійскім і амерыканскім імперыялізмам. Апіраючыся на армію, галандскія імперыялісты захапілі тут вялікую тэрыторыю, самыя багатыя раёны — каучукавыя, цукровыя, кафейныя плантацыі і рысавыя палі, якія падвяргаюцца драпежніцкай эксплаатацыі. Пад пагрозай штыкоў галандскія імперыялісты прымушаюць мірнае насельніцтва Інданезіі працаваць на

плантацыях і на палях на іншаземных захопнікаў і ўстанаўліваюць тут каланіяльны рэжым.

Арміі капіталістычных дзяржаў скарыстоўваюцца як сродак падаўлення дэмакратычнага руху не толькі ў другіх краінах і калоніях, але і ў сваіх уласных. Французская армія, распраўляючыся з рабочымі стачачнікамі ў сваёй краіне ў перыяд лістападаўскіх забастовак 1947 года і ў мінулым годзе, прымяняла кулямёты, танкі і слёзатачывыя бомбы. Французскія імперыялісты ў мэтах нажывы, эксплаатацыі і грабяжу вядуць каланіяльную вайну ў Індакітаі. Імкнучыся ўстанавіць тут сваё панаванне, яны рушылі добра абучаную і забяспечаную навейшай тэхнікай 200-тысячную армію супроць Рэспублікі Вьетнам, гераічна адстайваючай сваю нацыянальную незалежнасць. З кастрычніка 1945 года тут вядзецца з боку французскага імперыялізма несправядлівая, захопніцкая вайна, якая прыносіць незлічоныя бядоты народу Індакітая.

Арміі капіталістычных краін заўсёды абаранялі і абараняюць інтарэсы памешчыкаў і капіталістаў і служаць сродкам ажыццяўлення іх разбойніцкай, захопніцкай палітыкі. У руках кіруючых эксплаататарскіх класаў узброеныя сілы прадстаўляюць сабой, гаворачы словамі В. І. Леніна, «самы закасцянелы інструмент падтрымання старога ладу, найбольш ацвярдзеўшы аплот буржуазнай дыктатуры, падтрымання панавання капітала, захавання і выхавання рабскай пакорлівасці і падпарадкавання яму працоўных» [1]).

Зусім іншыя мэты і задачы ставіць перад сваімі ўзброенымі сіламі соцыялістычная дзяржава. Упершыню ў гісторыі чалавецтва совецкі народ стварыў такую армію, якая абараняе інтарэсы не эксплаататараў, а працоўных.

Совецкая Армія, дзецішча Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, з моманту свайго ўзнікнення кроўна звязана з народам. З'яўляючыся ўзброенай часткай яго, яна служыць не для нападу на іншыя народы і краіны, не для заваявання чужых зямель. Яна створана для поўнага вызвалення рабочых і сялян, для абароны соцыялістычнай дзяржавы ад імперыялістычных драпежнікаў, для аховы мірнай стваральнай працы совецкага народа. Мы, гаварыў В. І. Ленін, абараняем не права грабіць чужыя народы, а мы абараняем сваю пролетарскую рэволюцыю і будзем яе абараняць да канца. Тую Расію, якая вызвалілася,

---

[1]) Ленін. Творы, том XXIII, стар. 378.

якая... выпакутавала сваю Совецкую Рэволюцыю, гэтую Расію мы будзем абараняць да апошняй кроплі крыві.

Ленін і Сталін стваралі Чырвоную Армію, як сапраўды народную армію, якая здольна верна служыць сваёй айчыне, да канца абараняць заваёвы вялікай рэволюцыі. Армія і народ у нашай краіне — адзіны. У гэтым адзінстве і згуртаванасці народа і арміі — вялікая сіла і магутнасць соцыялістычнай дзяржавы.

«Першая і асноўная асаблівасць нашай Чырвонай Арміі, — гаварыў таварыш Сталін, — заключаецца ў тым, што яна ёсць армія вызваленых рабочых і сялян, яна ёсць армія Кастрычніцкай рэволюцыі, армія дыктатуры пролетарыята. Усе да гэтага часу існаваўшыя арміі, які-б яны ні мелі састаў, з'яўляюцца арміямі ўмацавання ўлады капітала... У адрозненне ад такіх армій, наша Чырвоная Армія мае тую асаблівасць, што яна з'яўляецца сродкам умацавання ўлады рабочых і сялян, сродкам умацавання дыктатуры пролетарыята, сродкам вызвалення рабочых і сялян ад іга памешчыкаў і капіталістаў. Наша армія ёсць армія вызвалення працоўных...

Другая асаблівасць нашай Чырвонай Арміі заключаецца ў тым, што яна, наша армія, з'яўляецца арміяй брацтва паміж народамі нашай краіны...

Нарэшце, трэцяя асаблівасць Чырвонай Арміі. Заключаецца яна ў духу інтэрнацыяналізма, у пачуццях інтэрнацыяналізма, якія пранікаюць усю нашу Чырвоную Армію...»[1]).

З самых першых дзён свайго ўзнікнення Совецкая Армія выхоўвасцца ў духу павагі да свабодалюбівых народаў іншых краін, да іх дзяржаўнай самастойнасці і незалежнасці.

Совецкая Армія з'яўляецца арміяй соцыялістычнай дзяржавы рабочых і сялян. Гэта — адзіная ў свеце сапраўды народная армія, плоць ад плоці, кроў ад крыві свайго народа. Карэннае яе адрозненне ад ўсіх другіх армій заключаецца ў тым, што яна ўзнікла, выступала і дзейнічала як армія пераважнай большасці народа, як вызваліцельніца, барацьбіт за справядлівую справу, як вартавы міру, свабоды, дэмакратыі і незалежнасці народаў.

Рэволюцыя стварыла новую армію як магутную зброю вызвалення працоўных ад іга памешчыкаў і капіталістаў, імпе-

---

[1]) **І. Сталін.** Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі.

рыялістаў іншых краін, як аплот совецкай улады — улады рабочых і сялян. У першы раз у свеце, гаварыў Ленін, створана армія, узброеная сіла, якая ведае, за што яна ваюе, і ў першы раз у свеце рабочыя і сяляне, якія прыносяць неймаверна цяжкія афяры, ясна ўсведамляюць, што яны абараняюць Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку.

У буржуазных краінах працоўныя баяцца «сваіх» армій. Зусім інакш адносіцца да сваёй арміі наш народ. «Цяпер, — гаварылі ў гады грамадзянскай вайны, — не трэба баяцца чалавека з ружжом, таму што ён абараняе працоўных і будзе бязлітасны ў падаўленні панавання эксплаататараў»[1]). Адсюль — тая любоў і павага, якую праяўляюць да нашай арміі совецкія людзі. Ужо з першых дзён свайго існавання Совецкая Армія карысталася бязмежным давер'ем і падтрыманнем усіх працоўных краіны. Совецкі воін — будзь то салдат ці афіцэр — жаданы і любімы госць як на фабрыках і заводах, так і ў калгасах і соўгасах. Радасным святам становіцца і для совецкіх воінаў кожны прыезд дэлегацый рабочых і калгаснікаў, прадстаўнікоў інтэлігенцыі ў воінскую часць. Нідзе ў свеце, ні ў адной іншай краіне воіны не акружаны такімі клопатамі і ўвагай народа, як у нашай краіне. У нас паміж самім народам і совецкімі ўзброенымі сіламі ўстанавілася і існуе поўнае адзінства. Уступаючы ў рады Совецкай Арміі, грамадзянін СССР ясна ўсведамляе, што ён ідзе служыць інтарэсам Радзімы, свайму народу. Воінская служба ў радах Совецкай Арміі з'яўляецца любімай справай, пачэсным абавязкам грамадзяніна Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік.

Буржуазныя арміі імперыялістычных дзяржаў выхоўваюцца ў духу пагарды і нянавісці да іншых народаў, у духу расавай перавагі пануючай нацыі. Салдат шляхам ашуканства вучаць пакараць і занявольваць іншыя народы. Нічога падобнага няма ў нашай Совецкай Арміі. З першых-жа дзён яе існавання совецкія воіны выхоўваюцца ў духу павагі да правоў і незалежнасці ўсіх народаў, якія насяляюць нашу краіну. Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, якая знішчыла нацыянальны гнёт, ажыццявіла роўнасць усіх народаў СССР, якія любяць сваю Радзіму і аддаюць усе сілы на яе ўмацаванне і абарону ад ворагаў. З'яўляючыся многанацыянальнай па свайму складу, Совецкая Армія вызначаецца небывалай унутранай згуртаванасцю і сілай. У барацьбе з во-

[1])І. Сталін. Аб трох асаблівасцях Чырвонай Арміі.

рагамі айчыны яна заўсёды знаходзіць беззаветнае падтрыманне ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза.

У прыродзе Совецкай Арміі знайшлі сваё адлюстраванне ўсе асаблівасці і перавагі, якія мае совецкі грамадскі і дзяржаўны лад перад несовецкім ладам. Маральна-палітычнае адзінства соцыялістычнага грамадства, вялікая і непарушная дружба народаў Совецкага Саюза, высокі совецкі патрыятызм нашых людзей — усё гэта ўвасобілася ў кадрах нашых совецкіх узброеных сіл.

У нашай многанацыянальнай дзяржаве за гады сталінскіх пяцігодак быў дасягнут небывалы рост народнай гаспадаркі раней адсталых народаў краіны. Велізарны ўздым эканомікі і культуры нацыянальных рэспублік прывёў да ліквідацыі існаваўшай раней няроўнасці паміж нацыямі СССР. Усе нацыі і народнасці роўнапраўныя. Совецкая Армія па свайму саставу таксама з'яўляецца многанацыянальнай арміяй, у якой прадстаўлены ўсе нацыі і народнасці, уваходзячыя ў склад вялікага Совецкага Саюза.

Вялікая, непарушная дружба нашых народаў, іх высокі совецкі патрыятызм, іх маральна-палітычнае адзінства і згуртаванасць вакол партыі Леніна — Сталіна — аснова сілы і трываласці совецкага ладу, надзейная крыніца магутнасці і абароназдольнасці Совецкага Саюза. З'яўляючыся арміяй брацтва і дружбы народа, выхаваная большэвіцкай партыяй у духу совецкага патрыятызма, Совецкая Армія паказала ў бітвах вайны сваю згуртаванасць і маналітнасць. Яна вытрымала ўсе цяжкасці і выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны і яшчэ больш загартавалася ў агульнай барацьбе ўсіх совецкіх людзей супроць фашысцкіх захопнікаў.

Айчынная вайна паказала ўсяму свету, што Совецкая Армія з'яўляецца самай патрыятычнай арміяй у свеце. Сутнасць совецкага патрыятызма — у беззаветнай любві да сваёй Радзімы, свабоднай ад капіталістычнага рабства. Совецкі патрыятызм выражае маральна-палітычнае адзінства рабочых, сялян, інтэлігенцыі. У іх адзіныя інтарэсы — клопаты аб магутнасці і працвітанні совецкай дзяржавы. Яшчэ 6 лістапада 1920 года В. І. Ленін, выступаючы на ўрачыстым паседжанні Моссовета з поваду трэцяй гадавіны совецкай улады, гаварыў, што галоўная прычына нашых перамог, галоўная крыніца іх,—

гэта гераізм, самаафяраванне, небывалая вытрымка рабочых і сялян, якія змагаюцца за сваю соцыялістычную айчыну.

«Сіла совецкага патрыятызма,—вучыць таварыш Сталін,—заключаецца ў тым, што ён мае сваёй асновай не расавыя або нацыяналістычныя забабоны, а глыбокую адданасць і вернасць народа сваёй Совецкай Радзіме, брацкае садружаства працоўных усіх нацый нашай краіны. У совецкім патрыятызме гарманічна спалучаюцца нацыянальныя традыцыі народаў і агульныя жыццёвыя інтарэсы ўсіх працоўных Совецкага Саюза. Совецкі патрыятызм не раз'ядноўвае, а, наадварот, згуртоўвае ўсе нацыі і народнасці нашай краіны ў адзіную брацкую сям'ю» [1]). У аснове совецкага патрыятызма ляжыць глыбокае разуменне перавагі нашага соцыялістычнага ладу перад капіталістычным ладам.

Совецкі воін ганарыцца веліччу і магутнасцю сваёй Радзімы, сілай соцыялістычнай дзяржавы. Але ў нашай совецкай дзяржавы няма і не можа быць захопніцкіх мэт. «У нас няма і не можа быць такіх мэт вайны,—указвае таварыш Сталін,—як захоп чужых тэрыторый, пакарэнне чужых народаў, усёроўна, ці ідзе гутарка аб народах і тэрыторыях Еўропы, ці аб народах і тэрыторыях Азіі...» [2]). Совецкая Армія ніколі не падымала сваёй зброі да заняволення другіх народаў. Наша армія не вяла і не вядзе несправядлівых, захопніцкіх войн. Тыя войны, якія яна вымушана была весці, абараняючы сваю Айчыну, яе дзяржаўныя інтарэсы, былі вызваленчымі, справядлівымі войнамі. Совецкія войскі не прызначаны для захопу чужых тэрыторый і заняволення іншых народаў. У гэтым адно з адрозненняў нашай арміі ад армій буржуазных дзяржаў. Совецкая Армія выхавана ў духу нацыянальнага роўнапраўя і павагі да правоў іншых народаў. Усе войны, якія вяліся ёю, былі справядлівымі, накіраванымі на абарону дзяржаўных інтарэсаў нашай краіны і свабодалюбівых народаў іншых краін.

Гэтыя важнейшыя асаблівасці Совецкай Арміі, замацаваныя і развітыя большэвіцкай партыяй, карэнным чынам адрозніваючыя яе ад буржуазных армій, даюць нашай арміі такія перавагі, якіх не маюць і не могуць мець арміі буржуазных краін. Яны, гэтыя асаблівасці, вынікаюць з самога характару совецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу і з'яўляюцца крыніцай непераможнай сілы і магутнасці совецкіх узброеных сіл, крыніцай іх слаўных перамог. Айчынная вайна, якая закончы-

[1]) **І. Сталін.** Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 130.
[2]) Там-жа, стар. 25.

лася нашай поўнай перамогай, ярка паказала, што воіны нашай арміі, авіяцыі і флота ўладаюць выключна высокімі маральна-баявымі якасцямі. «Разбіць ворагаў у такой вайне, як другая сусветная вайна, якой не было яшчэ ў гісторыі чалавецтва, гэта значыць дабіцца сусветна-гістарычнай перамогі» [1]), — указваў таварыш Сталін. Совецкая Армія — ёсць армія соцыялістычнай дзяржавы, новая армія, сапраўды народная як па свайму духу, так і па прызначэнню — у гэтым тлумачэнне яе высокага маральнага духу і сілы. Яна ўладае найбольш высокім маральным духам яшчэ і таму, што яе асабісты склад выхоўвала і выхоўвае большэвіцкая партыя, партыя Леніна — Сталіна.

Вялікія правадыры працоўных Ленін і Сталін, наша партыя заўсёды надавалі палітычнаму выхаванню совецкіх воінаў выключна вялікае значэнне. Як толькі пачалося будаўніцтва Совецкай Арміі, яшчэ ў перыяд грамадзянскай вайны, таварыш Сталін патрабаваў, каб войскі ў тылу і на фронце выхоўваліся ў рэволюцыйным духу, у духу бязмежнай любві і адданасці сваёй Радзіме, воінскаму абавязку, свайму народу.

Палітычнай асветай нашых воінаў у гады грамадзянскай вайны, побач з В. І. Леніным і І. В. Сталіным, займаліся выдатныя дзеячы партыі і дзяржавы таварышы Молатаў, Калінін, Свердлоў, Каганавіч, Орджанікідзе, Кіраў, Куйбышэў, Мікаян, Жданаў, Андрэеў, Дзержынскі, Хрушчоў, Швернік, Шкіратаў і другія. Наша партыя выхавала такіх таленавітых пролетарскіх палкаводцаў, як Фрунзе, Варашылаў, Будзённы і другія. Цэлая плеяда сталінскіх палкаводцаў выросла ў радах Совецкай Арміі ў перыяд Айчыннай вайны.

Для вядзення палітыка-выхаваўчай работы ў войсках нашай арміі быў створан і ўмацован партыйна-палітычны апарат. Армія з'явілася той школай, дзе, як гаворыць таварыш Сталін, людзі розных губерняў і абласцей, сходзячыся, вучацца і прывучаюцца да палітычнага жыцця. У ёй совецкія воіны вучацца разумець задачы, што стаяць перад нашай дзяржавай, набываюць большэвіцкую пільнасць, высокую арганізаванасць, выдатную дысцыплінаванасць. Большэвіцкая партыя і совецкі ўрад робяць усё, каб воіны нашай краіны — пачынаючы ад радавога і канчаючы генералам — былі палітычна пісьменнымі, культурнымі, высокаідэйнымі людзьмі.

У гады мірнага соцыялістычнага будаўніцтва наша пар-

[1]) **І. Сталін.** Прамова на перадвыбарчым сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі г. Масквы 9 лютага 1946 г., стар. 7.

тыя не толькі не аслабляла сваёй работы па выхаванню Совецкай Арміі, а ўсяляк яе ўзмацняла. Для гэтага была створана ў свой час Ваенна-палітычная акадэмія імені Леніна, расшыралася сетка ваенна-палітычных вучылішч і розных курсаў па падрыхтоўцы кадраў палітработнікаў для нашай арміі. Работа партыі большэвікоў па выхаванню воінаў прынесла выдатныя вынікі. Воіны нашай арміі няспынна раслі ў ідэйна-палітычных адносінах. Яны разумелі задачы, якія стаяць перад совецкай дзяржавай, разумелі палітыку партыі і дзяржавы; яны разбіраліся ў пытаннях міжнародных адносін, ведалі аб інтрыгах імперыялістычнай буржуазіі, якая рыхтавала сусветную вайну.

Ва ўсіх арміях буржуазных краін салдаты пазбаўлены палітычных правоў і ўцягваюцца ў палітычную барацьбу толькі ў якасці сродку падаўлення працоўных. Зусім іншае становішча ў Совецкай Арміі. Яе перавага, як арміі новага тыпу, заключаецца ў тым, што яна мае высокі маральны і непахісны баявы дух, жалезную воінскую дысцыпліну. Гэтая дысцыпліна, парадак і арганізаванасць грунтуюцца на высокай палітычнай свядомасці, на разуменні абавязкаў кожнага байца і камандзіра. У загадзе таварыша Сталіна ад 23 лютага 1947 года сказана: «Важнейшай умовай боездольнасці нашых узброеных сіл з'яўляецца цвёрдая воінская дысцыпліна, аснаваная перш за ўсё на высокай свядомасці і палітычным выхаванні ваеннаслужачых». Гэтую высокую палітычную свядомасць, глыбокае разуменне свайго абавязку перад Радзімай, усведамленне сваёй высокароднай і пачэснай мэты — абароны соцыялістычнай айчыны, строгую воінскую дысцыпліну прынеслі з сабой і прывіваюць у арміі комуністы, армейскія большэвікі, якія выхоўваюць і цэментуюць совецкія войскі. «Мы, — гаварыў Ленін у 1919 годзе, — стварылі моцны фундамент Чырвонай Арміі... Мы стварылі гэты фундамент работай па-новаму, палітычнай прапагандай на фронце, арганізацыяй комуністаў у нашай арміі» [1]). Партыйна-палітычная работа сярод совецкіх воінаў, як указваў палкаводзец М. В. Фрунзе, з'яўляецца новым, дадатковым родам зброі, страшным для ўсякага з нашых ворагаў.

Калі разразілася Айчынная вайна, увесь свет змог пераканацца ў маральна-палітычнай перавазе Совецкай Арміі над войскамі гітлераўскага імперыялізма і яго саюзнікаў. Совецкія байцы і камандзіры былі глыбока перакананы ў праваце

[1]) **Ленін.** Творы, том XXIII, стар. 503.

сваёй справы, ведалі і разумелі высокароднасць вялікіх вызваленчых задач нашай дзяржавы і яе арміі. Адзначаючы гэтыя якасці совецкіх воінаў, таварыш Сталін гаварыў 6 лістапада 1941 года: «Маральны стан нашай арміі вышэй, чым нямецкай, бо яна абараняе сваю Радзіму ад чужаземных захопнікаў і верыць у справядлівасць сваёй справы, тады як нямецкая армія вядзе захопніцкую вайну і грабіць чужую краіну, не маючы магчымасці паверыць хоць-бы на хвіліну ў справядлівасць сваёй гнуснай справы» [1]).

Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя, скінуўшая ўладу памешчыкаў і капіталістаў, вызваліла ад прыгнечання і ланцугоў капіталістычнага рабства ўсе народы былой царскай Расіі. Рэволюцыя адкрыла для іх «шлях да комунізма, шлях да свабоднага, шчаслівага жыцця» *(Молатаў)*. Яна стварыла спрыяльныя ўмовы для росту эканомікі, палітычнага ўздыму і культурнага развіцця ўсіх народаў нашай краіны; былі абвешчаны вялікія прынцыпы палітычнага і дзяржаўнага ўстройства краіны: поўная роўнасць і суверэннасць народаў; права на свабоднае самавызначэнне, аж да аддзялення і ўтварэння самастойнай дзяржавы; адмена ўсіх і ўсякіх нацыянальных пераваг і абмежаванняў; свабоднае развіццё нацыянальных меншасцей і груп, насяляючых тэрыторыю Расіі. Народы нашай краіны стварылі свае совецкія рэспублікі на аснове поўнай дабравольнасці і палітычнай роўнасці.

★

[1]) **І. Сталін.** Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 16.

## СОВЕЦКАЯ АРМІЯ — НАДЗЕЙНАЯ АБАРОНА СОВЕЦКАЙ ДЗЯРЖАВЫ

Партыя Леніна — Сталіна, совецкі ўрад з моманту ўзнікнення совецкай дзяржавы, паслядоўна і цвёрда змагаліся за ўстанаўленне міру паміж народамі.

У пачатку 1918 года над совецкай дзяржавай навісла сур'ёзнейшая пагроза: дзесяткі дывізій нямецкага імперыялізма рушылі на маладую рэспубліку. Вораг імкнуўся звергнуць і знішчыць совецкую ўладу, ператварыць нашу Радзіму ў сваю калонію, а наш народ — у сваіх рабоў. Але іх напад на маладую совецкую рэспубліку з'явіўся толькі пачаткам барацьбы. У першай палавіне 1918 года супроць нашай дзяржавы аб'ядналіся імперыялісты Антанты і буржуазна-памешчыцкая белагвардзейшчына ўнутры краіны.

Імперыялістычныя разбойнікі 14 дзяржаў на чале з Англіяй, Францыяй, ЗША і Японіяй выступілі і рушылі супроць нашай слаўнай Радзімы. Пачалася цяжкая, працяглая і крывапралітная грамадзянская вайна. Нападаючы на Совецкую Расію, імперыялістычныя драпежнікі мелі на мэце знішчэнне совецкай улады, аднаўленне ўлады цара, памешчыкаў і капіталістаў, а таксама захоп Украіны, Беларусі, Закаўказзя, Далёкага Усхода і іншых тэрыторый Совецкай рэспублікі. Гэтую інтэрвенцыю ўзначаліў яры вораг совецкага народа, цяперашні падпальшчык вайны супроць Совецкага Саюза і краін народнай дэмакратыі Чэрчыль. Полчышчы добра ўзброеных інтэрвентаў-захопнікаў грабілі нашу зямлю, залівалі яе патокамі крыві, усюды сеялі смерць і разарэнне.

Імперыялістычныя разбойнікі акружылі совецкую дзяржаву жалезным кальцом франтоў. Тры чвэрткі тэрыторыі

краіны ў 1918 годзе былі ў руках чужаземных інтэрвентаў. Такія важныя раёны краіны, як Украіна, Каўказ, Сярэдняя Азія, Урал, Сібір, Далёкі Усход і іншыя, знаходзіліся пад акупацыяй, былі часова страчаны намі. «У нас, — гаварыў таварыш Сталін 7 лістапада 1941 года, успамінаючы перыяд грамадзянскай вайны, — не было саюзнікаў, у нас не было Чырвонай Арміі — мы яе толькі пачалі ствараць, — нехапала хлеба, нехапала ўзбраення, нехапала абмундзіравання. 14 дзяржаў насядалі тады на нашу краіну. Але мы не ўнывалі, не падалі духам. У агні вайны арганізавалі тады мы Чырвоную Армію і ператварылі нашу краіну ў ваенны лагер. Дух вялікага Леніна натхняў нас тады на вайну супроць інтэрвентаў».

Замежныя інтэрвенты, якія дзейнічалі ў совецкай краіне і распраўляліся з рабочымі і сялянамі, мелі саюзнікаў у асобе нацыянальнай буржуазіі. Капіталісты і памешчыкі Украіны, Беларусі, Закаўказзя і такія іх палітычныя арганізацыі, як пятлюраўцы на Украіне, буржуазныя нацыяналісты ў Беларусі, нацыянал-меншавікі ў Грузіі і т. д.—усе яны дапамагалі імперыялістам-захопнікам расчляніць нашу краіну, ператварыць яе ў прыдатак імперыялістычных дзяржаў. Апіраючыся на сілу іншаземных захопнікаў — нямецкіх, англійскіх, французскіх, турэцкіх, амерыканскіх і японскіх войск — капіталісты і памешчыкі ў гады інтэрвенцыі люта падавілі рэволюцыйны рух працоўных і зноў захапілі ўладу ў свае рукі на Украіне, у Беларусі, Азербайджане, Грузіі, Арменіі, Сярэдняй Азіі і на Далёкім Усходзе. Буржуазна-памешчыцкая белагвардзейшчына, пры дапамозе інтэрвентаў, стварыла так званыя «самастойныя», а фактычна рабска падначаленыя імперыялістычным дзяржавам краіны. Прыслужнікі імперыялістаў і здраднікі, якія распальвалі рознь сярод народаў нашай краіны і нянавісць да рускага народа — вось хто стаяў на чале новастворaных «дзяржаў».

Ішла справядлівая айчынная вайна 1918—1921 гг., у якой Совецкая Армія дапамагла ўсім брацкім народам Совецкай Расіі адстаяць свабоду і незалежнасць у барацьбе з ворагамі айчыны. Наша армія дапамагла ўсім народам, насяляўшым тэрыторыю былой Расійскай імперыі, перамагчы, разбіць буржуазных нацыяналістаў, здраднікаў, агентаў іншаземнага капітала. Дзякуючы Совецкай Арміі народы нашай краіны вышлі на шырокую дарогу развіцця сваёй дзяржаўнасці, на той слаўны шлях, які быў абвешчан вялікімі правадырамі большэвіцкай партыі і совецкага народа — Леніным і Сталіным.

Совецкая Армія граміла і знішчала шматлікія войскі інтэр-



ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ИСТОРИЧЕСКИЙ МУЗЕЙ БИБЛИОТЕКА

вентаў і буржуазна-памешчыцкай белагвардзейшчыны, выганяла ворага з совецкай зямлі. У жорсткіх бітвах з нямецкім імперыялізмам і польскімі панамі яна вызваліла ў гады грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі тэрыторыю Украіны і Беларусі.

Беларускі народ, які прайшоў скрозь жахі першай сусветнай вайны, спачатку трапіў пад ярмо нямецкіх захопнікаў, а затым белапольскіх акупантаў і англа-франка-амерыканскіх імперыялістаў.

Большэвіцкія партыйныя арганізацыі Беларусі ўзнялі народ на партызанскую барацьбу супроць яго спрадвечных ворагаў. Пры дапамозе партызан войскі Чырвонай Арміі разбілі восенню 1918 года нямецкіх захопнікаў у Беларусі. Ужо 10 снежня таго-ж года яны вызвалілі ад ворага сталіцу Беларусі—Мінск, а 14 студзеня 1919 года выгналі яго з Гомеля. Кіруемыя большэвіцкай партыяй, лепшыя сыны свабодалюбівага беларускага народа мужна і самаадданa змагаліся ў радах Совецкай Арміі супроць шматлікіх ворагаў Радзімы на ўсіх франтах.

З дапамогаю Антанты Польшча на працягу зімы 1919 — 1920 гг. упорна рыхтавалася да выканання авантурыстычнага плана: стварэння вялікай польскай дзяржавы, якая-б прасціралася «ад мора і да мора», г. зн. ад Данцыга да Одэсы. Пілсудскі прадставіў Антанце план вайны з Расіяй.

Імперыялісты, маскіруючыся для пачатку і прыкрываючыся лозунгам «неўмяшання» ў польска-рускія адносіны, сцягвалі на тэрыторыю Польшчы добра абучаныя войскі, узбройвалі іх і затым вясной 1919 года накіравалі супроць совецкай дзяржавы. Адзін толькі ўрад Францыі, напрыклад, даў польскай арміі больш 1500 гармат, 350 самалётаў, каля 3 000 кулямётаў, больш 300 тыс. вінтовак, 10 млн. снарадаў і шмат іншых боепрыпасаў і снаражэння. У красавіку Пілсудскі даў сакрэтную дырэктыву аб падрыхтоўцы да выступлення. Нашы часці вымушаны былі адыходзіць. 7 мая вораг быў ужо ў Кіеве. У тылу нашых армій пачаў дзейнічаць Врангель. «...Врангелеўскі фронт,—пісаў таварыш Сталін, — з'яўляецца працягам польскага фронта з той, аднак, розніцай, што Врангель дзейнічае ў тылу нашых войск, якія вядуць барацьбу з палякамі, г. зн. у самым небяспечным для нас пункце» [1]).

Захоп Беларусі белапалякамі суправаджаўся нябачанымі пагромамі, тэрорам і зверствамі інтэрвентаў. Люты тэрор польскіх паноў і контррэволюцыйных нацыяналістаў пераўзышоў

[1]) І. Сталін. Артыкулы і прамовы аб Украіне, стар. 105.

усё, што ведала дагэтуль гісторыя. Колькасць загінуўшых ад рук інтэрвентаў беларусаў толькі па трох паветах (Барысаўскаму, Бабруйскаму і Ігуменскаму) склала 100 540 чалавек. Адных толькі дзяцей было замучана, пакалечана і засталося сіротамі па гэтых паветах каля 24500. Акупанты расстрэльвалі рабочых і сялян па малейшаму падазрэнню ў спачуванні большэвізму. Бясконцыя здзекі, агрэбленні, небывалыя разарэнні, расстрэлы, турмы і канцэнтрацыйныя лагеры,—такі быў лёс беларускага народа ў тыя суровыя гады. За час акупацыі інтэрвенты разбурылі і разарылі ўсе культурныя ачагі, створаныя самаадданай працай беларускага народа.

Ворагі беларускага народа—буржуазныя нацыяналісты—з'явіліся самымі стараннымі пасобнікамі іншаземных інтэрвентаў ва ўстанаўленні буржуазна-памешчыцкага рабства ў Беларусі. На сродкі імперыялістаў-захопнікаў яны ўзмоцнена фарміравалі так званае беларускае войска, у якое ўключаліся банды з рэакцыйнай часткі старога афіцэрства, сынкоў памешчыкаў і кулакоў. Пры дапамозе прадажных нацыяналістаў акупанты ажыццявілі палітычнае, нацыянальнае і эканамічнае закабаленне працоўных. У Беларусь разам з войскамі інтэрвентаў вярнуліся памешчыкі і капіталісты. У былых маёнтках уводзіліся старыя, дарэволюцыйныя парадкі. Рабочыя і сяляне былі даведзены да поўнага жабрацтва, нярэдка ў іх адбіралі ўвесь ураджай і жывёлу для памешчыка і прымушалі іх аднаўляць знішчаныя рэволюцыяй памешчыцкія маёнткі. Працоўны дзень на прадпрыемствах дасягаў 11 —13 гадзін, расло беспрацоўе. Тысячы рабочых і іх сем'яў выміралі ад знясільваючай працы і голаду. Так каля года гаспадарылі інтэрвенты на акупіраванай імі тэрыторыі.

На дапамогу беларускаму народу прышла Совецкая Армія. Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі прыняў неадкладныя меры па абароне Совецкай Беларусі, умацаванню заходняга фронта. Па прапанове таварыша Сталіна, членам Рэўваенсовета 16-й арміі быў назначан Серго Орджанікідзе. Сюды-ж быў камандыраван М. І. Калінін, які пабываў ва многіх гарадах і сельскіх раёнах Беларусі, наведаў воінскія часці. М. І. Калінін заклікаў працоўных і нашых воінаў да актыўнай абароны і разгрому ворага.

Прыезд таварыша Сталіна летам 1919 года для арганізацыі воінскіх сіл заходняга фронта і абароны Совецкай Беларусі па заданню Леніна, Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі, выклікаў велізарны палітычны ўздым сярод працоўных Беларусі. Таварыш Сталін жалезнай рукой навёў парадак у воінскіх

часцях фронта і натхніў беларускі народ на барацьбу супроць іншакраінных інтэрвентаў і ўнутранай контррэволюцыі. Сілы народа і арміі, скаваныя ворагамі совецкай улады, прабудзіліся, прышлі ў рух. Дзякуючы палітычнаму і стратэгічнаму кіраўніцтву таварыша Сталіна была разгромлена ўнутраная контррэволюцыя, умацован і стабілізован фронт. Прасоўванне войск ворага ў глыб нашай Радзімы спыніла магутная абарона, створаная таварышом Сталіным удоўж ракі Беразіны.

Рускі народ накіраваў сваіх лепшых сыноў на дапамогу беларускаму народу. Многія тысячы комуністаў і комсамольцаў прыбывалі на польскі фронт з Петраграда, Масквы, Ніжняга Ноўгарада, Калугі, Тверы і іншых совецкіх гарадоў. У самой Беларусі было праведзена некалькі мабілізацый комуністаў і комсамольцаў у дапамогу фронту, Чырвонай Арміі. Буйнейшыя прамысловыя цэнтры рэспублікі паслалі ў армію не менш 50% комуністаў і комсамольцаў. Тысячамі ішлі ў армію і ў партызаны рабочыя і сяляне.

Разгарнулася жорсткая барацьба беларускага народа супроць белапольскіх інтэрвентаў і на акупіраванай імі тэрыторыі.

Люты тэрор і дзікія расправы іншаземных заваявальнікаў не маглі зламаць волі свабодалюбівага беларускага народа да барацьбы за свабоду і незалежнасць сваёй Радзімы. Гаворачы аб гэтай самаадданай барацьбе, таварыш Сталін адзначаў: «Што датычыць настрою беларускіх сялян за франтавой паласой, то, па нашых вестках, там праходзяць паўстанні, працуюць партызанскія атрады, якія разбураюць тыл праціўніка, спальваючы склады і знішчаючы памешчыкаў» [1]).

Пад кіраўніцтвам большэвіцкіх партыйных арганізацый шырыліся масавыя забастоўкі на прадпрыемствах, перарастаўшыя ва ўзброеныя паўстанні рабочых; раслі партызанскія атрады, якія вялі непрымірымую барацьбу супроць акупацыйных войск у тылу ў ворага. Беларускія партызаны разбуралі камунікацыі, знішчалі варожыя гарнізоны, праводзілі дыверсіі і пускалі пад адкос эшалоны з жывой сілай і тэхнікай ворага.

Калі на паўднёвым фронце стварылася вельмі цяжкае становішча, калі дзянікінскія полчышчы прасоўваліся ў глыб нашай краіны, пагражаючы Маскве, ЦК партыі і Совецкі ўрад адклікалі таварыша Сталіна і Серго Орджанікідзе з заходняга фронта і накіравалі іх на паўднёвы фронт. Пад кіраў-

[1]) І. Сталін. Творы, том 4, стар. 343.

ніцтвам таварыша Сталіна тут была забяспечана моцная абарона, а затым і разгром ворага.

Калі інтэрвенты і белагвардзейцы былі разбіты на поўдні, усходзе і поўначы, вялікія правадыры працоўных — Ленін і Сталін, наша партыя зноў накіроўваюць усе намаганні народа і арміі на заходні фронт, на вызваленне Украіны і Беларусі. Як і на іншых рашаючых франтах, тут арганізацыю і кіраўніцтва баявымі аперацыямі Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі даручае таварышу Сталіну — палкаводцу, арганізатару вялікіх перамог над войскамі Юдзеніча, Калчака і Дзянікіна. З прыбыццём таварыша Сталіна становішча на заходнім фронце карэнным чынам змянілася.

Кіруемыя таварышом Сталіным, доблесныя часці Чырвонай Арміі выгналі іншаземных інтэрвентаў з Беларусі. Рабочыя і сяляне Беларусі аднавілі совецкую ўладу. У сваім артыкуле «Новы паход Антанты на Расію» таварыш Сталін пісаў:

«... Ні адзін з прылягаючых да Польшчы раёнаў не можа быць прызнан для польскіх войск спрыяльным ні ў сэнсе раёна ўдару, ні ў сэнсе далейшага развіцця гэтага ўдару: куды-б ні рушылі ўперад польскія войскі, яны ўсюды будуць сустракаць процідзеянне з боку украінскага, рускага, беларускага мужыка, які чакае вызвалення ад польскіх памешчыкаў з боку совецкіх войск.

І, наадварот, становішча совецкіх войск у гэтых адносінах зусім спрыяючае: для іх усе раёны, так сказаць, «падыходзяць», бо совецкія войскі, рухаючыся ўперад, не ўмацоўваюць, а звяргаюць уладу польскіх паноў, вызваляюць сялян ад кабалы» [1]).

Распрацаваны таварышам Сталіным стратэгічны план разгрому інтэрвентаў і белагвардзейцаў на захадзе быў бліскуча ажыццёўлен Чырвонай Арміяй. Пры дапамозе беларускіх і украінскіх партызан яна сакрушыла і разбіла летам 1920 г. войскі іншаземных інтэрвентаў, Совецкая Беларусь і Совецкая Украіна былі вызвалены ад ворага. Бліскуча праведзеныя аперацыі Чырвонай Арміі прымусілі войскі інтэрвентаў ужо 7 ліпеня 1920 г. пачаць агульнае адступленне па ўсяму фронту. У наступны дзень нашы войскі занялі горад Барысаў, а 11 ліпеня—сталіцу Беларусі горад Мінск. Праследуючы і разбіваючы захопнікаў, Совецкая Армія 1 жніўня заняла горад Брэст, а ў сярэдзіне жніўня паспяхова вяла баі на подступах да Варшавы.

---

[1]) І. Сталін. Артыкулы і прамовы аб Украіне, стар. 95.

Як і на іншых франтах грамадзянскай вайны, на захадзе Чырвонай Арміяй быў заваяваны мір: 20 кастрычніка 1920 года адбылося падпісанне (у Рызе) мірнага дагавора Совецкай Расіі з Польшчай. Карыстаючыся выключна цяжкім становішчам маладой совецкай рэспублікі, імперыялісты англа-франка-амерыканскай кааліцыі і іх подлы слуга Пілсудскі захапілі заходнія землі Совецкай Беларусі і Совецкай Украіны.

У пачатку грамадзянскай вайны капіталісты і памешчыкі Азербайджана, Грузіі і Арменіі, апіраючыся на сілы нямецкіх, англійскіх і турэцкіх войск, жорстка падавілі рэволюцыйны рух рабочых і сялян, захапілі ўладу ў свае рукі і ўстанавілі капіталістычнае рабства.

Замежныя імперыялісты імкнуліся адарваць народы Закаўказзя ад працоўных Расіі, заняволіць іх і авалодаць іх багаццямі. Разам з тым, інтэрвенты прабавалі заняць і зрабіць на Каўказе зручныя пазіцыі для барацьбы з маладой совецкай рэспублікай. Аднак рабочыя і сяляне Закаўказзя, верныя ідэям Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі, не хацелі мірыцца з такім становішчам і павялі жорсткую і непрымірымую барацьбу супроць гвалтоўных антынародных рэжымаў, устанаўляемых прадажнымі буржуазнымі ўрадамі. Разумеючы, што толькі ў саюзе з вялікім рускім народам і пры яго брацкім падтрыманні яны могуць перамагчы ворага і дабіцца вызвалення ад сваіх эксплаататараў і прыгнятальнікаў, яны звярнуліся за дапамогай у Маскву. Па рашэнню Совецкага ўрада і большэвіцкай партыі совецкія войскі, узначальваемыя тт. Орджанікідзе, Кіравым і Мікаянам, дапамаглі рабочым і сялянам Азербайджана разбіць і выгнаць інтэрвентаў і буржуазных нацыяналістаў з сваёй зямлі. У красавіку 1920 года тут была адноўлена совецкая ўлада і створана совецкая рэспубліка.

У лістападзе 1920 года рабочыя і сяляне Арменіі, пры брацкай дапамозе рускіх рабочых, таксама зверглі і знішчылі ненавісных здраднікаў (дашнакаў), устанавілі совецкую ўладу і цвёрда сталі на шлях соцыялістычнага будаўніцтва.

У 1921 годзе Чырвоная Армія дапамагла і працоўным Грузіі звергнуць уладу ненавіснага буржуазнага ўрада меншавікоў і ўстанавіць на тэрыторыі ўсёй краіны родную совецкую ўладу.

Вялікую ролю адыграла Совецкая Армія ў барацьбе з інтэрвентамі і іх агентурай і ў Сярэдняй Азіі. Пад вадзіцельствам выдатнага палкаводца М. В. Фрунзе Совецкая Армія

разбіла і выгнала інтэрвентаў і басмачоў з Сярэдняй Азіі. Такім чынам, і для народаў гэтага краю нашай арміяй быў адкрыт шлях да новага свабоднага жыцця. Прыгнечаныя і заняволеныя царызмам і буржуазіяй узбекскі, кіргізскі, казахскі, туркменскі і таджыкскі народы прыступілі да стварэння сваёй дзяржаўнасці.

Дзякуючы доблесці і высокаму майстэрству совецкіх воінаў першы ваенны напад міжнароднага імперыялізма на нашу совецкую Радзіму закончыўся поўным крахам.

Совецкая Беларусь стваралася і мужнела ў барацьбе з нямецкімі акупантамі, белапольскімі панамі, беларускімі контррэволюцыйнымі нацыяналістамі, бундаўцамі і меншавікамі, эсэрамі і трацкісцка-бухарынскімі шпіёнамі-дыверсантамі.

Узначальваемы комуністычнай партыяй, пры велізарным падтрыманні рускага народа беларускі народ у барацьбе са шматлікімі ворагамі адстаяў сваю чэсць, свабоду і незалежнасць. Ён упершыню ў многавяковай гісторыі «стварыў сваю дзяржаўнасць і пайшоў па шляху, які адкрыла перад усімі народамі нашай краіны Вялікая Кастрычніцкая соцыялістычная рэволюцыя. Гісторыя барацьбы і будаўніцтва Беларусі неразрыўна звязана з імёнамі Леніна і Сталіна. Стваральнікі вялікай Совецкай дзяржавы стаялі ля калыбелі рэспублікі, якая ўваходзіць цяпер у склад магутнага Совецкага Саюза. Уся падрыхтоўчая работа па стварэнню Беларускай ССР вялася пад непасрэдным кіраўніцтвам таварыша Сталіна» [1]).

Пасля разгрому інтэрвентаў і пераможнага сканчэння грамадзянскай вайны маладыя совецкія рэспублікі прыступілі да ўтварэння адзінай совецкай дзяржавы. Такая дзяржава—Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік—была ўтворана ў снежні 1922 года. Сваёй беззаветнай, мужнай барацьбой за вызваленне ўсіх народаў, насяляючых Расію, Совецкая Армія забяспечыла стварэнне магутнай, непераможнай многанацыянальнай соцыялістычнай дзяржавы.

* * *

Совецкая Армія адстаяла свабоду і незалежнасць нашай Радзімы ў гады інтэрвенцыі і грамадзянскай вайны. З пераможным заканчэннем гэтай працяглай і жорсткай вайны совецкі народ прыступіў да мірнай стваральнай працы, да ажыццяўлення вялікага плана соцыялістычнай перабудовы сваёй краіны. Партыя большэвікоў паставіла перад краінай

[1]) «Слаўны юбілей Совецкай Беларусі». Перадавы артыкул газеты «Правда» ад 2 студзеня 1949 года.

велічныя задачы: трэба было залячыць тыя глыбокія раны, якія былі нанесены совецкай дзяржаве ў пачатку імперыялістычнай, а затым і грамадзянскай вайной. Краіна была страшэнна разбурана. Напрыклад, у 1920 годзе ўся прадукцыя сельскай гаспадаркі склала каля палавіны даваеннай, а прадукцыя буйнай прамысловасці была амаль у 7 разоў меншая, чым да першай сусветнай вайны. У краіне нехапала паліва; транспарт быў разбуран. Аднаўленне і далейшае развіццё народнай гаспадаркі прадстаўляла сабой вельмі цяжкую задачу для народа.

Але совецкія людзі, выхаваныя большэвіцкай партыяй і загартаваныя ў барацьбе з ворагамі, з велізарным натхненнем і небывалым энтузіязмам узяліся за будаўніцтва новага жыцця. Дзякуючы перавагам совецкай сістэмы гаспадаркі, наша краіна ў небывала кароткі тэрмін (у 5—6 гадоў) залячыла раны, нанесеныя ёй вайной, аднавіўшы сваю гаспадарку ў даваенных размерах. Аднак гэты ўзровень ніяк не мог задаволіць наш народ, які паставіў сабе мэтай пабудаваць соцыялістычнае грамадства.

Узяўшыся за справу мірнага будаўніцтва, партыя Леніна—Сталіна ведала, што пабедаюсны разгром інтэрвенцыі і заканчэнне грамадзянскай вайны не ліквідавалі небяспекі новай інтэрвенцыі, бо яе крыніца—капіталістычнае акружэнне—усё яшчэ прадаўжае існаваць. Наша партыя ведала, што новы нападзнешніх ворагаў з лагера міжнароднага імперыялізма паставіць нашу краіну перад яшчэ больш суровымі выпрабаваннямі, і для таго, каб гэтыя выпрабаванні вытрымаць, трэба зрабіць нашу Радзіму магутнай і моцнай дзяржавай у ваенных і эканамічных адносінах.

Гіганцкая работа па далейшаму развіццю ўсіх галін народнай гаспадаркі ажыццяўлялася ў нашай краіне на аснове сталінскіх пяцігодак. Таварыш Сталін распрацаваў план соцыялістычнай індустрыялізацыі краіны, ліквідацыі яе векавой эканамічнай адсталасці, ператварэння яе ў перадавую прамыслова-развітую дзяржаву. XIV з'езд партыі прыняў сталінскую праграму і аб'явіў соцыялістычную індустрыялізацыю асновай генеральнай лініі партыі большэвікоў. Разгарнулася гіганцкая будоўля. З года ў год наша краіна ішла ад перамогі да перамогі. Імперыялістычныя дзяржавы прыкладалі ўсе намаганні, каб сарваць творчую работу совецкага народа. Скарыстоўваючы ярых ворагаў народа—трацкістаў, бухарынцаў, зіноўеўцаў, буржуазных нацыяналістаў і іншых здраднікаў, іншаземная буржуазія арганізоўвала шкодніцтва ў прамысло-

васці, сельскай гаспадарцы, прабуючы павярнуць нашу краіну назад, на шлях капіталізма, ператварыць яе ў аграрна-сыравінны прыдатак імперыялістычных дзяржаў.

Партыя большэвікоў і Совецкая дзяржава разгромілі і сцёрлі з твару зямлі гэтых подлых рэстаўратараў капіталізма. Вялікая партыя большэвікоў, кіруемая таварышам Сталіным, адстаяла ад усіх ворагаў ленінскае вучэнне аб магчымасці пабудовы соцыялізма ў нашай краіне. Яна мабілізавала ўвесь народ на паспяховае правядзенне палітыкі індустрыялізацыі.

Нябачаны гераізм і самаадданасць праявілі будаўнікі первенцоў сталінскіх пяцігодак — Сталінградскага і Харкаўскага трактарных заводаў, Магнітагорскага і Кузнецкага металургічных камбінатаў, Маскоўскага і Горкаўскага аўтазаводаў і іншых новабудоўляў.

Па тэхніцы вытворчасці, тэмпах развіцця прамысловасці Совецкі Саюз перагнаў усе капіталістычныя краіны. Прамысловасць галоўных буржуазных краін перад другой сусветнай вайной перавышала ўзровень 1913 г. у сярэднім на 20—30%. Совецкая індустрыя выросла за гэты час у 11,7 раз. Гэтая розніца ў тэмпах дала магчымасць нашай краіне выйсці ужо к канцу другой пяцігодкі на першае месца ў Еўропе і на другое месца ў свеце па агульнаму аб'ёму прамысловай вытворчасці. Совецкі Саюз стаў магутнай індустрыяльнай дзяржавай. Машынабудаўніцтва за гады совецкай улады выросла ў 50 разоў, а прадукцыя цяжкай прамысловасці—у 15 разоў. У гады сталінскіх пяцігодак былі ў корані рэканструяваны такія галіны, як энергетыка, металургія, машынабудаўніцтва і іншыя, створан рад новых галін прамысловасці—станкабудаўнічая, аўтатрактарная, авіяцыйная, хімічная і інш. У 1940 годзе ў нашай краіне было выпушчана чыгуну амаль у 4 разы больш, сталі—у 4,5 раза больш, вугалю—у 5,5 раза больш, нафты—у 3,5 раза больш, чым у 1913 годзе. Адсталыя ў мінулым ускраіны царскай Расіі ператварыліся ў прамыслова-развітыя совецкія рэспублікі.

Хутка развівалася і наша сельская гаспадарка, якая ўжо ў 1940 годзе давала прадукцыі амаль у два разы больш, чым у 1913 годзе, таварнага зярна на 17 млн. тон больш. Вытворчасць бавоўны ў параўнанні з 1913 годам павялічылася к 1940 году ў 3,5 раза, цукровых буракоў і ільнавалакна амаль у 2 разы, а сланечніка—у 4,5 раза. У нашай краіне была створана буйнейшая ў свеце жывёлагадоўчая гаспадарка.

«Такі небывалы рост вытворчасці,—гаварыў таварыш Сталін, — нельга лічыць простым і звычайным развіццём кра-

іны ад адсталасці да прагрэса. Гэта быў скачок, пры дапамозе якога наша Радзіма ператварылася з адсталай краіны ў перадавую, з аграрнай—у індустрыяльную». Дзякуючы нястомным клопатам аб беларускім народзе нашай партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна ў мінулым адсталая ўскраіна царскай Расіі—Беларусь, ператварылася за гады совецкай улады ў адну з перадавых квітнеючых ордэнаносных совецкіх рэспублік.

У выніку першага перыяда будаўніцтва соцыялізма—ад Кастрычніка да пачатку Вялікай Айчыннай вайны—совецкая народная гаспадарка была перабудавана на соцыялістычнай аснове. У горадзе і вёсцы былі канчаткова выкарчаваны і ліквідаваны карэнні паразітычных класаў. Гэта стварыла трывалую базу маральна-палітычнага адзінства совецкага грамадства; умацаваўся совецкі патрыятызм і дружба народаў СССР. Знікла назаўсёды пачуцце ўзаемнага недавер'я паміж народамі; укаранілася глыбокая ўзаемапавага і брацкае садружаства народаў у іх барацьбе за далейшае ўмацаванне нашай Радзімы—СССР.

Разам з развіццём усёй краіны, якая ішла ў гады пяцігодак па шляху соцыялістычных пераўтварэнняў, раслі і мацнелі совецкія ўзброеныя сілы. Доблесная Чырвоная Армія, адстайваючы інтарэсы нашай дзяржавы, пільна стаіць на варце сухаземных і марскіх граніц совецкай дзяржавы. Аберагаючы мірную творчую працу совецкіх людзей, яна верна служыць сваёй Радзіме.

Сусветна-гістарычная перамога соцыялізма ў нашай краіне, стварэнне першакласнай ваеннай прамысловасці рэзка ўзнялі магутнасць нашай арміі, авіяцыі і флота. Совецкія ўзброеныя сілы хутка пераўзброіліся, аснашчаліся навейшай баявой тэхнікай. Год ад года яны атрымлівалі ўзбраенне ва ўсё большай колькасці і высокай якасці. Совецкая дзяржава і наша партыя рыхтавалі краіну да актыўнай абароны.

Дзякуючы росту ваеннай прамысловасці, паявіліся і развіваліся новыя роды войск у складзе нашай арміі—магутная авіяцыя і бронетанкавыя войскі. Разам з тым змянілі сваё аблічча такія старыя роды войск, як пяхота, артылерыя і кавалерыя. Намаганнямі ўсіх совецкіх людзей яны былі аснашчоны новай баявой тэхнікай, атрымалі самыя сучасныя агнявыя сродкі. Рос і Ваенна-Марскі флот: ён атрымаў сотні новых першакласных баявых караблёў.

У нашай краіне адбыліся найвялікшыя змяненні не толькі ў эканоміцы, але і ў свядомасці совецкіх людзей. Перамога

соцыялізма ўзбагаціла іх новымі грамадскімі і палітычнымі ідэямі. За гады совецкай улады паявілася цэлае пакаленне новых людзей, выхаваных новым ладам, нашай партыяй. Совецкі чалавек—чалавек новага, нябачанага раней, соцыялістычнага ладу. Партыя выхавала ў яго новыя маральныя якасці, прывіла яму новае духоўнае аблічча. Совецкі чалавек, якому не ўласціва пачуццё індывідуалізма, ставіць агульныя інтарэсы вышэй сваіх асабістых інтарэсаў. Ён бязмежна любіць сваю Радзіму-маці, свой совецкі народ. Радзіма для яго вышэй за ўсё.

За гады совецкай улады нязмерна выросла культура ўсіх народаў СССР, нацыянальная па форме, соцыялістычная па зместу. У нашай краіне адбылася культурная рэволюцыя. Совецкая культура расла і мацнела разам з ростам соцыялістычнай дзяржавы. Гэта дазволіла нам камплектаваць Совецкую Армію, Авіяцыю і Флот высокапісьменнай і палітычна развітай моладдзю. Расшырылася сетка ваенных акадэмій, ваенных вучылішчаў і школ, якія рыхтавалі шматлікія пісьменныя і кваліфікаваныя кадры совецкіх камандзіраў, да канца адданых большэвіцкай партыі, соцыялістычнай радзіме, совецкаму народу,—танкістаў, лётчыкаў, артылерыстаў, спецыялістаў усіх іншых родаў войск.

Краіна давала арміі не толькі першакласную тэхніку, але і высокаадукаваныя кадры, якія дасканала ведаюць гэтую тэхніку і здольны эфектыўна яе скарыстаць. Падрыхтоўцы гэтых кадраў таварыш Сталін удзяляў выключную ўвагу. На выпуску слухачоў Ваеннай акадэміі ён гаварыў: «Будуць у нас добрыя і шматлікія кадры... у арміі, наша краіна будзе непераможна»[1]). Таварыш Сталін выхоўваў гэтыя кадры для арміі, вырошчваў таленавітых ваеначальнікаў, здольных кіраваць часцямі і злучэннямі. Пад яго непасрэдным кіраўніцтвам мацнела, удасканальвалася і расла баявая сіла Чырвонай Арміі, яе тэхнічная і тактычная вывучка. Ён знаходзіў час для дапамогі вынаходцам, клапатліва вырошчваў совецкіх канструктараў усіх відаў зброі. Пад яго кіраўніцтвам вырашаліся пытанні аб прыёме новых узораў совецкай зброі на ўзбраенне арміі, авіяцыі і флота.

Як і ўвесь наш народ, Совецкая Армія жыла, вучылася і выхоўвалася на аснове вялікага вучэння Леніна—Сталіна. Яна расла і загартоўвалася ў ідэйна-палітычных адносінах. І ў гэтым яе сіла.

---

[1]) І. Сталін. Пытанні ленінізма, выд. 11-е стар. 491.

Сілу і магутнасць Совецкай Арміі не адзін раз адчулі на сабе імперыялістычныя разбойнікі і іх агенты, прабаваўшыя пасягнуць на свяшчэнныя совецкія рубяжы і падняць зброю супроць нашага народа.

Адначасова наша партыя і Совецкі ўрад прымалі ўсе меры, каб адстаяць мір і ўсеагульную бяспеку. Совецкая знешняя палітыка—ясная і паслядоўная—нязменна зрывала планы і правакацыі імперыялістычных драпежнікаў, не гледзячы на іх інтрыгі і імкненні ўцягнуць нашу краіну ў вайну. Звыш 20 год наш народ, дзякуючы мудрасці нашага ўрада, змог мірна будаваць і мацаваць соцыялістычную дзяржаву, развіваць і памнажаць яго эканамічную і ваенную магутнасць і тым забяспечваць усё ўзрастаючы міжнародны аўтарытэт і сілу соцыялістычнай дзяржавы.

У дакладзе на XVII з'ездзе ВКП(б) таварыш Сталін гаварыў: «СССР не думае пагражаць каму-б там ні было і—тым больш—нападаць на каго-б там ні было. Мы стаім за мір і адстайваем справу міру. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны».

Гэта было грознае папярэджанне ворагам совецкага народа, нашай дзяржавы. Ахоўваючы стваральную працу і недатыкальнасць совецкіх граніц, Чырвоная Армія была ў пастаяннай баявой гатоўнасці. І ўсякі раз, калі імперыялістычныя разбойнікі прабавалі пасягаць на інтарэсы совецкай дзяржавы, уварвацца ў межы нашай Радзімы, яны атрымлівалі знішчальны адпор Совецкай Арміі.

Летам 1938 года японскія войскі прабавалі прарвацца на совецкую зямлю ля возера Хасан. Планы захопу тэрыторыі Совецкага Саюза японскія імперыялісты вынашвалі даўно. У якасці плацдарма для нападу японскія імперыялісты рашылі скарыстаць Маньчжурыю, захопленую імі ў слабой дзяржавы — Кітая. Але разлікі і планы японцаў не збыліся. Чырвоная Армія дала ім павучальны ўрок у раёне возера Хасан. Адборныя, добра ўзброеныя войскі японскага імперыялізма былі разбіты совецкімі войскамі і выкінуты з нашай зямлі.

Але мілітарысты Японіі не сунімаліся. У 1939 годзе яны па-разбойніцку напалі на дружаственную нам Мангольскую Народную Рэспубліку ў раёне ракі Халхін-Гол. У японскіх імперыялістаў была мэта: захапіць мангольскую зямлю, расшырыць плацдарм і потым пачаць ужо дзеянні супроць Совецкай дзяржавы. Маючы дагавор аб узаемадапамозе з Мангольскай Народнай Рэспублікай і прымаючы меры да аховы

ўласнай бяспекі, Чырвоная Армія выступіла супроць імперыялістычных драпежнікаў.

Совецкія войскі нанеслі японцам сакрушальны ўдар. Армія разбойніцкага імперыялізма была акружана і поўнасцю знішчана доблеснымі совецкімі войскамі. Толькі забітымі японцы страцілі каля 25 000 салдат і афіцэраў. Вораг страціў 660 самалётаў, велізарную колькасць гармат, кулямётаў і іншай баявой тэхнікі. Так бясслаўна для японскіх імперыялістаў закончылася іх другая авантура ў раёне ракі Халхін-Гол. Тут упершыню ў гісторыі войн совецкія войскі прымянілі свае паветрана-дэсантныя войскі.

Такім чынам, дзве ваенныя правакацыі японскага разбойніцкага імперыялізма—у раёне возера Хасан і на рацэ Халхін-Гол — скончыліся для яго ганебным крахам.

У тым-жа годзе, увосень, германскі разбойніцкі імперыялізм, які развязаў вайну ў Еўропе, вераломна напаў на Польшчу. Совецкая дзяржава, якая заўсёды стаіць на варце міру і бяспекі, папярэджвала ўрады Англіі і Францыі аб сур'ёзнай ваеннай пагрозе з боку нямецкага фашызма. Але ўрады імперыялістычнай буржуазіі не толькі не перашкаджалі агрэсару, але ўсяляк заахвочвалі яго паскораную падрыхтоўку да вайны і штурхалі яго на вайну. Разлікі англа-французскіх імперыялістаў былі простыя: Германія нападзе на СССР, а іх краіны, застаючыся ў баку ад вайны, захаваюць і ўмацуюць свае сілы... Але гэтым планам не давялося збыцца: разграміўшы Польшчу, германскі імперыялізм рушыў свае войскі на Францыю і Англію.

Калі Польшча і яе армія была разбіта, стварылася пагроза нямецка-фашысцкага заняволення для нашых братоў—украінцаў і беларусаў, якія пражывалі ў Польшчы. Наша дзяржава не магла дапусціць заняволення фашыстамі брацкіх народаў Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Совецкія войскі па загаду нашага ўрада выступілі ў вызваленчы паход і ўзялі пад абарону жыццё і маёмасць насельніцтва Заходняй Украіны і Заходняй Беларусі. Совецкая Армія, уступіўшы на тэрыторыю гэтых абласцей, выратавала насяляўшыя іх народы ад жахаў фашысцкай дыктатуры і забяспечыла ім уз'яднанне з Совецкай Украінай і Совецкай Беларуссю. Наша армія — армія-вызваліцельніца ажыццявіла гэтым сваім паходам пачэсную і высокародную місію. Для мільёнаў украінцаў і беларусаў, якія доўга марылі аб дні свайго ўз'яднання ў адзінай дзяржаве з брацкімі народамі, наступілі радасныя, шчаслівыя дні.

Гэтае доўгачаканае ўз'яднанне было забяспечана Совецкай Арміяй.

Той-жа восенню 1939 года совецкія ўзброеныя сілы зноў выступілі на абарону інтарэсаў Совецкай дзяржавы. На гэты раз ваенныя дзеянні прышлося весці супроць Фінляндыі, якая падняла зброю супроць нашай краіны. Падбухторваемая імперыялістамі ЗША, Англіі і Францыі фінская буржуазія прадпрыняла спробу—ужо ў другі раз—ажыццявіць свае авантурыстычныя планы стварэння «Вялікай Фінляндыі»—ад Балтыйскага мора да Урала. Фінская буржуазія «забыла» ўрокі мінулага, калі Чырвоная Армія выкінула іх банды з Карэліі. Нападаючы на СССР у 1939 годзе, фінскія захопнікі мелі сур'ёзнае падтрыманне імперыялістычнай буржуазіі мацнейшых дзяржаў. Над нашымі паўночна-заходнімі граніцамі і непасрэдна над Ленінградам навісла пагроза. Вайна з фінамі праходзіла ў небывала суровых зімовых умовах (1939 — 1940 гг.) і на вельмі цяжкапраходнай мясцовасці, усякімі спосабамі ўмацаванай праціўнікам. Совецкія войскі, праяўляючы доблесць і высокае воінскае майстэрства, прарвалі гэтую магутную лінію ўмацавання ворага, вядомую «лінію Манергейма», на Карэльскім перашыйку. Нашы войскі разбілі фінскую армію, і фінскія імперыялісты запрасілі міру.

Такім чынам і на гэты раз Чырвоная Армія, кіруемая большэвіцкай партыяй, абараніла совецкую зямлю ад пасяганняў нахабных захопнікаў. Мы забяспечылі бяспеку горада Леніна і совецкіх паўночна-заходніх граніц. Гэтыя нашы граніцы ў раёне Ленінграда былі адсунуты на 150 кілометраў, і бяспека СССР была і тут умацавана.

Так, на працягу двух дзесяцігоддзяў доблесная Чырвоная Армія пільна стаяла на варце інтарэсаў Совецкай дзяржавы, верна несла ахову стваральнай працы совецкага народа, спакою і бяспекі соцыялістычнай краіны. Створаная Леніным і Сталіным і выпеставаная партыяй большэвікоў, яна ўвесь час нязменна была верна вялікім ідэям свяшчэннай вызваленчай барацьбы, расла і ўдасканальвалася. Яна зрывала ўсе каварныя планы і разлікі імперыялістычнай буржуазіі, накіраваныя для таго, каб перашкодзіць паспяховаму будаўніцтву соцыялізма ў нашай краіне. Рашуча і смела перасякала яна адкрытыя спробы імперыялістычных разбойнікаў уварвацца ў межы совецкай тэрыторыі.

★

# У ГАДЫ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ СОВЕЦКАЯ АРМІЯ ВЕРНА СЛУЖЫЛА РАДЗІМЕ

22 чэрвеня 1941 года, узброеныя да зубоў, нямецкія полчышчы вераломна, без абвяшчэння вайны, напалі на Совецкі Саюз. Наша краіна за сваю многавяковую гісторыю неаднаразова падвяргалася нападу ворагаў. І ніколі яшчэ яе народу і арміі не даводзілася перажываць такое суровае і цяжкае выпрабаванне. Аднак совецкі народ не сумняваўся ў тым, што Чырвоная Армія з чэсцю выканае свой абавязак перад Радзімай, адстаіць вялікія заваёвы Кастрычніка.

У першыя-ж дні вайны партыя большэвікоў ажыццявіла рад мерапрыемстваў па ўмацаванню ваеннай магутнасці нашай Радзімы. У мэтах хуткай мабілізацыі ўсіх сіл для рашучага адпору ворагу быў створан Дзяржаўны Камітэт Абароны. У яго руках сканцэнтроўвалася ўся паўната ўлады ў Совецкай дзяржаве. Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР, Совет Народных Камісараў і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) паставілі вялікага правадыра і геніяльнага палкаводца таварыша Сталіна на чале Дзяржаўнага Камітэта Абароны.

Суровая вайна, навязаная нашаму народу фашысцкай клікай імперыялістычнай Германіі, з'явілася гістарычным «выпрабаваннем нямецкага імперыялізма з яго фашысцкай арганізацыяй і соцыялізма ў асобе Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік» [1]).

---

[1]) **Н. Вазнесенскі.** Ваенная эканоміка СССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, стар. 5.

У гістарычным звароце да нашага народа 3 ліпеня 1941 года таварыш Сталін з выключнай глыбінёй і сілай ускрыў перад совецкім народам сур'ёзнасць навісшай пагрозы. Таварыш Сталін паказаў твар жорсткага бязлітаснага ворага, які «... ставіць сваёй мэтай захоп нашых зямель, палітых нашым потам, захоп нашага хлеба і нашай нафты, здабытых нашай працай. Ён ставіць сваёй мэтай аднаўленне ўлады памешчыкаў, аднаўленне царызма, разбурэнне нацыянальнай культуры і нацыянальнай дзяржаўнасці рускіх, украінцаў, беларусаў, літоўцаў, латышоў, эстонцаў, узбекаў, татар, малдаван, грузін, армян, азербайджанцаў і іншых свабодных народаў Совецкага Саюза, іх анямечанне, іх ператварэнне ў рабоў нямецкіх князёў і баронаў»[1]).

Такім чынам справа ішла, як указваў таварыш Сталін, «... аб жыцці і смерці Совецкай дзяржавы, аб жыцці і смерці народаў СССР, аб тым—быць народам Совецкага Саюза свабоднымі, або стаць заняволенымі».

Якія-ж задачы ўсталі перад нашай арміяй і народам у сувязі з такім крытычным становішчам соцыялістычнай Радзімы? У той-жа прамове таварыш Сталін заклікаў совецкіх людзей, совецкіх воінаў зразумець усю глыбіню небяспекі, якая пагражала нашай краіне, адрашыцца ад дабрадушша, бесклапотнасці, настрояў мірнага часу; мабілізаваць сябе і перабудаваць усю работу на ваенны лад; не ведаць страху ў барацьбе з ворагамі Радзімы, быць храбрымі, самааддана і мужна ісці на Айчынную вызваленчую вайну супроць фашысцкіх прыгнятальнікаў. «Чырвоная Армія, Чырвоны Флот і ўсе грамадзяне Совецкага Саюза,—гаварыў таварыш Сталін,—павінны адстайваць кожную пядзю совецкай зямлі, біцца да апошняй кроплі крыві за нашы гарады і сёлы, праяўляць смеласць, ініцыятыву і кемлівасць, уласцівыя нашаму народу».

Таварыш Сталін заклікаў наш народ ператварыць усю краіну ў ваенны лагер, перавесці ўсю народную гаспадарку на ваенныя рэльсы. Ён ставіў перад ім баявую задачу—разгарнуць магутны партызанскі рух у раёнах, часова акупіраваных нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Раскрываючы перад народам характар і мэты гэтай вайны, таварыш Сталін паказаў, што яна з'яўляецца вялікай вызваленчай вайной усяго нашага народа супроць нямецка-фашысцкіх войск, вайной за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы.

«Наша першая мэта,—указваў таварыш Сталін,—заклю-

---

[1]) І. Сталін. Вялікая Айчынная вайна Совецкага Саюза, стар. 8.

чаецца ў тым, каб вызваліць нашы тэрыторыі і нашы народы ад нямецка-фашысцкага іга. У нас няма і не можа быць такіх мэт вайны, як навязванне сваёй волі і свайго рэжыму славянскім і іншым заняволеным народам Еўропы, якія чакаюць ад нас дапамогі. Наша мэта заключаецца ў тым, каб дапамагчы гэтым народам у іх вызваленчай барацьбе супроць гітлераўскай тыраніі і потым прадаставіць ім зусім свабодна ўстроіцца на сваёй зямлі так, як яны жадаюць» [1]).

Згуртаваўшыся вакол вялікага рускага народа, усе народы Совецкага Саюза аднадушна выступілі, па закліку большэвіцкай партыі, вялікага правадыра працоўных таварыша Сталіна, на абарону сваёй мацеры-Радзімы, на вялікую свяшчэнную вайну супроць нямецка-фашысцкіх орд.

К моманту нападу фашысцкіх полчышч на нашу краіну Германія здолела заняволіць большасць краін Еўропы—Аўстрыю, Чэхаславакію, Польшчу, Югаславію, Данію, Нарвегію, Бельгію, Галандыю, Люксембург, Францыю, Грэцыю. Маючы ваенныя і эканамічныя рэсурсы пакароных краін, немцы разлічвалі таксама на арміі сваіх саюзнікаў—Фінляндыі і Венгрыі, Румыніі і Італіі, петэнаўскай Францыі, царскай Балгарыі і франкісцкай Іспаніі, а таксама на рэальную дапамогу квіслінгаў раду краін (Нарвегіі, Даніі, Галандыі, Бельгіі).

Гітлер і яго кліка лічылі, што асноўнай перашкодай на шляху Германіі да сусветнага панавання стаіць Совецкая Расія. Таму яны рашылі разграміць і знішчыць Совецкую дзяржаву і яе армію, а потым ужо завяршыць заваяванне астатняга свету.

Гітлераўцы разлічвалі, што іх раптоўны і вераломны напад засцігне нашу краіну і армію знянацку і не дасць нам часу адмабілізаваць нашу народную гаспадарку і совецкія ўзброеныя сілы. Яны лічылі, што Совецкая Армія не вытрымае раптоўнага і моцнага ўдару і распадзецца ў выніку першага-ж сур'ёзнага сутыкнення з нямецкай арміяй.

Фашысцкае камандаванне разлічвала, далей, на нетрываласць совецкай улады, унутранай палітычнай структуры Совецкай дзяржавы, на міжусобіцы і паўстанні ў нашым тылу, на нетрываласць дружбы народаў СССР. Але ўсе гэтыя разлікі былі пабудаваны на пяску—яны не ўлічвалі сілы і трываласці Совецкай дзяржавы і тых магчымасцей, якія былі закладзены ў ёй.

Узначальваемы гітлераўскай клікай нямецкі імперыялізм

---

[1]) І. Сталін. Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 25.

ставіў сабе мэтай не толькі захапіць совецкія тэрыторыі і нашы багацці. Ён імкнуўся знішчыць усё тое, што было здабыта і заваявана шматгадовай працай совецкага народа. «Мы знішчым Расію, каб яна больш ніколі не змагла падняцца», — гаварыў вар'ят Гітлер. У спецыяльнай гітлераўскай дырэктыве меркавалася перамагчы Совецкую Расію «шляхам хуткацечнай ваеннай аперацыі» яшчэ да сканчэння вайны з Англіяй. Д'явальская дырэктыва мела на ўвазе кінуць супроць нас усе ваенныя сілы не толькі Германіі, але і яе саюзнікаў па разбою. Гітлераўцы пакідалі ў сябе толькі тыя войскі, якія неабходны былі ім для падтрымання «новага парадку», створанага ў акупіраваных германскім імперыялізмам краінах.

Фашысцкія разбойнікі намерваліся далучыць да Германіі совецкія прыбалтыйскія рэспублікі, Совецкую Беларусь, Совецкую Украіну, Крым і Каўказ. Што датычыць волжскіх абласцей і раёнаў бакінскай нафты, то яны павінны былі стаць «нямецкай ваеннай калоніяй». Усходнюю Карэлію немцы планіравалі аддаць фінам, а Кольскі поўвостраў «рашылі» пакінуць за сабой. Ленінград таксама меркавалася перадаць фінам, пасля папярэдняга разбурэння горада.

Нямецка-фашысцкія захопнікі, планіруючы вайну, ставілі задачу разбурыць усю нашу прамысловасць. Абсталяванне совецкіх заводаў і фабрык яны меркавалі вывезці да сябе, у Германію. Усе захопленыя заняволеныя і далучаныя да імперыялістычнай Германіі совецкія рэспублікі і вобласці гітлераўскія разбойнікі мелі намер ператварыць у сельскагаспадарчыя раёны, г. зн. у аграрна-сыравінныя прыдаткі Германіі. Гэтыя раёны, па іх замыслу, павінны пастаўляць для Германіі сыравіну і харчаванне.

Фашысты яшчэ задоўга да вайны падрыхтавалі не толькі ваенныя планы дзеянняў, але і распрацавалі ў дэталях д'явальскую сістэму гвалтаў, масавага грабяжу, анямечання нашага насельніцтва, знішчэння совецкіх людзей. Яны ставілі сваёй задачай разбурэнне і знішчэнне соцыялістычнай дзяржавы, ператварэнне свабодалюбівых народаў СССР у рабоў нямецкага імперыялізма.

Але Гітлер і яго кліка жорстка пралічыліся. Унутраных канфліктаў у нашай краіне не было і не магло быць таму, што мудрая сталінская палітыка партыі і Совецкага ўрада адпавядае карэнным інтарэсам рабочых, сялян і інтэлігенцыі ўсіх народаў вялікага Совецкага Саюза. Абалваненыя гебельсаўскай прапагандай немцы не маглі зразумець таго, што знішчэнне ў Совецкім Саюзе эксплаататарскіх класаў забяспе-

чыла маральна-палітычнае адзінства народаў нашай краіны, трывалы саюз рабочага класа і сялянства, непарушную дружбу ўсіх народаў СССР. Грамадскі і дзяржаўны лад нашай краіны аказаўся больш трывалым, чым у любой іншай краіне. Небяспека варожага нашэсця яшчэ цясней згуртавала совецкі народ вакол комуністычнай партыі і нашага ўрада. «Вайна з фашысцкай Германіяй стала свяшчэннай вайной усіх народаў, насяляючых Совецкі Саюз, за сваё нацыянальнае існаванне, за Радзіму, за соцыялізм» *(Вазнесенскі)*.

Сталінская дружба народаў СССР перад тварам грознай небяспекі стала яшчэ больш трывалай, непераможнай сілай. Рабочыя і сяляне яшчэ больш згуртаваліся вакол совецкага ўрада, партыі большэвікоў, каб абараніць сваю Радзіму. Разлік фашыстаў на нетрываласць совецкага ладу ганебна праваліўся.

«Няўдачы Чырвонай Арміі,—гаварыў таварыш Сталін 6 лістапада 1941 г., — не толькі не аслабілі, а наадварот, яшчэ больш умацавалі як саюз рабочых і сялян, так і дружбу народаў СССР. Больш таго,—яны ператварылі сям'ю народаў СССР у адзіны, непарушны лагер, які самааддана падтрымлівае сваю Чырвоную Армію, свой Чырвоны Флот. Ніколі яшчэ совецкі тыл не быў такім моцным, як цяпер» [1]).

Фашысцкае камандаванне, разлічваючы на слабасць Совецкай Арміі, меркавала, што нямецкім войскам удасца прарвацца ў глыб Совецкай дзяржавы, у кароткі тэрмін дасягнуць Урала і разграміць узброеныя сілы СССР. Але маральна-баявыя якасці Совецкай Арміі, Авіяцыі і Флота былі не тыя, якімі лічыла іх гітлераўскае ваеннае камандаванне. «Узняцце культуры насельніцтва СССР і рост кваліфікаваных кадраў у горадзе і вёсцы пераўтварылі састаў Совецкай Арміі і забяспечылі яе гістарычныя перамогі ў Айчыннай вайне» [2]).

Значыцца, гітлераўцы і тут пралічыліся, недаацаніўшы моц і магчымасці совецкіх узброеных сіл і пераацаніўшы сілы сваёй нямецкай арміі. Іх разлікі на знішчэнне Совецкай Арміі аказаліся авантурыстычнымі. Совецкая Армія, Авіяцыя і Ваенна-Марскі Флот не толькі вытрымалі мацнейшы ўдар фашысцкіх полчышчаў, але ўжо ў першы перыяд вайны нанеслі ім рад сур'ёзных паражэнняў. За першыя чатыры месяцы вайны немцы страцілі забітымі, раненымі і палоннымі звыш чатырох з палавінай мільёнаў чалавек.

---

[1]) **І. Сталін.** Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 15.

[2]) **Н. Вазнесенскі.** Ваенная эканоміка СССР у перыяд Вялікай Айчыннай вайны, стар. 27.

Совецкая Армія знішчала жывую сілу і тэхніку гітлераўскіх полчышчаў і затрымлівала іх прасоўванне. Дзякуючы гэтаму, Совецкая дзяржава атрымала магчымасць перабазіраваць у глыб нашай краіны вялікую колькасць буйных, галоўным чынам, ваенных прадпрыемстваў; перабудаваць на ваенны лад прамысловасць усіх раёнаў нашай Радзімы і разгарнуць шырокую падрыхтоўку новых рэзерваў краіны на дапамогу фронту.

Совецкай Арміі прышлося адной змагацца супроць армій цэлага блока фашысцкіх дзяржаў і вынесці на сваіх плячах галоўны цяжар барацьбы з ворагам. Кінуўшы супроць СССР 170 адборных дывізій, дзесяткі тысяч танкаў і самалётаў, скарыстоўваючы раптоўнасць і вераломнасць нападу, нямецкія захопнікі спадзяваліся нанесці маланкавае паражэнне Совецкай Арміі і праз тры тыдні авалодаць Масквой. Першы моцны ўдар нямецкай ваеннай машыны прынялі на сябе совецкія пагранічнікі і часці Чырвонай Арміі, якія былі размешчаны каля граніцы. Яны мужна і стойка адбівалі націск варожых полчышчаў, самааддана змагаліся за кожную пядзю роднай зямлі, праяўляючы бяспрыкладны гераізм і стойкасць.

Ужо першыя баі паказалі гітлераўцам, што з планам «маланкавай» вайны супроць СССР у іх нічога не атрымліваецца. Такога супраціўлення яны не сустракалі за ўвесь час баявых дзеянняў у краінах Заходняй Еўропы.

Сваё наступленне на Маскву вораг прадпрыймаў двойчы. У першы раз, у кастрычніку 1941 года немцам цаною велізарных страт удалося прасунуцца толькі да далёкіх подступаў Масквы. Далейшае прасоўванне ворага было спынена. Другое наступленне на Маскву фашысцкія разбойнікі пачалі ў сярэдзіне лістапада, кінуўшы 51 дывізію, у тым ліку 13 танкавых, 5 матарызаваных і 33 пяхотныя. Фашысцкае камандаванне, пры дапамозе танкавых груп, спрабавала абыйсці Маскву з абодвух флангаў, самкнуць кальцо акружэння і потым штурмам авалодаць Масквой. Совецкая Армія з выключнай стойкасцю і мужнасцю адбівала ўсе атакі немцаў. Дэвізам кожнага совецкага воіна, які абараняў родную сталіцу, было «стаяць насмерць».

Вораг нёс велізарныя страты. Толькі за 20 дзён лістападаўскага наступлення на Маскву ён страціў забітымі дзесяткі тысяч салдат і афіцэраў. Совецкія войскі за гэты час знішчылі і захапілі сотні нямецкіх танкаў, гармат, аўтамашын і многа іншай баявой тэхнікі. Сілы праціўніка на гэтым участку совецка-германскага фронта знішчаліся.

Між тым Совецкае Вярхоўнае Галоўнакамандаванне, падцягнуўшы да сталіцы свежыя рэзервы, 6 снежня 1941 года павяло войскі ў рашучае контрнаступленне. Совецкая Армія нанесла ворагу ўдары такой сілы, што нямецкая армія была прымушана да бегства, адкінута ад Масквы і ўсеяла шляхі свайго адступлення тысячамі трупаў салдат і афіцэраў•і масай разбітай тэхнікі. Усяго за зімнюю кампанію 1941—42 гг. совецкія войскі вызвалілі больш 11 тысяч населеных пунктаў, у тым ліку 60 гарадоў.

Такім чынам, зімняе наступленне Совецкай Арміі сарвала планы фашысцкага камандавання, якія прадугледжвалі захоп Масквы, Ленінграда, Каўказа і ўсёй цэнтральнай часткі Расіі. Рашучы разгром ворага пад совецкай сталіцай з'явіўся буйнай падзеяй першага года Айчыннай вайны і першым буйным паражэннем нямецкіх захопнікаў у другой сусветнай вайне. У выніку яго совецкія войскі ў цяжкіх зімніх умовах адкінулі немцаў месцамі больш чым на 400 *км*. Была развеяна казка аб «маланкавасці» вайны і непераможнасці нямецкай арміі. Апрача таго, разгром ворага пад Масквой паказаў велізарную перавагу распрацаванага таварышам Сталіным стратэгічнага плана наступальных аперацый перад стратэгіяй фашысцкага камандавання.

Разам з тым баі пад Масквой наглядна паказалі, што нямецка-фашысцкія войскі страцілі тую ваенную перавагу, якую яны мелі ў выніку вераломства і раптоўнасці нападу на Совецкі Саюз.

«Цяпер,—указваў таварыш Сталін,—лёс вайны будзе рашацца не такім прыўваходзячым момантам, як момант раптоўнасці, а пастаянна дзеючымі фактарамі: трываласць тылу, маральны дух арміі, колькасць і якасць дывізій, узбраенне арміі, арганізатарскія здольнасці начальніцкага састава арміі»[1]).

Совецкая Армія вырасла, загартавалася, удасканаліла сваё воінскае майстэрства, уменне перамагаць ворага. Яна на вопыце вучылася ваеннай справе, вывучала ў дасканаласці зброю. Совецкія воіны сталі майстрамі баявога майстэрства і навучыліся «біць ворага наверняка» *(Сталін)*. Наша армія стала больш арганізаванай і моцнай. Нанесенае ворагу паражэнне пад Масквой патрасло ўсю германскую ваенную машыну.

Але гітлераўцы скарысталі тую акалічнасць, што англійскі

[1]) **І. Сталін.** Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 33.

ўрад на чале са злейшым ворагам совецкага народа Чэрчылем тармазіў адкрыццё другога фронта ў Еўропе. Гэта дало магчымасць гітлераўцам аправіцца ад атрыманых моцных удараў Чырвонай Арміі і прадпрыняць летам 1942 года новае наступленне супроць Чырвонай Арміі. Аднак у нямцаў нехапала ўжо сіл для таго, каб наступаць па ўсяму фронту, як гэта ўдавалася ім у першыя месяцы вайны. Гітлер і яго кліка стварылі ўдарныя групіроўкі на паўднёва-заходнім напрамку совецка-германскага фронта. Стварыўшы вялікую перавагу ў сілах на гэтым фронце, фашысты прасунуліся ў глыб нашай тэрыторыі, хоць і неслі велізарныя страты. Вораг паставіў пад пагрозу Сталінград, Каўказскае ўзбярэжжа Чорнага мора, Грозны і подступы да Закаўказзя.

Стратэгічнай мэтай гэтага наступлення паранейшаму было чаго-б гэта ні каштавала дабіцца разгрому Совецкай Арміі, адрэзаць цэнтральныя раёны краіны ад Поўдня і абыходам з усходу авалодаць сталіцай нашай краіны—Масквой. Таварыш Сталін разгадаў гэтыя каварныя планы ворага. Ён паставіў перад Совецкай Арміяй задачу—знясіліць і абяскровіць праціўніка, які рваўся да Сталінграда; прымусіць яго зрасходаваць усе рэзервы і, выйграўшы час, падрыхтаваць пераход нашых войск у контрнаступленне для поўнага знішчэння ворага. Пад Сталінградам вораг быў спынен, і тут яму было ўстроена нябачанае ў гісторыі пабоішча.

7 лістапада 1942 года, у дзень 25-й гадавіны совецкай улады, таварыш Сталін заявіў: «Недалёка той дзень, калі вораг пазнае сілу новых удараў Чырвонай Арміі. Будзе і на нашай вуліцы свята!» І такое свята наступіла.

Узбагаціўшыся вопытам Айчыннай вайны, Совецкая Армія навучылася біць і знішчаць ворага наверняка, знішчаць яго жывую сілу і баявую тэхніку. Нашы генералы і афіцэры ў ходзе вайны авалодалі арганізацыяй узаемадзеяння артылерыйскага і авіяцыйнага наступлення, авалодалі тактыкай манеўравання і разгрому ворага, выпрацаванай таварышам Сталіным. Ужо к сярэдзіне лістапада 1942 г. у жорсткіх абараняльных бітвах лепшыя, самыя адборныя, гітлераўскія дывізіі, якія прадназначаліся для правядзення кампаніі 1942 года, былі перамолаты нашымі войскамі. Каласальныя страты звялі на нішто былую перавагу ворага ў жывой сіле і тэхніцы.

Гітлераўская армія, хоць усё яшчэ і прадаўжала свае атакі, але фактычна яна страціла да гэтага часу ініцыятыву ваенных дзеянняў; яна была па-майстэрску ўцягнута ў вузкі «мяшок» пад Сталінградам. З гэтага «мяшка» ўжо нельга было

разгарнуць ні наступленне на поўнач супроць совецкіх войск, ні адыходу назад. Праціўнік мітусіўся ў гэтым «мяшку». У адпаведнасці з геніяльным планам Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна к таму моманту, калі абазначыўся крызіс нямецкіх атак на Сталінград, была поўнасцю ўжо завершана падрыхтоўка да контрнаступлення, якое ажыццявілася адначасовым ударам Паўднёва-Заходняга фронта, Данскога і Сталінградскага франтоў.

Па-майстэрску арганізуючы акружэнне гітлераўскіх войск пад Сталінградам, геніяльны палкаводзец вялікі Сталін добра прадбачыў, што нямецкае камандаванне будзе прымаць рашучыя меры для аказання дапамогі сваёй сталінградскай групіроўцы. Таму на напрамках магчымых контрудараў ворага былі сканцэнтраваны моцныя рэзервы Чырвонай Арміі.

19 лістапада 1942 г. па Загаду Вярхоўнага Галоўнакамандуючага таварыша Сталіна пачалося каласальнае, сусветна-гістарычнае контрнаступленне Совецкай Арміі пад Сталінградам. Праз чатыры дні была поўнасцю акружана велізарная армія праціўніка. Прычым шматлікія спробы немцаў вызваліць сваю групіроўку поспеху не мелі.

У бітве пад Сталінградам дзве адборныя нямецкія арміі (6-я і 4-я танкавыя), а таксама 3-я румынская і 8-я італьянская арміі былі акружаны, поўнасцю знішчаны або ўзяты ў палон. Гэта контрнаступленне разгарнулася потым у магутнае стратэгічнае наступленне совецкіх войск па фронту 1500 кіламетраў і на глыбіню 500 — 700 кіламетраў. «Сталінград быў закатам нямецка-фашысцкай арміі, — гаварыў таварыш Сталін. — Пасля сталінградскага пабоішча, як вядома, немцы не маглі ўжо аправіцца».

Наступленне Совецкай Арміі пад Сталінградам завяршылася поўным акружэннем і ліквідацыяй велізарнай, добра ўзброенай і адборнай нямецкай 330-тысячнай арміі. Мільёны совецкіх людзей у часова акупіраванай Беларусі ўспрынялі перамогу Чырвонай Арміі пад Сталінградам, як радасную вестку, як залог блізкага вызвалення ад фашысцкага ярма. Яны ведалі, што Совецкая Армія несла ім вызваленне ад фашысцкага рабства.

Сталінград стаў для ўсяго свабодалюбівага чалавецтва вялікім сімвалам мужнасці, стойкасці і самаадданасці. «Гэта была,—сказана ў біяграфіі Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна,—самая выдатная перамога ў гісторыі вялікіх войн. Бітва за Сталінград — вянец ваеннага майстэрства; яна явіла новы прыклад удасканалення перадавой совецкай ваеннай навукі. Атрыманая

тут гістарычная перамога — яркае таржаство сталінскай стратэгіі і тактыкі, гаржаство геніяльнага плана і мудрага прадбачання вялікага палкаводца, праніклівa раскрыўшага замыслы ворага і скарыстаўшага слабасці яго авантурыстычнай стратэгіі». Ініцыятыва ваенных дзеянняў пасля гэтай вялікай перамогі перайшла ў рукі нашага камандавання.

Сталінградская бітва з'явілася паваротным пунктам у гісторыі Айчыннай вайны і адкрыла новы этап — этап няспынных наступальных баёў Совецкай Арміі. Нашы войскі акружалі і знішчалі нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

К вясне 1943 года совецкія войскі бліскуча закончылі сваю другую зімнюю кампанію. Вядома, што пасля цяжкіх паражэнняў ля Сталінграда і на другіх участках совецка-германскага фронта нямецкае камандаванне аказалася ў цяжкім становішчы. Яго планы «маланкавага» разгрому совецкіх узброеных сіл не толькі пацярпелі крах, але і прынеслі гітлераўскай Германіі велізарныя страты ў жывой сіле і баявой тэхніцы.

Фашысцкае камандаванне прадпрыняла спробы арганізаваць і павесці новае наступленне (летам 1943 г.) у раёне Орла і Курска. Гітлераўскае кіраўніцтва ў мэтах падняцця свайго прэстыжу ўнутры самой Германіі і сярод сваіх саюзнікаў рашыла любой цаной паказаць здольнасць нямецкай арміі да вядзення буйнага наступлення. На баку немцаў былі велізарныя масы войск і навейшая ваенная тэхніка. Германская армія была яшчэ моцнай і здольнай весці буйную наступальную аперацыю, буйныя баі на якім-небудзь адным напрамку. Тым больш, што другога фронта на Захадзе адкрыта яшчэ не было, і германская армія і арміі яе саюзнікаў у поўным саставе дзейнічалі на совецка-германскім фронце.

Плануючы прадаўжэнне вайны ў 1943 г., гітлераўскае камандаванне прыняло рашэнне добра падрыхтаваць і разгарнуць наступленне сваіх галоўных сіл у раёне Курска. Мэтай наступлення было — знішчыць курскую групіроўку Совецкай Арміі і гэтым стварыць сабе найлепшую абстаноўку для паследуючага разгортвання наступлення на сталіцу СССР — Маскву. Вынашваючы мары аб «рэваншы» за Сталінград і аб паходзе на Маскву, гітлераўскае камандаванне на працягу 3-х месяцаў рыхтавала гэтае наступленне, дэтальна распрацаваўшы яго план.

Але гэтае наступленне таксама скончылася поўным крахам. Гітлераўцы не змаглі дабіцца поспеху. Перамалоўшы жывую сілу і тэхніку немцаў, Совецкая Армія сама перайшла

ў контрнаступленне, якое ператварылася затым у магутнае наступленне.

Бітва Совецкай Арміі пад Курскам прадаўжалася ўсяго два тыдні. І які бліскучы вынік! На працягу гэтай бітвы немцы страцілі тысячы салдат і афіцэраў.

Разгром немцаў пад Курскам, як вядома, меў рашаючае значэнне для далейшага ходу Айчыннай вайны. Гэтая бітва адкрыла новую фазу ў баявых дзеяннях Совецкай Арміі, якая разгарнула сваё пабеданоснае наступленне на шырокім фронце — ад Заходняй Дзвіны да Кубані.

Гітлераўскія войскі неслі паражэнне за паражэннем, але праяўлялі ўпорнае супраціўленне і жорстка біліся за кожны апорны пункт. Совецкая Армія, якая ўзяла ініцыятыву ў свае рукі, амаль бесперапынна наступала, нарашчваючы сілу ўдараў. Летняя бітва пад Курскам, дзе гітлераўскае камандаванне імкнулася вярнуць сабе ініцыятыву, паставіла нямецкую армію перад катастрофай. Ва ўсіх нас свежы ў памяці салюты ад імені Радзімы ў чэсць доблесных войск. Першы такі салют быў дадзен 8 жніўня 1943 г. у чэсць вызвалення Орла і Белгарада. За пяць месяцаў таго-ж года Радзіма салютавала доблесным войскам Чырвонай Арміі, якія атрымлівалі перамогу за перамогай, 35 разоў.

Таварыш Сталін гаварыў, ацэньваючы перамогу нашых войск пад Курскам: «Калі бітва пад Сталінградам прадвяшчала закат нямецка-фашысцкай арміі, то бітва пад Курскам паставіла яе перад катастрофай».

1943 год стаў пераломным у ходзе Вялікай Айчыннай вайны. Ужо к лістападу совецкімі войскамі было вызвалена да двух трэцей совецкай зямлі, часова захопленай гітлераўскімі войскамі. Гістарычныя перамогі Совецкай Арміі ў выніку яе пабеданоснага наступлення пад Масквой, Сталінградам і Курскам выдатна падрыхтавалі паспяховае ператварэнне ў жыццё планаў Вярхоўнага Галоўнакамандавання; наша армія не ўпускала з сваіх рук стратэгічнай ініцыятывы.

Совецкі Саюз, разгортваючы свае рэзервы, станавіўся ўсё мацнейшым і мацнейшым. Імперыялістычная Германія ў гэты-ж час усё больш знясілялася і слабела.

У рабоце совецкага тылу таксама адбыўся пералом. Совецкі народ, пад кіраўніцтвам вялікай партыі большэвікоў, зліўся ў дружную, многанацыянальную сям'ю працоўных і стаў магутнай, арганізаванай і непераможнай сілай.

У сваім дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) у 1938 г. тава-

рыш Сталін гаварыў: «Гэта значыць, між іншым, што ў выпадку вайны тыл і фронт нашай арміі, з прычыны іх аднароднасці і ўнутранага адзінства, будуць мацнейшымі, чым у любой іншай краіне, аб чым трэба было-б памятаць зарубежным любіцелям ваенных сутыкненняў» [1]).

Гэта геніяльнае прадбачанне таварыша Сталіна збылося. Совецкая Армія мела і мае самы трывалы тыл у свеце, які надзейна забяспечвае яе ў любых выпрабаваннях. Не шкадуючы сваіх сіл, совецкі народ забяспечыў сваю доблесную Чырвоную Армію ўсім неабходным для паспяховага вядзення вайны.

Ужо к восені і зіме 1942 г. наша краіна не толькі пераадолела цяжкасці, звязаныя з эвакуацыяй прамысловасці на ўсход, але і дасягнула значнага павелічэння вытворчасці баявой тэхнікі. Рост ваеннай вытворчасці даў магчымасць стварыць магутныя танкавыя і механізаваныя карпусы, паветраныя і артылерыйскія злучэнні.

Совецкая ваенная прамысловасць дзякуючы самаадданай працы народа з месяца ў месяц павышала сваю вытворчую магутнасць, нарашчвала тэмпы, павялічваючы выпуск дасканалага ўзбраення—танкаў, самалётаў, гармат усіх калібраў, кулямётаў, боепрыпасаў і стралковага ўзбраення. На совецка-германскі фронт з усіх канцоў нашай краіны няспынным патокам ішлі эшалоны са снаражэннем, боепрыпасамі і баявой тэхнікай.

Такім чынам, была забяспечана колькасная перавага ваеннай тэхнікі Совецкай Арміі над фашысцкай арміяй (па якасці наша ўзбраенне было лепшым за нямецкае яшчэ ў пачатку вайны). Самаадданая працавалі совецкія людзі ў нашым тылу. Іх гераічную працу, велізарныя заслугі рабочага класа, совецкага сялянства і інтэлігенцыі ў час вайны таварыш Сталін ахарактарызаваў як бяспрыкладны подзвіг народа ў абароне сваёй Радзімы.

Совецкая Армія атрымлівала перамогу за перамогай. Яна вызваліла Данбас, ачысціла левабярэжную Украіну і ўжо к канцу верасня 1943 года вышла на Днепр. Ішла бітва за Днепр, за Украіну. 6 лістапада 1943 г. у выніку жорсткіх баёў была вызвалена сталіца Украіны—горад Кіеў. Не аслабляючы свайго націску, совецкія войскі гналі ворага і ў зімнія месяцы, перамалваючы яго жывую сілу і баявую тэхніку.

---

[1]) **І. Сталін.** Справаздачны даклад на XVIII з'ездзе партыі аб рабоце ЦК ВКП(б), стар. 32.

У зімняй кампаніі 1943—44 гг. Совецкая Армія выйграла гістарычную бітву за Днепр і правабярэжную Украіну, выгнала ворага з Кіеўскай, Днепрапетроўскай, Запарожскай і Жытомірскай абласцей. Ровенская і Кіраваградская вобласці былі вызвалены амаль поўнасцю. Пачалося вызваленне раёнаў такіх абласцей, як Вінніцкая, Нікалаеўская, Каменец-Падольская і Валынская. Наша армія сакрушыла магутную абарону немцаў пад Ленінградам і ў Крыму; яна ачысціла ў зімняе наступленне ад немцаў амаль усю Украіну, Малдавію, Крым, Ленінградскую і Калінінскую вобласці і значную частку Совецкай Беларусі. Пераадолеўшы нямецкую абарону на водных рубяжах—Паўднёвы Буг, Днестр, Прут, Серэт,—совецкія войскі прадаўжалі наступаць. Амаль $^3/_4$ усёй акупіраванай ворагам совецкай тэрыторыі было вызвалена ў гэту кампанію. Совецкая Армія вышла да нашых дзяржаўных граніц на фронце агульным працяжэннем звыш 400 *км*.

У студзені 1944 года совецкія войскі, развіваючы сваё наступленне, зламалі і раздрабілі доўгачасовую абарону гітлераўскай арміі пад Ленінградам і Ноўгарадам.

Ажыццяўляючы сталінскі стратэгічны план, Совецкая Армія нанесла сакрушальны ўдар па нямецкіх войсках, якія асаджалі горад Леніна. Гэта быў першы ўдар з дзесяці ўдараў, якія наша армія нанесла на працягу 1944 года па нямецка-фашысцкіх войсках. Гэтым ударам азнаменаваўся пачатак года рашаючых гістарычных перамог совецкіх узброеных сіл.

Мужны Ленінград вытрымаў нябачаную ў гісторыі блакаду на працягу 29 месяцаў. Як найвялікшы прыклад нябачанага раней гераізма нашых людзей і жалезнай стойкасці і мужнасці ў барацьбе за соцыялістычную айчыну — такой увайшла ў слаўную гісторыю Ленінградская эпапея.

Гітлераўцы ў ярасці падвяргалі асаджаны Ленінград варварскаму абстрэлу з гармат і бамбардыроўцы з паветра. Гітлер хацеў любымі сродкамі знішчыць наш вялікі рускі горад. У Ленінградзе ў тыя дні кожны грамадзянін быў храбрым салдатам першай лініі фронта. Ніякія зверствы лютага ворага і яго паветраныя бамбардыроўкі не падарвалі маральнага духу мужнасці і стойкасці слаўных ленінградцаў.

Вядома, што 18 студзеня 1943 года, пасля жорсткіх баёў, нашы войскі прарвалі блакаду Ленінграда. А праз год Совецкая Армія нагалаву разграміла асаджаўшыя горад гітлераўскія полчышчы і поўнасцю вызваліла Ленінград ад варожай блакады.

Гэту выдатную перамогу нашай арміі таварыш Сталін назваў вялікай. 27 студзеня 1944 года ў загадзе па войсках Ленінградскага фронта гаварылася: «У працэсе баёў выраша-на задача гістарычнай важнасці: горад Ленінград поўнасцю вызвален ад варожай блакады і ад варожых артылерыйскіх абстрэлаў працiўніка»...

Калі совецкія войскі ўзялі Гатчыну, супраціўленне немцаў пад Ленінградам было зломлена. Наша армія вышла на аператыўны прастор і пачалося імклівае праследаванне і канчатковае знішчэнне разбітага ворага. Тут была разгромлена поўмільённая гітлераўская армія.

Гэта ленінградская аперацыя, якая з'явілася састаўной часткай агульнага сталінскага стратэгічнага плана Вярхоўнага Галоўнакамандавання, была бліскуча распрацавана па ініцыятыве і па ўказаннях таварыша Сталіна. Совецкія войскі паказалі, што яны добра ўмеюць узаемадзейнічаць на полі бітвы так, як гэтага патрабаваў ад іх Вярхоўны Галоўнакамандуючы вялікі Сталін. Яны паказалі ўзоры манеўравання ў баі. Тую адлегласць, якую немцы ў 1941 годзе пераадольвалі больш 90 дзён, нашы войскі з баямі прайшлі за 46 дзён. У студзені—лютым 1944 года войскі Ленінградскага фронта ва ўзаемадзеянні з войскамі Волхаўскага фронта поўнасцю вызвалілі ад ворага Ленінградскую вобласць, ачысцілі ўзбярэжжа Фінскага заліва да вусця ракі Нарва, вызвалілі Окцябрскую чыгунку—важнейшую магістраль, якая звязвае Ленінград з Масквой і іншыя чыгуначныя лініі. Немцы былі адкінуты ў Прыбалтыку.

Затым люты і сакавік азнаменаваліся поўным разгромам праціўніка на рацэ Буг; Совецкая Армія адкінула ворага за Днестр, вызваліла ўсю правабярэжную Украіну. Потым паследавалі ўдары совецкіх войск па ворагу ў раёне Крыма: у красавіку—маі Крым быў ачышчан ад праціўніка. Ужо ў чэрвені наша армія разбіла фінаў і авалодала Выбаргам і Петразаводскам, вызваліўшы большую частку Карэла-Фінскай рэспублікі.

Вялікія бітвы вяла Совецкая Армія з немцамі і на тэрыторыі Совецкай Беларусі. У той час, калі лінія совецка-германскага фронта, у выніку пабеданосных дзеянняў Совецкай Арміі, была значна адсунута на захад, Совецкая Беларусь усё яшчэ заставалася ў руках ворага.

Вялікі палкаводзец і правадыр народаў таварыш Сталін паставіў перад Чырвонай Арміяй у 1944 г. гістарычную зада-

чу: вызваліць ад гітлераўскіх мярзотнікаў усю совецкую зямлю, аднавіць дзяржаўныя граніцы СССР па ўсёй лініі, ад Чорнага да Барэнцава мора, праследаваць па пятах раненага фашысцкага звера і дабіць яго ў яго ўласнай бярлозе.

Совецкая Армія бліскуча выканала гэту задачу. Удар за ўдарам следавалі па ворагу па загадзя распрацаванаму плану совецкага камандавання на фронце ад Запаляр'я да Дуная. Совецкая Армія, у выніку гэтых магутных удараў, поўнасцю сакрушыла ўвесь Усходні фронт нямецка-фашысцкай арміі.

★

# ПЕРАМОГА СОВЕЦКАЙ АРМІІ Ў БЕЛАРУСІ

Совецкая Армія прышла на дапамогу беларускаму народу, які таміўся пад ігам нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Пачалося вызваленне народаў Совецкай Беларусі, Літвы, Латвіі і Эстоніі.

Совецкая Беларусь за гады совецкай улады, пры дапамозе вялікага рускага народа, дабілася велізарных поспехаў у сацыялістычным будаўніцтве. Валавая прадукцыя буйнай прамысловасці (па ўсходніх абласцях) к 1940 году перавысіла свой дарэволюцыйны ўзровень у 23 разы, магутнасць электрастанцый рэспублікі ў параўнанні з 1913 годам выросла больш чым у 100 разоў, а прадукцыя металаапрацоўчай прамысловасці павялічылася ў 58 разоў. Што датычыць заходніх абласцей, то ў іх за паўтара гады прабывання ў складзе БССР аб'ём прамысловай вытворчасці амаль падвоіўся. У БССР былі пабудаваны сотні новых прадпрыемстваў. Былі створаны такія новыя галіны прамысловасці, як станкабудаўніцтва, сельскагаспадарчае машынабудаўніцтва, вытворчасць рознай апаратуры, цэменту, штучнага валакна, фасфарытных угнаенняў і іншыя. Дзякуючы брацкай дапамозе вялікага рускага народа і ўсіх народаў Совецкага Саюза Беларусь за гады мірнага сацыялістычнага будаўніцтва ператварылася ў квітнеючую рэспубліку з перадавой прамысловасцю, буйнай высокамеханізаванай сацыялістычнай сельскай гаспадаркай і высокаразвітай культурай. Беларусь стала адной з перадавых саюзных рэспублік.

Калі 22 чэрвеня 1941 года нямецка-фашысцкія захопнікі

ўторгліся ў межы нашай Радзімы, то першыя ўдары вераломнага нападу прыняла на сябе Беларусь, над якой навісла чорная ноч фашысцкай няволі.

Гітлераўскія варвары расстралялі, павесілі, спалілі і закапалі жывымі за час сваёй крывавай акупацыі Беларусі сотні тысяч совецкіх людзей. Зверскім тэрорам, агнём і мечам нямецкія каты імкнуліся насадзіць гітлераўскі «новы парадак» у захопленай імі Беларусі, ператварыць яе ў калонію нямецкіх імперыялістаў, знішчыць яе дзяржаўную самастойнасць, заняволіць і анямечыць беларускі народ. Фашысцкія варвары нанеслі велізарнейшую страту рэспубліцы, разбурылі і спалілі яе сталіцу Мінск і 108 іншых гарадоў. Раней квітнеючыя гарады Беларусі—Гомель, Віцебск, Полацк, Баранавічы, Слуцк, Орша, Барысаў, Жлобін, Рагачоў і многія іншыя—былі ператвораны ворагам у руіны. У сельскіх мясцовасцях нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі звыш 1200 тысяч жылых дамоў, гаспадарчых пабудоў і культурных устаноў рэспублікі. Яны разбурылі 2,2 тыс. сёл і вёсак. Гэтае зладзейскае знішчэнне населеных пунктаў ажыццяўлялася па ўказу людаеда Гітлера і яго зграі. Люты вораг разграбіў і вывез у Германію абсталяванне прамысловых прадпрыемстваў, знішчыў калгаснае дабро. Нанесеная нямецка-фашысцкімі акупантамі матэрыяльная страта Беларусі вызначаецца каласальнай сумай — 75 млрд. рублёў. Працавіты народ Беларусі страціў у выніку нашэсця нямецка-фашысцкіх захопнікаў больш палавіны нацыянальнага багацця сваёй рэспублікі.

Гітлераўскія варвары знішчылі культурныя ўстановы беларускага народа, разграмілі Акадэмію навук БССР, а яе каштоўнасці разграбілі. Яны спалілі і раскралі сотні тысяч кніг Дзяржаўнай бібліятэкі БССР, разграбілі карцінную галерэю, разбурылі Горацкую сельскагаспадарчую акадэмію і мноства іншых грамадскіх, культурных і навуковых устаноў.

Насельніцтва Беларусі падвяргалася акупантамі зверскаму грабяжу і здзекам. Слязьмі і крывёю беларускага народа залілі свой шлях фашысцкія разбойнікі. Нечуваныя пакуты прынёс яму фашызм. Гітлераўскія зладзеі разарылі і апаганілі ўсё тое, што стваралася на працягу многіх год творчай працай народа. Фашысцкія варвары грабілі жывёлу, хлеб, машыны, сыравіну, культурныя каштоўнасці і т. д. і ўсё гэта вывозілі ў сваё логава—фашысцкую Германію. Разбураючы і спальваючы гарады, школы, бібліятэкі, помнікі старыны і т. п., яны жадалі пазбавіць Беларусь яе нацыянальнай культуры і

ператварыць беларускі народ у пакорных рабоў нямецкіх баронаў. Яны гвалтам уганялі ў Германію на прымусовую працу сотні тысяч мірных жыхароў Беларусі.

Па закліку таварыша Сталіна з першых-жа дзён Вялікай Айчыннай вайны беларускі народ, разам з усімі народамі Совецкага Саюза, узняўся на вялікую свяшчэнную барацьбу. Ён разгарнуў гераічную партызанскую вайну і павёў смяртэльную непрымірымую барацьбу супроць нямецка-фашысцкіх прыгнятальнікаў. Партызанскі рух у тылу ў ворага ператварыўся ў сапраўды ўсенародны рух, які ахапіў абшырныя раёны Беларусі. У гэтым знайшла сваё яркае выражэнне непарушная, кроўная сувязь народа з арміяй. Выконваючы гістарычныя ўказанні таварыша Сталіна ў яго прамове 3 ліпеня 1941 года, партыя большэвікоў Беларусі арганізоўвала і накіроўвала партызанскую вайну ў акупіраваных ворагам раёнах Беларусі. Тут дзейнічалі 9 падпольных абкомаў КП(б)Б і 174 гаркомы і райкомы КП(б)Б, у партызанскіх брыгадах і атрадах было 1113 пярвічных партарганізацый і 184 тэрытарыяльныя падпольныя арганізацыі. Выдаваліся дзве рэспубліканскія, восем абласных і 92 гарадскія і раённыя друкаваныя газеты. У дні вайны комуністы яшчэ больш умацавалі свае сувязі з шырокімі масамі народа. Партыйная арганізацыя Беларусі вырасла і загартавалася ў бітвах з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Яна яшчэ шчыльней сцэментавала беларускі свабодалюбівы народ вакол совецкага ўрада, вакол комуністычнай партыі большэвікоў, таварыша Сталіна. Вялікай славай пакрылі сябе беларускія партызаны і партызанкі. Узначальваемыя падпольнымі партыйнымі арганізацыямі, народныя мсціўцы разбуралі камунікацыі і сродкі сувязі, пускалі пад адкос эшалоны з жывой сілай і баявой тэхнікай ворага, грамілі і знішчалі склады. Народныя мсціўцы зрывалі ўсе мерапрыемствы акупантаў, нападалі на нямецкія штабы і гарнізоны і штодзённа ўсякімі спосабамі знішчалі захопнікаў.

Сваёй гераічнай барацьбой беларускія партызаны аказвалі дапамогу Совецкай Арміі ў вызваленні нашай Радзімы ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Яшчэ задоўга да прыходу Чырвонай Арміі ў радзе раёнаў Беларусі была адноўлена совецкая ўлада: 1/3 частка тэрыторыі Беларусі знаходзілася ўвесь час у руках народных мсціўцаў. Вядомая «рэйкавая вайна», якую вялі партызаны на камунікацыях ворага, паралізавала нямецкія тылы. У выніку — узарвана і знішчана 60 чыгуначных вадакачак і воданапорных вежаў, 303 940 чыгуначных рэек, каля 1000 чыгуначных мастоў і 12,6 тыс. мастоў на

шасейных і прасёлачных дарогах. Велізарную страту нанеслі партызаны ворагу таксама і ў галіне сувязі. Яны ўзарвалі і знішчылі каля 7 374 *км* тэлефонных і тэлеграфных ліній.

Мірнае насельніцтва Беларусі дапамагала народным мсціўцам харчаваннем і ўзбраеннем. Яно арганізавала для партызан чырвоныя абозы і дапамагала раненым байцам. Немцы вымушаны былі прызнаць, што «ў Беларусі не выяўлена, на каго можна было-б абаперціся». Сотні тысяч мужных і адважных сыноў і дочак беларускага народа, аб'яднаных у партызанскія атрады і злучэнні, вялі гераічную барацьбу супроць лютага, узброенага да зубоў ворага. Сіла ўдараў па ворагу ўзрастала з кожным днём. З набліжэннем наступаючых совецкіх войск партызаны яшчэ больш актывізавалі сваю баявую дзейнасць.

Многія тысячы народных мсціўцаў яшчэ ў дні вайны былі ўзнагароджаны совецкім урадам ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза. Лік узнагароджаных партызан к пачатку 1949 года перавышае 100 тыс. чалавек. 70 партызан і партызанак за праяўлены гераізм і мужнасць удастоены высокага звання Героя Совецкага Саюза. На ўвесь свет прагучэлі слаўныя подзвігі герояў партызанскай вайны, адданых сыноў беларускага народа Канстанціна Заслонава, Ціхана Бумажкова і многіх іншых народных мсціўцаў.

Совет Міністраў СССР і Цэнтральны Камітэт ВКП(б) у сваім прывітанні працоўным Беларусі ў дзень трыццацігоддзя рэспублікі адзначаюць: «У гады Вялікай Айчыннай вайны супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў беларускі народ разам з усімі народамі нашай краіны, па закліку большэвіцкай партыі, мужна змагаўся за свабоду і незалежнасць сваёй Совецкай Радзімы. Усенародная партызанская барацьба, якая разгарнулася на часова захопленай ворагам беларускай зямлі, з'явілася сур'ёзным укладам у агульную справу разгрому полчышчаў нямецка-фашысцкіх разбойнікаў».

Вялікай, ратнай славай пакрылі сябе сыны беларускага народа і на франтах Айчыннай вайны. 217 генералаў, тысячы афіцэраў, і сотні тысяч воінаў-беларусаў плячом к плячу з рускімі і украінцамі, грузінамі і армянамі і т. д. мужна і адважна змагаліся ў радах Совецкай Арміі на франтах Айчыннай вайны. Сярод воінаў-беларусаў, якія пакрылі сябе нямеркнучай славай — праслаўленыя героі Айчыннай вайны Гастэла, Талаліхін, Даватар, Палаўчэня, Антоненка, Пінчук, Дрозд, двойчы Герой Совецкага Саюза Грыцавец і іншыя легендарныя героі, якія паказалі прыклад храбрасці і гераізма ў ба-

рацьбе за свабоду і незалежнасць нашай Радзімы. Сярод сыноў беларускага народа, якія праславілі Совецкую Радзіму,— двойчы Героі Совецкага Саюза Сцяпан Шутаў, Павел Галавачоў, Іван Якубоўскі. Совецкі ўрад і комуністычная партыя высока ацанілі заслугі беларусаў — совецкіх воінаў у Вялікай Айчыннай вайне. 244 з іх было прысвоена званне Героя Совецкага Саюза, тысячы салдат, афіцэраў і генералаў былі ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі Совецкага Саюза.

Беларускі народ з чэсцю і славай прайшоў праз усе выпрабаванні Вялікай Айчыннай вайны. «Ні крывавы гітлераўскі рэжым, ні карныя экспедыцыі,—гаворыцца ў пісьме Вялікаму Сталіну ад беларускага народа,—не зламалі баявога духу беларускага народа, не прымусілі нас схіліць сваю галаву перад ворагам. Беларускі народ ведаў і верыў, што Вы, наш лепшы друг і бацька, вызваліце Беларусь з фашысцкага ярма...

Выконваючы Ваш геніяльны стратэгічны план вызвалення совецкай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Совецкая Армія нанесла ворагу рад сакрушальных удараў. Адным з іх быў пяты магутны ўдар совецкіх войск у 1944 годзе, у выніку якога была поўнасцю вызвалена Совецкая Беларусь»[1]).

* * *

23 чэрвеня 1944 г. пачалося наступленне Совецкай Арміі за вызваленне Беларусі. Наступленне праводзілася ў надзвычайна нявыгадных для совецкіх войск умовах. Тэрыторыя была абмежавана з поўначы Заходняй Дзвіной, з поўдня—паўднёвай ускраінай Палесся. На ўсходзе была ўзведзена моцная паласа абароны немцаў, якая ішла па лініі ракі Вялікая, Віцебск і ракі Проня. Далей, на поўдзень, праходзіла ўмацаваная паласа немцаў па лініі Жлобін і паўночна-ўсходней Мазыра, затым усходней Ковеля і заходней Луцка.

Раён, у якім разгортваліся баявыя дзеянні, меў многа лясоў, балот, шматлікія водныя артэрыі. Гэта мясцовасць была спрыяльнай для абароны ворага і затрудняла наступленне совецкіх войск. На шляху іх ляжалі такія перашкоды, як Днепр, Беразіна, Свіслач, Вілія, Шара, Нёман. Выкарыстоўваючы выгады мясцовасці, немцы стваралі абарону ўдоўж магутных водных рубяжоў. Натуральна, што фарсіраванне кожнай з гэтых рэк было звязана для нашых воінаў з велізарнымі цяжкасцямі.

---

[1]) «Вялікаму Сталіну ад беларускага народа», часопіс «Большэвік Беларусі» № 1, за 1949 г., стар. 7—8.

Такім чынам, праціўнік меў значныя перавагі для абароны. Нямецкія захопнікі, акупіраваўшы Прыбалтыку і Беларусь, яшчэ ў 1941 годзе прыступілі да пабудовы тут інжынерных умацаванняў. Асабліва разгарнуліся інжынерныя работы ў 1943 і ў пачатку 1944 гг. Рад гарадоў — Пскоў, Остраў, Себеж, Полацк, Віцебск, Орша, Магілёў, Бабруйск, Мінск, Даўгаўпілс, Вільнюс, Баранавічы, Пінск, Рыга, Каунас, Гродна, Беласток, Брэст і іншыя—падрыхтоўваўся ворагам як сістэма магутных умацаваных раёнаў. Гітлер і яго кліка зыходзілі з таго, што праз БССР і Літву пралягаў самы кароткі шлях у гняздо фашысцкай агрэсіі—Усходнюю Прусію. Значэнне Беларусі заключалася ў тым, што яна з'яўлялася звяном, якое звязвала германскія полчышчы на Украіне і ў Прыбалтыцы. Праз яе тэрыторыю праходзіла многа чыгуначных і грунтавых дарог, якія мелі буйнейшае аператыўна-стратэгічнае значэнне. Апрача таго, немцы марылі аб тым, каб, утрымаўшы Беларусь, разгарнуць адсюль новае наступленне на Маскву.

Вось чаму нямецкае камандаванне надавала сваім пазіцыям у Беларусі асабліва вялікае значэнне. Яно сканцэнтравала тут адборныя войскі. Больш мільёна гітлераўскіх салдат і афіцэраў, якія мелі вопыт баёў пад Масквой і на іншых франтах, знаходзілася на Беларускім фронце. Тут былі створаны і ўмацаваны магутныя, разгалінаваныя лініі абароны ворага. Гарады ператвараліся ў сапраўдныя крэпасці. У цэнтральнай частцы Беларусі яны былі апаясаны ўмацаваннямі, мелі моцную кругавую абарону. Камендант кожнага ўмацаванага раёна, па загаду Гітлера, даваў пісьмовае абавязацельства што-б там ні стала ўтрымліваць свае пазіцыі да апошняга нямецкага салдата і афіцэра. Ствараліся глыбокія траншэі і ходы зносін, якія апаясвалі ўскраіны і пранізвалі цэнтры гарадоў.

На аршанскім напрамку былі пабудаваны тры ўмацаваныя рубяжы, глыбінёю 15 — 20 *км*. Цэлы рад канцэнтрычных умацаваных ліній быў узведзен вакол Бабруйска. Праводзіліся работы па стварэнню абарончых рубяжоў па такіх рэках, як Друць, Беразіна і ў раёнах, якія ляжаць на захад ад іх. Дакладная сістэма інжынерных умацаванняў ворага дапаўнялася значнай колькасцю артылерыі і мінамётаў, якія мелі вялікую манеўранасць.

Нямецка-фашысцкае камандаванне надавала «беларускаму балкону» (так яно называла гэты плацдарм) велізарнае значэнне. Яго страта і прасоўванне Совецкай Арміі на гэтым участку немінуча вялі да поўнага разгрому германскага фрон-

та і пагражалі размешчаным у Прыбалтыцы нямецкім арміям. Немцы жорстка змагаліся за «беларускі балкон» і як за выгадны плацдарм для разгортвання новых наступальных дзеянняў супроць Совецкай Арміі. Сваёй лініі тут яны прысвоілі імя «фатэрлянд», г. зн. айчына.

Гітлераўскія галаварэзы былі ўзброены велізарнай колькасцю рознастайнейшай баявой тэхнікі. З паветра іх войскі прыкрывалі буйныя сілы авіяцыі. У сваіх загадах войскам Гітлер нязменна гаварыў, што здача гэтай умацаванай лініі Советам азначае «адкрыццё варот у Германію». Гітлераўскае камандаванне ўсімі сродкамі зацягвала барацьбу з тым, каб адтэрмінаваць поўны разгром нямецкіх узброеных сіл. У гэтым заключаўся стратэгічны план фашысцкага камандавання. Нават у генералаў была ўзята падпіска аб тым, што яны будуць да апошняй каплі крыві абараняць гэтыя рубяжы.

Ініцыятыва дзеянняў належала Совецкай Арміі. А валоданне ініцыятывай і выгаднае для нашых войск (ахопліваючае) палажэнне фронта ў Беларусі стварала спрыяльныя ўмовы для таго, каб нанесці сакрушальныя ўдары па ворагу ў агульным напрамку на Мінск. У той час, як совецкае камандаванне было свабодна ў выбары напрамкаў сваіх удараў, немцы вымушаны былі перайсці да абароны, рабілі стаўку на зацягванне вайны.

Совецкае камандаванне старанна падрыхтавалася да наступальнай аперацыі. Яно ўлічыла, што вораг займае загадзя падрыхтаваную, умацаваную і добра арганізаваную абарону ў Беларусі. На Віцебскім напрамку ў фашыстаў была 3-я танкавая армія, на Аршанскім і Магілеўскім — групіраваліся злучэнні 4-й гітлераўскай арміі, а Бабруйскі напрамак прыкрывала 9-я армія, якія разам складалі цэнтральную групу войск.

У чым заключаўся аператыўны замысел нашага камандавання па правядзенню наступлення ў Беларусі? Ён прадугледжваў ажыццяўленне каласальнай стратэгічнай аперацыі ва ўзаемадзеянні чатырох франтоў. Вырашана было на першым этапе наступлення радам сакрушальных удараў рассячы і ўзламаць абарону праціўніка адначасова ў шасці напрамках, акружыць і разграміць групіроўкі ворага на яго флангах—пад Віцебскам і Бабруйскам і прарваць фронт у цэнтры, г. зн. на Багушэўскім і Магілеўскім напрамках. Далей совецкія войскі, па замыслу нашага камандавання, павінны імкліва развіваць поспех, праследаваць праціўніка па ўсяму фронту (другі этап), акружыць 4-ю нямецка-фашысцкую армію і канчаткова зніш-

чыць яе. Што датычыць трэцяга этапа аперацыі, то галоўнай яго задачай было: неадступна праследаваць рэшткі разбітых варожых войск і канчаткова іх знішчыць; развіваючы поспех, праследуючы і знішчаючы ворага, ачысціць усю Беларусь, Літву і выйсці на Прускую граніцу Германіі—такі быў план Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Совецкай Арміі таварыша Сталіна.

Бітву за Беларусь, якая разгарнулася адначасова на велізарнай прасторы, вяло войска чатырох франтоў: 1-га Прыбалтыйскага пад камандаваннем генерала Баграмяна, 3-га Беларускага пад камандаваннем генерала Чэрняхоўскага, 2-га Беларускага пад камандаваннем генерала Захарава і 1-га Беларускага пад камандаваннем Маршала Совецкага Саюза Ракасоўскага, агульным працяжэннем па фронту да 600 *км.*

З раніцы 23 чэрвеня, пасля магутнай артылерыйскай і авіяцыйнай падрыхтоўкі, совецкія войскі сіламі трох франтоў перайшлі ў наступленне супроць нямецка-фашысцкіх войск. Пачалася гіганцкая бітва за Беларусь. Гэта былі незабыўныя дні для совецкіх людзей, дні, абвясціўшыя пачатак ўсесакрушальнага летняга наступлення Совецкай Арміі 1944 года.

Гэтае наступленне Совецкая Армія пачала і вяла ў іншых умовах, якія адрозніваліся яго ад папярэдніх кампаній. На палях гэтай бітвы безраздзельна панавала воля совецкага Вярхоўнага Галоўнакамандавання, ініцыятыва Совецкай Арміі. Ніякія ўмацаваныя раёны і гарады, ніякія рэкі і балоты не маглі спыніць сакрушальных удараў совецкіх войск. Магутныя ўмацаваныя лініі прарываліся, а ўмацаваныя гарады абыходзіліся і акружаліся. Акружаныя гарнізоны праціўніка поўнасцю знішчаліся або капітуліравалі. У гэтым характэрныя асаблівасці ваеннага тэатра, на якім совецкія войскі вялі барацьбу за Беларусь. Гэта было ўсесакрушаючае наступленне велізарнай магутнасці, выключнага размаху і хуткасці. У ходзе бітвы за Беларусь вызначыліся тры этапы барацьбы.

На першым этапе совецкія войскі ажыццявілі прарыў галоўнага абараняльнага рубяжа ворага на ўсю яго аператыўную глыбіню на Віцебскім, Аршанскім, Магілеўскім і Бабруйскім напрамках. Галоўныя сілы 1-га Прыбалтыйскага, 3-га і 2-га Беларускіх франтоў перайшлі ў наступленне на гэтых напрамках. На наступны дзень, 24 чэрвеня, пачаў наступаць 1-ы Беларускі фронт на Бабруйскім напрамку. Імклівым ахопліваючым рухам ударных рухомых груп—механізаваных, матарызаваных і кавалерыйскіх—Совецкая Армія ламала жорсткае

супраціўленне ворага. Савецкія войскі перарэзвалі камунікацыі цэнтральнай групы арміі немцаў.

Барацьба за Віцебск адыграла велізарную ролю ў бітве за Беларусь. Віцебскі плацдарм быў адным з галоўных стратэгічных вузлоў абароны праціўніка. Ён звязваў цэнтральную групіроўку немцаў з яе паўночнай групіроўкай і прыкрываў іх шляхі ў Прыбалтыку. Немцы лічылі Віцебск «шчытом Прыбалтыкі». Таму яны чаго-б гэта ні каштавала імкнуліся ўтрымаць горад у сваіх руках.

Барацьба за разгром віцебскай групіроўкі варожых войск прадстаўляла сабой цяжкую задачу, выкананне якой было ўскладзена на войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў.

Перайшоўшы ў наступленне, ударная групіроўка 1-га Прыбалтыйскага фронта прарвала абарону немцаў на фронце ў 30 *км* у напрамку ад Сіроціна на Бешанковічы. За першы дзень яна прасунулася на 7 — 16 *км*, за другі — на 15—20 *км*, расшырыўшы прарыў да 90 *км*. Затым, расшыраючы прарыў і прасоўваючыся ўперад, яна прарвала Віцебскі абвод абароны і ў ноч на 25 чэрвеня вышла ў раён Гняздзілавічы.

У той-жа час войскі 3-га Беларускага фронта, развіваючы наступленне на Багушэўскім напрамку, прарвалі абарону, разбілі нямецкія часці і прасунуліся на 10—12 *км*. Савецкая авіяцыя актыўна падтрымлівала наступаючыя войскі. Яна панавала над полем бою. На наступны дзень совецкія войскі прасунуліся на Багушэўскім напрамку і паўночней Оршы яшчэ на 10—14 *км*. К захаду ад Віцебска ў ноч на 25 чэрвеня яны злучыліся з часцямі 1-га Прыбалтыйскага фронта. Кальцо акружэння вакол нямецкай групіроўкі Віцебска было замкнута, ахапіўшы 5 фашысцкіх дывізій 3-й танкавай арміі. Групіроўка была расколата на дзве часткі і на працягу двух дзён (26—27 чэрвеня) поўнасцю разгромлена.

Авалодаўшы Віцебскам—важным стратэгічным вузлом абароны немцаў на заходнім напрамку і буйным абласным цэнтрам рэспублікі, совецкія войскі 3-га Беларускага фронта мелі магчымасць паспяхова развіваць наступленне далей, на захад, да ракі Беразіны, а ад Беразіны—на Мінск.

У той час, калі пад Віцебскам завяршалася ліквідацыя акружаных нямецкіх дывізій, на другім участку фронта разгарнулася барацьба за горад Оршу — аператыўна важны чыгуначны вузел, які быў ператворан ворагам у магутны ба-

стыён і прыкрываў Мінскі напрамак у паласе аўтастрады і чыгуначнай дарогі Масква — Мінск. Тут немцы ўжо 7 месяцаў будавалі свае ўмацаванні. Флангі іх абараняльных рубяжоў упіраліся ў абшырныя ўчасткі цяжка праходзімых балот, размешчаных на поўнач і поўдзень ад Мінскай аўтастрады. Сам горад Орша апаясваўся магутным абводам з двух-трох ліній траншэй, умацаваных дотамі і дзотамі. Каменныя будынкі горада былі прыстасаваны ворагам пад агнявыя кропкі. Горад абаранялі 26-я, 57-я пяхотныя, 78-я штурмавая і 25-я матарызаваная дывізіі 27-га армейскага корпуса, Мінскую аўтастраду прыкрывала 78-я штурмавая дывізія.

Хутка прасоўваючыся ўперад, войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта зайшлі ў заходнім і паўночна-заходнім напрамках на Полацк, Камень і Лепель, а 3-га Беларускага—наступалі на захад і паўднёвы захад, абыходзячы Оршу з поўначы. Наша камандаванне аперыравала танкавымі, механізаванымі і кавалерыйскімі злучэннямі, якія былі ўведзены ў прарыў на Багушэўскім напрамку і паўночней Оршы. Яны імкліва развівалі і паглыблялі гэты прарыў, дзейнічаючы ўперадзе наступаўшых пяхотных армій.

Войскі генерала Галіцкага ў жорсткіх баях авалодалі ўсім першым рубяжом варожай абароны паўночней Мінскай аўтастрады, а месцамі ўклініліся і ў другі рубеж. Затым яны расшырылі фронт прарыву да 15 *км* і прасунуліся далёка ў глыбіню. Гэта быў абыходны манеўр.

Разумеючы сур'ёзнасць такога становішча, нямецкае камандаванне кінула ў бой усе войскі на гэтым участку і прадпрымала па 6—8 контратак у дзень. Але нішто не магло спыніць імклівы рух доблесных совецкіх воінаў.

26 чэрвеня совецкія танкавыя злучэнні вырваліся далёка на захад, перарэзаўшы чыгунку Орша—Лепель, рад грунтавых дарог, якія ідуць ад Оршы на паўночны захад. Яны нанеслі ўдар на Талочын, які ляжыць у 48 *км* заходней Оршы. Становішча аршанскай групіроўкі пагоршылася. Совецкія танкавыя злучэнні перарэзалі чыгунку і аўтастраду паміж Оршай і Барысавам, перагарадзіўшы шляхі адыходу немцам з Оршы на захад. У ноч з 26 на 27 чэрвеня часці войск генерала Галіцкага падышлі да Оршы з поўначы, паўночнага захаду і ўсходу, завязаўшы вулічныя баі ў горадзе. Нямецкі гарнізон быў разбіты. 27 чэрвеня Орша поўнасцю была вызвалена ад ворага.

Страціўшы Оршу, немцы страцілі важны для іх апорны пункт, які прыкрываў подступы да цэнтральных раёнаў Бела-

русі і да Мінска. Войскі 3-га Беларускага фронта, нанёсшы паражэнне аршанскай групіроўцы, імкнуліся да р. Беразіна, каб фарсіраваць раку каля Барысава і на поўнач ад яго. Пад ударамі нашых войск варожыя дывізіі адкатваліся да Беразіны, трацячы па шляху людзей і тэхніку. Нашы войскі мелі магчымасць хутка праследаваць ворага ўдоўж Мінскай аўтастрады, паралельна шляхам адыходу.

За 5 дзён наступаўшыя совецкія часці прасунуліся на 115 *км*, расшырыўшы прарыў фронта да 150 *км*. Імі былі разбіты і ліквідаваны 4 пяхотныя дывізіі ворага, апрача тых, якія знішчаны пад Віцебскам. Буйныя страты панеслі таксама яшчэ 3 нямецкія дывізіі. На поўнач ад Барысава немцы адыходзілі за Беразіну, спадзеючыся затрымаць совецкія войскі на водным рубяжы.

Што датычыць аўтастрады Орша — Мінск, то тут вораг прадаўжаў аказваць супраціўленне на ўсход ад Беразіны. Ён імкнуўся забяспечыць фланг і прыкрыць адыход Магілеўскай групіроўкі, якая знаходзілася ў раёне дзеянняў войск 2-га Беларускага фронта. Але замыслы ворага былі сарваны. Совецкія войскі 2-га Беларускага фронта яшчэ 23 чэрвеня нанеслі немцам моцны ўдар на Магілеўскім напрамку. 26 чэрвеня нашы войскі вышлі да р. Днепр і на працягу двух дзён фарсіравалі яе; дзейнічаючы рашуча і ўмела, яны адрэзалі немцам шляхі адыходу з Магілева. Совецкія войскі вышлі на паўночны захад ад Магілева, потым перахапілі дарогі, якія вялі на захад. Заставаўся толькі невялікі карыдор на паўднёвы захад ад горада, аднак і ён быў у хуткім часе закрыты. 27 чэрвеня войскі гэтага фронта пайшлі на штурм горада. У выніку баёў, якія прадаўжаліся суткі, немцы пацярпелі канчатковае паражэнне. Іх спробы прабіцца на захад і паўднёвы захад былі сарваны. Рэшткі варожай групіроўкі ў Магілеве спынілі сваё супраціўленне і здаліся ў палон.

Такім чынам, на працягу двух дзён совецкія войскі 2-га Беларускага фронта фарсіравалі Днепр на працягу звыш 120 *км*, занялі Магілеў і, разгарнуўшы наступленне па заходняму берагу Дняпра, прыкавалі да сябе галоўныя сілы 4-й гітлераўскай арміі, што садзейнічала яе далейшаму акружэнню і разгрому.

Адначасова з віцебскімі, аршанскімі і магілеўскімі баямі разгарнулася бітва за горад Бабруйск. Войскі 1-га Беларускага фронта перайшлі ў наступленне раніцай 24 чэрвеня пасля моцнай артылерыйскай падрыхтоўкі. Наносячы два ўдары—

адзін ад Рагачова, другі з раёна Парычы, Азарычы, — яны прарвалі абарону праціўніка і нанеслі яму вялікія страты.

Немцы на подступах да Бабруйска стварылі магутную абарону і сканцэнтравалі значныя сілы. Гітлераўцы разумелі, што паспяховае наступленне совецкіх войск на гэтым напрамку можа вывесці іх на шлях Мінск—Баранавічы і далей — да Брэста. Для абароны Бабруйскага напрамку нямецкае камандаванне вылучыла 12 пяхотных і адну танкавую дывізіі 9-й арміі, размешчаных у выглядзе 5 суцэльных абараняльных палос, якія прасціраліся на глыбіню звыш 100 *км*.

Сканцэнтраваўшы дзве ўдарныя групіроўкі, Совецкае камандаванне рашыла прарваць абарону ворага на поўнач ад Рагачова і на захад ад Жлобіна. Было вырашана: развіваючы імклівае наступленне, акружыць і знішчыць усю бабруйскую групіроўку праціўніка.

Напярэдадні наступлення была праведзена авіяцыйная і артылерыйская падрыхтоўка, пасля чаго на ворага ўсёй сілай абрушыліся совецкія пяхотныя часці і танкі. 25 чэрвеня прадаўжаліся ўпорныя баі на Рагачоўскім напрамку. Разгортваючы прарыў на захад ад р. Беразіна, наша пяхота заняла паласу мясцовасці ад р. Беразіна да Глуска. На подступы да Бабруйска з поўдня вырваліся танкавыя часці, якія, абышоўшы горад з захаду, вышлі да Беразіны паўночней Бабруйска. Шляхі адыходу немцаў на захад былі адрэзаны; буйная групіроўка іх аказалася прыціснутай да Беразіны.

На паўднёвы захад ад Жлобіна наступалі злучэнні генералаў Лучынскага і Батава. 24 чэрвеня яны прарвалі абарону ворага і паслядоўна авалодалі 5-ю радамі траншэй праціўніка. У прарыў рынуліся танкі генерала Панава. На наступны дзень у глыб нямецкага размяшчэння была рушана конніца і механізаваныя часці генерала Пліева, якія перарэзалі ўсе камунікацыі немцаў, што ідуць да Бабруйска з поўдня і паўднёвага захаду. Прадпрынятыя немцамі контратакі на радзе ўчасткаў былі адбіты совецкімі войскамі з вялікімі для ворага стратамі. Танкавае злучэнне генерала Панава зрабіла абыход Бабруйска з захаду.

У кальцы акружэння совецкіх войск аказаліся пяць нямецкіх дывізій у саставе 25-га і 41-га танкавых карпусоў 9-й арміі. Ажыццяўленне задачы разгрому акружанай варожай групіроўкі было ўскладзена на злучэнні генерала Раманенка і частку сіл генерала Батава.

Рашучымі дзеяннямі наступаючых совецкіх войск нямецкая групіроўка была расчленена на дзве часткі: адна з іх была

моцна прыціснута да Беразіны на паўднёвы ўсход ад Бабруйска, другая акружана непасрэдна ў Бабруйску. Магутны ўдар совецкай пяхоты і танкаў рашыў лёс варожай групіроўкі. Горад Бабруйск быў ачышчан ад варожых салдат і афіцэраў.

У выніку дзеянняў узброеных сіл чатырох узаемадзеючых франтоў на першым этапе наступлення былі акружаны і разгромлены віцебская і бабруйская групіроўкі варожых войск і прарваны фронт нямецкай абароны на Багушэўскім, Аршанскім і Магілёўскім напрамках. Разгромлены раптоўнымі ўдарамі і прарывамі на абодвух флангах і ў цэнтры, фронт праціўніка быў разарваны на часці, якія страцілі ўзаемадзеянне.

Совецкія войскі—перш за ўсё 3-га і 1-га Беларускіх франтоў—заваявалі магчымасць паспяхова і хутка прасоўвацца ўперад. Толькі за 6 дзён нашага наступлення совецкія войскі прайшлі 130—150 *км,* а іх перадавыя часці рушылі яшчэ далей.

Пачаўся новы, другі этап наступлення совецкіх войск у Беларусі. Асноўная задача гэтай аперацыі, якая пачалася з 29 чэрвеня, заключалася ў тым, каб імкліва і рашуча праследаваць праціўніка на флангах, граміць яго і не даць магчымасці 4-й нямецкай арміі, якая дзейнічала ў цэнтры, пазбегнуць разгрому. Яшчэ завяршаўся разгром віцебскай і бабруйскай групіровак праціўніка, а асноўныя сілы нашых войск рухаліся ў паўночна-заходнім, заходнім і паўднёва-заходнім напрамках, праследуючы ворага.

Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта, заходзячы сваім левым крылом, наступалі на Полацк і Глыбокае. Немцы ацэньвалі значэнне гэтага ўчастка фронта і падцягнулі сюды новыя дывізіі і рад тылавых сваіх часцей. Аднак перакінутыя часці ўводзіліся ў бой праціўнікам з ходу і неслі велізарныя страты. Немцы не дасягалі патрэбных вынікаў.

30 чэрвеня наступаючыя совецкія войскі завязалі баі на подступах да Полацка. Тут гітлераўцы стварылі магутныя лініі абараняльных умацаванняў, эшаланіраваных на глыбіню да 15 *км*. Азёры і рэкі з'яўляліся дапаўненнем гэтых умацаванняў, якія іменаваліся немцамі лініяй «Тыгр».

Скандэнтраваўшы тут значныя сілы і вялікую колькасць артылерыйскіх сродкаў, нямецкае камандаванне рабіла ўсё, каб утрымаць гэты рубеж. Іх войскі аказвалі жорсткае супраціўленне. Але паспяховае наступленне войск 1-га Прыбалтыйскага фронта сарвала ўсе планы немцаў. Магутным ударам з паўднёвага ўсходу совецкія часці прарвалі абарону ворага; развіваючы сваё наступленне ў паўднёва-заходнім напрамку,

яны хутка фарсіравалі раку Зах. Дзвіна і пачалі ахоп Полацка з поўдня. Другія часці і злучэнні, зрабіўшы майстэрскі манеўр з паўночнага захаду, вышлі да горада Дзісна, размешчанага ў 35 *км* на паўночны захад ад Полацка. Такім чынам быў давершан ахоп Полацка і лёс варожай групіроўкі быў прадвырашан.

Совецкія часці ўварваліся ў Полацк з поўдня і паўночнага ўсходу. У горадзе разгарнуліся жорсткія вулічныя баі, якія завяршыліся поўнай перамогай совецкіх войск. 4 ліпеня Полацк быў узят і ачышчан ад гітлераўцаў.

Ажыццёўленая ў раёне Полацка аперацыя нашых войск мела буйнае аператыўнае значэнне. Праз Полацк пралягае шлях у глыб Літвы і Латвіі. Войскі 1-га Прыбалтыйскага фронта, выходзячы да Рыжскага заліва, разрывалі ўсю прыбалтыйскую групіроўку ворага. У сувязі з гэтай аперацыяй траціла сваё значэнне абарона немцаў на такім важным водным рубяжы, як Зах. Дзвіна.

Злучэнні 3-га Беларускага фронта, праследуючы разбітыя нямецкія часці ў напрамку на возера Палік і г. Барысаў, занялі важныя плацдармы на заходнім беразе Беразіны. Сюды выходзілі галоўныя сілы фронта, паспяховаму прасоўванню якіх садзейнічалі беларускія партызаны. Партызаны ведалі і ўказвалі зручныя шляхі праз лясныя масівы і балоты, яны ахоўвалі пераправы, а ў патрэбны момант — забяспечвалі флангі совецкіх войск. З дапамогаю партызан совецкія войскі скрытна і хутка вышлі да р. Беразіна, з ходу фарсіравалі яе і паявіліся там, дзе праціўнік не чакаў іх — у тылу ворага.

Совецкая авіяцыя ў час наступлення нашых войск прыкрывала пераправы галоўных сіл праз водныя рубяжы і наносіла сакрушальныя ўдары па войсках і тэхніцы ворага. Былі дні, калі наша авіяцыя рабіла 2 тыс. і больш самалётавылетаў. 30 чэрвеня і 1 ліпеня нашы войскі фарсіравалі Беразіну на шырокім фронце працягам 110 *км* і авалодалі Барысавам. Гэта быў важны апорны пункт варожай абароны, які прыкрываў подступы да Мінска. Раніцай 1 ліпеня Барысаў у выніку жорсткіх вулічных баёў быў поўнасцю вызвален нашымі войскамі.

Далейшае прасоўванне войск 1-га і 3-га Беларускіх франтоў развівалася паспяхова. Пад моцнымі ўдарамі совецкіх танкаў, конніцы, пяхоты, артылерыі і авіяцыі тылавы рубеж ворага на важнейшых напрамках быў прарваны. Тэмпы нашага наступлення нарасталі.

Войскі 3-га Беларускага фронта, пераадольваючы лясіста-

балоцістую даліну ракі Беразіны ў яе вярхоўях, разгарнулі імклівае наступленне ў двух напрамках. Правае крыло войск хутка прасоўвалася ў напрамках возера Нарач, гарадоў Вілейка і Маладзечна, а левае крыло — на Мінск. Нашы войскі абыходзілі сустракаемыя імі апорныя пункты і вузлы супраціўлення ворага і нечакана для яго аказваліся ў глыбокім яго тылу. Упераджае нашых войск ішла конніца і танкі, якія не звязвалі сябе лабавымі атакамі. Толькі калі да апорных пунктаў падыходзіла пяхота, яна завяршала разгром варожых гарнізонаў.

Танкі і матарызаваная пяхота генерала Обухова, праішоўшы за 2 дні 130 *км*, перасеклі ўсю паўночную частку Мінскай вобласці і 2 ліпеня аказаліся ўжо на подступах горада Вілейкі. Немцаў не выратавала іх супроцьтанкавая абарона на ўскраінах горада. Штурмавыя атрады, пасаджаныя на совецкія танкі, уварваліся ў Вілейку. Сюды-ж уклініліся на машынах і совецкія мінамётчыкі і дэсантнікі-аўтаматчыкі. Праяўляючы доблесць і майстэрства, совецкія часці 2 ліпеня авалодалі горадам Вілейка.

Другі совецкі атрад з боем авалодаў горадам і станцыяй Краснае (50 *км* на паўночны захад ад Мінска), якія прыкрывалі магістраль Мінск — Вільнюс. Конныя злучэнні тым часам вялі баі за Маладзечна. Для дзеючай у раёне Мінска нямецкай групіроўкі стварылася пагроза ахопу і абыходу з паўночнага захаду.

Добрая была абстаноўка для совецкіх войск і на шляхах да Мінска з поўдня. У тыя дні, калі ліквідаваліся рэшткі варожых дывізій 9-й нямецкай арміі пад Бабруйскам, войскі 1-га Беларускага фронта прадаўжалі рухацца ў паўночна-заходнім і заходнім напрамках, скарыстоўваючы свабоду манеўра, якую яны атрымалі ў выніку перамогі пад Бабруйскам. Пры гэтым адна частка сіл накіроўвалася на Мінск, а другая з конна-механізаванай групай на чале — у бок Слуцка.

Нямецкія захопнікі прыкладалі ўсе намаганні, каб спыніць наступленне доблесных совецкіх войск у напрамку Слуцка. Падцягнуўшы свае рэзервы, вораг двойчы прадпрымаў контратаку на подступах к гораду. Совецкія войскі змянілі напрамак удару і ўмелым манеўрам вышлі паўночней горада. Шасе Мінск — Слуцк было перарэзана. Тым часам другія нашы часці абышлі горад з поўдня. Ужо 30 чэрвеня ў выніку смелага манеўра і ўдараў конніцы з поўначы і поўдня, а таксама з усходу Слуцк быў заняты нашымі войскамі.

Войскі 1-га Беларускага фронта ў гэты-ж дзень вызвалілі больш 200 іншых населеных пунктаў.

Авалодаўшы Слуцкам, совецкія войскі імкліва прасоўваліся на захад і паўночны захад. Следам за танкамі і конніцай, фарсіраванымі маршамі ішлі асноўныя сілы армій 1-га Беларускага фронта. Яны паспяхова пераадольвалі лясныя зараснікі і балоты, не зніжаючы тэмпаў наступлення. На працягу двух дзён яны прайшлі 80 *км* і вышлі на паўднёвы захад ад Мінска. Тут рухомыя злучэнні генерала Пліева 2 ліпеня нанеслі магутны ўдар па гарадах Стоўбцы, Гарадзея і Несвіж. Гэта былі важныя вузлы камунікацыі ворага на паўднёвы захад ад Мінска. Шляхі зносін мінскай групіроўкі немцаў на Баранавічы, Брэст і Лунінец аказаліся перарэзанымі.

Такім чынам, буйная нямецкая групіроўка, якая знаходзілася на ўсход ад Мінска і ўключала асноўныя сілы 4-й арміі і некаторыя дывізіі 9-й нямецкай арміі, была ізалявана ад сваіх баз і тылоў і аказалася пад пагрозай акружэння. Мінск яшчэ не быў заняты совецкімі войскамі і нямецкае камандаванне валодала некаторымі шляхамі, ідучымі на захад ад яго. Але адступленне ў заходнім напрамку было не зусім выгадна для ворага па мясцовых умовах — яно павінна было ісці праз лясіста-балоцістую Налібоцкую пушчу. Аднак праз дзень і гэты напрамак быў перарэзан совецкімі войскамі.

Галоўныя сілы 4-й нямецкай арміі, адкінутыя з лініі Дняпра, адышлі на раку Друць і там спрабавалі аказаць супраціўленне нашым войскам. Але немцы пралічыліся. 29 — 30 чэрвеня іх войскі былі адкінуты адсюль сіламі 2-га Беларускага фронта, якія ўклініліся на розных участках паміж адступаючымі калонамі немцаў і грамілі іх па частках. Адыходзячы па восі Магілеў — м. Беразіно — Мінск, нямецкая армія трапіла ў цяжкое становішча: яна не змагла затрымацца на прамежкавых рубяжах. Наступаўшыя совецкія войскі 3-га і 1-га Беларускіх франтоў з абодвух флангаў абыходзілі нямецкія злучэнні, якія з фронта падвяргаліся рашучым атакам часцей 2-га Беларускага фронта. Скоўваючы сілы немцаў, нашы часці ўкліньваліся паміж злучэннямі ворага, драбілі іх фронт на часткі, перараэалі шляхі адыходу, знішчалі жывую сілу і тэхніку немцаў. Гэта дазволіла нарушыць кіраванне нямецкімі войскамі; іх часці і злучэнні пераблыталіся, паніка сярод гітлераўскіх войск узмацнялася.

Праследуючы адыходзячага ворага, нашы танкісты нанеслі моцны франтальны ўдар па нямецкаму заслону, які перагароджваў шлях наступаючым. Нашы войскі з раду на-

прамкаў рваліся да Мінска. Велізарную дапамогу нашым часцям на гэтым напрамку, як і на іншых участках фронта, аказвалі паўсямесна беларускія партызаны і партызанкі, узначальваемыя комуністамі. Набліжэнне да сталіцы рэспублікі ўдзесяцярала сілы совецкіх воінаў і партызан, натхнёных імкненнем хутчэй вызваліць яе і выратаваць ад канчатковага разбурэння і разграблення ворагам.

Першымі падышлі да ўскраін горада слаўныя танкісты гвардыі палкоўніка Булыгіна. У немцаў ля Мінска была асабліва магутная абарона. Прадпрыняўшы абыходны манеўр, совецкія танкісты нечакана для ворага ў 2 гадзіны ночы на 3 ліпеня ўварваліся ў беларускую сталіцу. Праціўнік выставіў насустрач совецкім танкам свае самаходныя гарматы, але нашы танкісты знішчылі іх. Танкавы экіпаж гвардыі ст. лейтэнанта Сніткова некалькімі выстраламі падбіў непрыяцельскую гармату, а экіпаж гвардыі лейтэнанта Шыла знішчыў другую гармату; некалькі варожых самаходаў знішчылі танкісты гвардыі маёра Краснажон. Нашы танкі ўварваліся на Совецкую вуліцу сталіцы. Варожая артылерыя была падаўлена.

Праціўнік прадаўжаў ярасна супраціўляцца. Падтрыманыя «тыграмі», нямецкія пяхотныя часці прадпрымалі контратаку за контратакай, але яны знішчаліся і змяталіся агнём гвардзейцаў-танкістаў.

Тым часам танкавыя злучэнні Маршала бронетанкавых войск Ратмістрава авалодалі Лагойскам, што ў 35 *км* на паўночны захад ад Мінска. Такім чынам, быў перарэзан апошні з шляхоў адыходу немцаў. Імкліва дзейнічаўшыя танкавыя часці праніклі ў горад з паўднёвага ўсходу. Пяхота таксама ўварвалася ў Мінск з паўднёва-ўсходняга і ўсходняга боку. Разгарнуліся жорсткія вулічныя баі ў Мінску.

Тысячы каменных будынкаў гітлераўцы прыстасавалі да доўгачасовай абароны. Але ніякія збудаванні абароны ворага не маглі яго выратаваць. Танкі і мотапяхота, узламаўшы абарону праціўніка на ўскраінах, прасоўваліся да цэнтра горада, затым рухаліся па некалькіх вуліцах адначасова, рассякаючы нямецкую групіроўку на ізаляваныя часткі. Прымяняючы аўтаматны агонь і гранаты, нашы байцы, якія наступалі за механізаванымі часцямі, абыходзілі нямецкія апорныя пункты і пры падтрыманні танкаў грамілі і знішчалі іх з тылу. Ужо к 7 гадзінам раніцы 3 ліпеня вораг быў выбіт з усходняй часткі Мінска. У той-жа дзень сталіца Беларусі—Мінск, важнейшы стратэгічны вузел абароны немцаў на заходнім на-

прамку, была поўнасцю ачышчана ад ворага. Совецкія войскі фарсіравалі раку Свіслач. Над Мінскам зноў быў узняты пабедны чырвоны сцяг.

* * *

Войскі 1-га Беларускага фронта, якія дзейнічалі ад Свіслач — Асіповічы ў напрамку на Мінск, сустрэлі моцнае супраціўленне немцаў на радзе прамежкавых рубяжоў. Дзеянням танкаў перашкаджаў лясіста-балоцісты характар гэтай мясцовасці. Паміж Пухавічамі і Асіповічамі — на рубеж р. Свіслач — праціўнік выставіў сваю 12-ю танкавую дывізію, якую падтрымлівала пяхота. Вораг прабаваў перагарадзіць шлях совецкім войскам у напрамку шасе Асіповічы — Пухавічы — Мінск. Тут разгарнуліся ўпорныя баі, якія цягнуліся два дні і ў выніку якіх нямецкія войскі былі разбіты.

У той-жа час адно з танкавых злучэнняў зрабіла абыходны манеўр і вышла на шасе Слуцк—Мінск на захад ад Шацка. Пераадольваючы ўпорнае супраціўленне немцаў, яно прасоўвалася на поўнач. На напрамку Пухавічы — Мінск 2 ліпеня совецкія войскі занялі Пухавічы і прадаўжалі рухацца ў бок Мінска. Удзень 3 ліпеня танкавыя злучэнні 1-га Беларускага фронта вышлі да паўднёвай ускраіны горада. Сюды яшчэ раніцой уварваліся войскі 3-га Беларускага фронта, падыходзілі вялікія сілы пяхоты.

Такім чынам, падаўляючы супраціўленне ворага, нашы войскі хутка падышлі да Мінска. Кальцо акружэння, замкнутае пад Мінскам у пачатку танкавымі злучэннямі, было замацована падыходзіўшымі сюды стралковымі злучэннямі.

Пакінуўшы частку сваіх сіл пад Мінскам для ліквідацыі акружанай групіроўкі, совецкія войскі прадаўжалі развіваць пабеданоснае наступленне на захад, атрымліваючы вялікія поспехі. Так, войскі 3-га Беларускага фронта за адзін дзень 3 ліпеня прасунуліся на 30 *км* і занялі звыш 450 населеных пунктаў, а войскі 1-га Беларускага фронта, якія наступалі ў Баранавіцкім напрамку, таксама з баямі занялі 250 населеных пунктаў.

На ўсход ад Мінска, у асаблівасці ў раёне Волма—Пекалін і далей да Беразіны, на вялікай тэрыторыі аказаліся адрэзанымі нямецкія злучэнні 4-й арміі, а таксама тыя рэшткі варожых злучэнняў 3-й танкавай і 9-й армій, якія былі разгромлены пад Віцебскам і Бабруйскам. Колькасць акружаных варожых войск дасягала 100 тыс. чалавек. Тут яны не прадстаўлялі ўжо арганізаванага фронта. Рэшткі разбітых дывізій

спрабавалі выйсці з акружэння. Але вырвацца з замкнутага кальца акружэння было немагчыма. Нямецкія дывізіі аказаліся ў катле.

Укліньваючыся паміж варожымі групамі войск, нашы часці перашкаджалі іх аб'яднанню і знішчалі іх пры актыўным падтрыманні нашай авіяцыі і беларускіх партызан.

Але Гітлер усё яшчэ спадзяваўся «аднавіць становішча». Ён па радыё звярнуўся да камандавання нямецкіх войск, якія знаходзіліся ў мінскім «катле», з асобым загадам. У гэтым загадзе Гітлер прапанаваў аднавіць дысцыпліну і ўсімі сродкамі прабівацца ў паўднёва-заходнім напрамку, выходзіць з акружэння совецкіх войск. Але нішто ўжо не магло аднавіць становішча дэмаралізаваных і абяскроўленых нямецка-фашысцкіх войск.

Ліквідацыя мінскай групіроўкі нанесла ворагу велізарныя страты. Нашым войскам дасталася багатыя трафеі. У ліку палонных знаходзіліся 12 нямецкіх генералаў, 3 камандзіры корпуса і 9 камандзіраў дывізій. 4-я нямецкая армія перастала існаваць: у далейшым ні адна яе дывізія не змагла ўжо ўдзельнічаць у баях.

Акружэнне і разгром цэнтральнай групіроўкі варожых войск пад Мінскам было ажыццёўлена на працягу тыдня ў ходзе хутка развіваючайся аперацыі, на вялікай глыбіні — каля 200 *км* ад зыходнага становішча, якое займалі нашы наступаючыя войскі к пачатку беларускай аперацыі. Ажыццяўляючы гэтую аперацыю, флангавыя злучэнні 3-га Беларускага і 1-га Беларускага франтоў усё больш выігрывалі перавагу ў сваім аператыўным становішчы. У той час, калі нямецкія войскі, адступаючы праз бярэзінскае Палессе, прайшлі каля 100 *км* (з 29 чэрвеня па 3 ліпеня), совецкія флангавыя злучэнні прасунуліся на 150 *км* і больш. Такім чынам нашы войскі значна апярэдзілі свайго праціўніка, вышлі на яго камунікацыі і дзякуючы гэтаму замкнулі кальцо акружэння пад Мінскам у намечаны час. Гэта быў бліскуча ажыццёўлены манеўр, поспеху якога садзейнічалі добра арганізаваны тыл совецкіх наступаўшых армій, бяспрыкладны гераізм і мужнасць слаўных беларускіх партызан.

Праведзеныя ў раёнах Віцебска, Бабруйска і ўсходней Мінска аперацыі на акружэнне, у выніку якіх ліквідавана да 40 нямецкіх дывізій, увойдуць у гісторыю як выдатныя дасягненні ваеннага майстэрства. Гэтыя аперацыі сведчаць аб выдатнасці совецкіх генералаў і афіцэраў, выхаваных ге-

ніяльным палкаводцам таварышам Сталіным, аб несакрушальнай магутнасці Совецкай Арміі.

Бліскучая ліквідацыя трох буйных групіровак ворага стварыла вельмі спрыяючую абстаноўку для далейшага наступлення совецкіх войск. Немцы неслі велізарныя страты ў жывой сіле і ваеннай тэхніцы. У іх фронце была прабіта брэш шырынёй звыш 400 *км*. Яны спешна перакідвалі з другіх напрамкаў і франтоў усё новыя і новыя злучэнні і арміі з мэтай спыніць наступленне совецкіх войск.

Пачаўся трэці этап барацьбы за Беларусь. Праследаваць разбітага ворага і паспяхова весці барацьбу з яго падыходзіўшымі з глыбіні рэзервамі, якія спрабавалі аднавіць нанава свой абараняльны фронт на рубяжы Даўгаўпілс, Вільнюс, Ліда, Баранавічы, р. Шара, Лунінец, — такая была задача совецкіх войск на гэтым этапе наступальнай аперацыі.

Праследуючы нямецка-фашысцкіх захопнікаў, разбітых у раёне Мінска і Вілейкі, совецкія войскі 5 ліпеня занялі горад Маладзечна — буйны чыгуначны вузел і важны апорны пункт абароны ворага, які прыкрываў шляхі на Вільнюс і Ліду. Немцы спрабавалі затрымаць совецкія войскі на рубяжы ракі Вілія. Совецкія часці фарсіравалі раку на паўночны захад ад Смаргоні і з баямі вышлі на фланг нямецкай групіроўкі. Войскі 3-га Беларускага фронта, заняўшы Маладзечна і Смаргонь, разгарнулі наступленне ў двух напрамках: правае крыло фронта і большая частка танкавых злучэнняў рухаліся да сталіцы Совецкай Літвы — Вільнюса, а левае накіроўвалася на горад Ліду. Наступленне развівалася паспяхова. Механізаваныя часці Героя Совецкага Саюза генерала Обухова і рухомыя атрады войск генерала Крылова пераступілі граніцу Літоўскай Совецкай Рэспублікі. Нашы войскі вышлі да ўсходніх ускраін Вільнюса і пачалі абыходзіць горад з поўдня і з паўночнага ўсходу. Гітлераўскае камандаванне, ператварыўшы горад у крэпасць, прыкладала ўсе намаганні, каб утрымаць яго ў сваіх руках. У адным з загадаў па дывізіі, якая была перакінута праціўнікам з-пад Нарвы на гэты ўчастак фронта, было сказана: «Размах наступлення рускіх, прарваўшых абарону на рубяжы Віцебск — Орша — Магілеў, прымае катастрафічны характар. На Вашу дывізію ўскладаецца задача спыніць імклівае прасоўванне рускіх войск». Але ў немцаў не знайшлося ўжо такіх сіл, каб ажыццявіць гэты загад.

Ужо на наступны дзень, 8 ліпеня, групіроўка немцаў у Вільнюсе была акружана. Пры садзеянні авіяцыі, якая

ўзаемадзейнічала з наземнымі войскамі, нашы войскі расстроілі і падавілі агнявую сістэму ворага. У Вільнюсе разгарэліся вулічныя баі. У выніку пяцідзённых упорных баёў совецкія войскі цалкам знішчылі нямецкі гарнізон. 13 ліпеня сталіца Літвы была вызвалена ад ворага. Развіваючы сваё наступленне, войскі правага крыла 3-га Беларускага фронта ў той-жа дзень вызвалілі з баямі больш 250 населеных пунктаў.

Паспяхова развіваліся баявыя дзеянні нашых войск і на левым крыле фронта. Праследуючы ворага, яны ўмелым манеўрам конніцы, танкаў і пяхоты авалодалі горадам Ліда — важным апорным пунктам абароны немцаў на Гродненскім напрамку. Такім чынам увесь фронт атрымаў спрыяльныя ўмовы для больш хуткага прасоўвання на захад.

Прадаўжаючы сваё наступленне, нашы войскі 13 ліпеня вышлі да р. Нёман. Фарсіраваўшы яе на шырокім фронце, яны к 15 ліпеня занялі плацдармы на заходнім беразе — паўночней і паўднёвей Алітус, ля Мерач, на поўдзень ад Друскенікі. За кароткі перыяд войскі 3-га Беларускага фронта прасунуліся на захад да 200 *км*. Праціўнік панёс велізарныя страты.

Войскі 2-га Беларускага фронта ў сваім імклівым наступленні прасоўваліся ў напрамку на Навагрудак і затым на Гродна і Валкавыск. Перад узяццем Валкавыска адбываліся баі па авалоданню важнымі апорнымі пунктамі абароны немцаў на гэтым напрамку — гарадамі Навагрудак і Дзятлава. 9 ліпеня немцы былі выбіты з гэтых гарадоў і адкінуты на захад. За гэты-ж дзень войскі 2-га Беларускага фронта занялі з баямі звыш 150 населеных пунктаў. 13 ліпеня яны падышлі да Валкавыска. За час з 5 па 15 ліпеня войскі гэтага фронта прасунуліся з баямі каля 250 *км* і вышлі на лінію Гродна — Валкавыск. Заняўшы Валкавыск, рухомыя злучэнні фронта па шасе накіраваліся да Беластока.

Войскі правага крыла 2-га Беларускага фронта ва ўзаемадзеянні з левым крылом 3-га Беларускага фронта развівалі паспяховае наступленне на Гродна. Тут яны сустрэліся з жорсткім супраціўленнем буйных сіл ворага. На падтрыманне войск, якія абаранялі пазіцыі на подступах да Гродна, праціўнік перакінуў з Германіі новую пяхотную дывізію, многія падраздзяленні і часці з бліжэйшага тылу былі таксама сканцэнтраваны на подступах да Гродна. Немцы стварылі моцную абарону. Яе лінія ішла па рэках Котра, Нёман, Рось і цягнулася ў 30 *км* на ўсход і паўднёвы ўсход ад Гродна.

Горад меў буйнае аператыўнае значэнне. Таму немцы на працягу адной ночы і раніцы прадпрынялі 11 ярасных контратак. Шматлікімі контратакамі вораг імкнуўся скінуць часці нашых войск з раду плацдармаў, але ён не дасягнуў ніякіх вынікаў. 16 ліпеня злучэнні 2-га Беларускага фронта ва ўзаемадзеянні з часцямі 3-га Беларускага фронта штурмам авалодалі горадам Гродна. Немцы панеслі велізарныя страты.

Гіганцкі, усесакрушаючы вал наступлення совецкіх войск каціўся на захад. Глыбіня пранікнення іх дасягала на радзе напрамкаў ад 320 да 450 *км*. Наступленне разгортвалася на ўсё большай і большай тэрыторыі.

Арміі 1-га Беларускага фронта імкліва развівалі свае ўдары ў двух напрамках—баранавіцкім і пінскім. Гэты раён наступлення характарызуецца наяўнасцю балот і рэк з вельмі забалочанымі берагамі. Густыя лясы таксама затруднялі манеўры буйных злучэнняў совецкіх войск. У гэтых умовах патрабавалася самаадданасць, выключнае напружанне сіл і вынослівасць, каб безупынна рухацца ўперад, праследаваць ворага.

У баях за Баранавічы выдатна паказалі сябе злучэнні кубанскіх казакаў пад камандаваннем Героя Совецкага Саюза генерала Пліева. Яны з баямі прайшлі за два дні да 100 *км*. Фарсіраваўшы раку Нёман і перарэзаўшы дарогу Навагрудак — Баранавічы, яны навіслі над паўночным флангам абароны ворага. Другія часці — генерал-палкоўніка Батава — ахоплівалі абарону праціўніка з поўдня. Паследавалі ўдары нашых войск і з усходу. Наступаючы на Баранавічы канцэнтрычна, совецкія войскі ўварваліся ў горад. Пасля жорсткага начнога бою яны раніцой 8 ліпеня занялі Баранавічы і праследавалі праціўніка ў напрамках на Слонім, Пружаны, Бяроза-Картузская, Кобрын.

Адначасова совецкія войскі занялі Лунінец. Фарсіраваўшы рад такіх водных рубяжоў, як рэкі Случ, Стыр, Прыпяць, Ясельда і іншыя, яны падышлі непасрэдна да Пінска і на бліжэйшых подступах да горада грамілі нямецкія часці. Дняпроўская флатылія прышла на дапамогу наземным войскам, высадзіўшы ў ноч на 14 ліпеня дэсант на паўднёвай ускраіне Пінска. Завязаліся вулічныя баі ў горадзе. Тым часам часці, якія фарсіравалі рэкі Ясельду і Прыпяць, таксама ўварваліся ў Пінск. 14 ліпеня варожы гарнізон Пінска быў разбіт.

Пачаліся баі за другія совецкія гарады. Войскі 1-га Беларускага фронта, праследуючы разбітыя часці ворага, падышлі да Брэста. Баі за горад прадаўжаліся больш 10 сутак.

Немцы ўлічвалі, што Брэст—важны вузел камунікацый. Таму яны ператварылі яго ва ўмацаваны раён абароны на Варшаўскім напрамку. Камандаванне брэсцкага гарнізона мела асабісты загад Гітлера—утрымаць Брэст любымі сродкамі. Гітлераўцы імкнуліся скаваць тут совецкія войскі і тым самым прыкрыць Варшаўскі напрамак. Але вораг пралічыўся. Авалодаўшы горадам Слонім, совецкія войскі наносілі ўдар за ўдарам па ворагу ў раёне Брэста. Ужо к 27 ліпеня быў завершан манеўр, у выніку якога 3 нямецкія дывізіі заходней Брэста аказаліся ў «катле». Праз дзень—28 ліпеня—совецкая пяхота штурмам авалодала горадам і крэпасцю Брэст. Варожы гарнізон быў разбіт. Затым былі знішчаны і 3 дывізіі, акружаныя на захад ад горада. Так немцы страцілі важны вузел дарог, які служыў сувяззю іх цэнтральнай групы з паўднёвай групіроўкай. Адкрываўся шлях і ствараліся ўмовы для паспяховага наступлення совецкіх войск да граніц Усходняй Прусіі, на Рыгу і Варшаву.

Такім чынам, праз месяц пасля пачатку наступлення совецкіх войск уся Совецкая Беларусь была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Совецкая Армія вярнула свабоду беларускаму народу.

Праследуючы ворага, нашы часці выйшлі на граніцу Совецкага Саюза з Усходняй Прусіяй. У 7 гадзін 30 мінут 17 ліпеня 1944 года совецкі афіцэр Зайцаў падняў чырвоны сцяг на беразе рэчкі Шушупы, якая аддзяляла Совецкую Літву ад Усходняй Прусіі. У той-жа дзень, 17 ліпеня 1944 года, 60 тыс. нямецкіх салдат і афіцэраў, узятых у палон у Беларусі, на чале з 19 генераламі, былі праведзены праз Маскву. Фашысты, нарэшце, убачылі сталіцу совецкай краіны, аб чым яны марылі яшчэ ў пачатку вайны. Але пры якіх абставінах! Абарваныя, брудныя, панурыя ішлі генералы, афіцэры і салдаты разбітай нямецкай арміі па вуліцах Масквы, перапоўненых гледачамі.

* * *

Совецкая Армія прадаўжала свой вызваленчы паход. Раніцай 27 ліпеня ў выніку жорсткіх вулічных баёў быў вызвален ад ворага горад Беласток. Насельніцтва гэтага горада з лікаваннем сустрэла сваіх вызваліцеляў. Тут аказаліся тысячы совецкіх грамадзян, якія былі ўгнаны з беларускіх гарадоў у нямецкую катаргу. Але імклівае наступленне нашых войск выратавала іх ад голаду і смерці.

Войскі 2-га Беларускага фронта, авалодаўшы Беластокам, адкрылі шлях для выхаду да рэк Бобр і Нарэў. Адсюль у студзені 1945 года яны павялі наступленне на Усходнюю Прусію.

Характарызуючы значэнне магутнага ўдару, які нанесла ворагу Совецкая Армія ў чэрвені — ліпені 1944 года ў Беларусі, таварыш Сталін у сваім дакладзе 6 лістапада 1944 года гаварыў: «... Чырвоная Армія нагалаву разбіла нямецкія войскі пад Віцебскам, Бабруйскам, Магілевам і завяршыла свой удар акружэннем 30 нямецкіх дывізій пад Мінскам. У выніку гэтага ўдару нашы войскі: а) поўнасцю вызвалілі Беларускую Совецкую Рэспубліку; б) вышлі на Віслу і вызвалілі значную частку саюзнай нам Польшчы; в) вышлі на Нёман і вызвалілі большую частку Літоўскай Совецкай Рэспублікі; г) фарсіравалі Нёман і падышлі да граніц Германіі».

Так завяршыўся трэці этап гіганцкай бітвы за Беларусь. За гэты час Совецкая Армія поўнасцю вачысціла ад ворага велізарную тэрыторыю ў паласе паміж Заходняй Дзвіной і Прыпяццю—тэрыторыю, якая прасціраецца з поўначы на поўдзень больш чым на 400 *км* і з усходу на захад — на 600 *км*.

Гэтае наступленне Совецкай Арміі, па вызначэнню таварыша Сталіна, з'явілася пятым ударам з ліку тых удараў, якія вызначылі рашаючыя поспехі совецкіх войск у 1944 годзе. У выніку гэтага ўдару была канчаткова разбіта ўся цэнтральная група нямецкіх армій, якая знаходзілася на беларускім стратэгічным напрамку.

Гэта была вялікая перамога Совецкай Арміі. У выніку пабеданоснага наступлення Совецкай Арміі ў Беларусі, у цэнтры нямецкага фронта на ўсходзе ўтварылася 400-кіламетровая брэш, прабітая совецкімі войскамі. Імкнучыся закрыць гэту стратэгічную брэш, гітлераўскае камандаванне знімала з другіх напрамкаў і франтоў злучэнні і цэлыя арміі і перакінула сюды больш 30 дывізій. Але гэта толькі аблегчыла далейшыя аперацыі совецкіх войск у Прыбалтыцы і на поўдні. Вядома, што паўночная група варожых войск у канцы ліпеня была адрэзана ў Прыбалтыцы. Аказалася ізаляванай і паўднёвая групіроўка, што аблегчыла яе разгром. 13 кастрычніка сталіца Латвіі—Рыга была вызвалена Совецкай Арміяй. Звыш 30 нямецкіх дывізій было адрэзана ад Усходняй Прусіі; яны аказаліся ў кляшчах паміж Лібавай і Тукумсам. Совецкія войскі дабівалі тут акружаныя варожыя дывізіі.

* * *

Разгром ворага ў Беларусі, з такім поспехам ажыццёўлены совецкімі войскамі, з'яўляецца адной з класічных ваенных аперацый, у ходзе якіх праявіліся сіла, магутнасць і высокае ваеннае майстэрства нашых совецкіх воінаў. Гэта выдатны ўзор сталінскага ваеннага майстэрства. «Поспехі Чырвонай Арміі, — гаварыў таварыш Сталін, — сталі магчымы дзякуючы правільнай стратэгіі і тактыцы совецкага камандавання, дзякуючы высокаму маральнаму духу і наступальнаму парыву нашых байцоў і камандзіраў, дзякуючы добраму аснашчэнню нашых войск першакласнай сучаснай ваеннай тэхнікай, дзякуючы ўзросшаму майстэрству і вывучцы нашых артылерыстаў, мінамётчыкаў, танкістаў, лётчыкаў, сувязістаў, сапёраў, пехацінцаў, кавалерыстаў, разведчыкаў».

Увесь совецка-германскі фронт, пад напорам наступаючых совецкіх войск, адсоўваўся на захад. Услед за наступаючымі войскамі ішлі чыгуначнікі, якія аднаўлялі чыгуначныя шляхі і забяспечвалі рух паяздоў. На ўсіх вызваленых землях совецкай тэрыторыі аднаўлялася свабоднае жыццё, аднаўляліся прадпрыемствы — заводы, шахты, руднікі; сяляне засявалі свае палі, аднаўляліся калгасы, соўгасы і МТС. Вызваленыя з фашысцкай няволі совецкія людзі зноў пачыналі будаваць сваё шчаслівае жыццё.

Тым-жа летам 1944 года была вызвалена большая частка Карэла-Фінскай Рэспублікі. Варожыя войскі былі разгромлены на Карэльскім перашыйку і ў раёне паміж Ладажскім і Онежскім азёрамі. Вораг быў адкінут у глыб Фінляндыі. Восенню 1944 года Совецкая Армія разбіла гітлераўскія войскі паміж Талінам і Рыгай, выгнаўшы ворага з межаў Прыбалтыкі. У выніку магутнага ўдару нашых войск у раёне Яс і Кішынёва была ачышчана ад ворага Совецкая Малдавія.

Нямецка-фашысцкія захопнікі нідзе не мелі перадышкі. Выгнаўшы ворага за межы дзяржаўных граніц СССР, Совецкая Армія прадаўжала граміць яго з неаслабнай сілай. У сваім дакладзе аб 27-й гадавіне совецкай улады 6 лістапада 1944 года таварыш Сталін даў высокую ацэнку дзеянням Совецкай Арміі, якая дастойна выканала свой патрыятычны абавязак па вызваленню совецкай зямлі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. «Ад гэтага часу і назаўсёды, — гаварыў ён, — наша зямля свабодна ад гітлераўскай нечысці».

Але з выгнаннем ворага з межаў совецкай зямлі вызваленчая місія нашай арміі яшчэ не закончылася. Яшчэ мільёны совецкіх людзей знаходзіліся ў германскіх канцэнтрацыйных лагерах, раскіданых па ўсёй Заходняй Еўропе. Яшчэ многа, многа іх было на нямецкай катарзе. Яшчэ многія заняволеныя народы еўрапейскіх дзяржаў, якія стагналі пад фашысцкім ігам, таксама чакалі сваю вызваліцельніцу Совецкую Армію. «Мэтай гэтай усенароднай Айчыннай вайны супроць фашысцкіх прыгнятальнікаў з'яўляецца не толькі ліквідацыя небяспекі, навісшай над нашай краінай, але і дапамога ўсім народам Еўропы, якія стогнуць пад ігам германскага фашызма» [1]), гаварыў таварыш Сталін у сваёй гістарычнай прамове па радыё 3 ліпеня 1941 года.

І гэты наказ вялікага правадыра і геніяльнага палкаводца Совецкая Армія выканала бліскуча. Пераступіўшы совецкія дзяржаўныя граніцы, совецкія воіны прадаўжалі знішчаць ворага і безупынна гналі яго далей на захад.

Летам 1944 года войскі Совецкай Арміі ўступілі на тэрыторыю Польшчы. Яны з баямі авалодалі гарадамі Холм і Люблін, прадмесцем польскай сталіцы Прагай і паклалі пачатак вызваленню дружаственнага нам польскага народа, які таміўся пад уладай нямецкага імперыялізма. Усё насельніцтва Польшчы з захапленнем вітала совецкіх воінаў. Іх сустракалі авацыямі, падносілі ім кветкі, падарункі. 17 студзеня 1945 года Совецкая Армія вызваліла сталіцу Польшчы — Варшаву.

Праследуючы і сакрушаючы ворага, нашы войскі ўступілі ў межы суседняй нам Нарвегіі і вызвалілі паўночныя яе раёны ад нямецкіх імперыялістаў. Ужо ў 1945 годзе Совецкая Армія прышла на дапамогу дацкаму народу. Высадзіўшыся на востраве Барнхольм, які належыць Данії, нашы войскі прынялі ўдзел у вызваленні дацкага народа. У выніку крывепралітных баёў Совецкая Армія 13 лютага заняла сталіцу Венгрыі — Будапешт, 13 красавіка — сталіцу Аўстрыі — Вену.

У маі 1945 года Совецкая Армія ўпісала яшчэ адну слаўную старонку ў сваю гераічную гісторыю, вызваліўшы сталіцу брацкай нам Чэхаславакіі — Прагу. Жыхары сталіцы асыпалі сваіх вызваліцеляў кветкамі, насілі іх на руках па вуліцах горада. Уся краіна ліхавала па поваду слаўнай перамогі Совецкай Арміі.

---

[1]) І. Сталін. Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 10.

Восенню 1944 года часці 3-га Украінскага фронта ўступілі ў Югаславію і пры дапамозе народна-вызваленчай арміі Югаславіі разбілі і выгналі з краіны гітлераўскіх і італьянскіх захопнікаў.

Пад сакрушальнымі ўдарамі совецкіх войск былі разбіты, склалі сваю зброю і павярнулі яе супроць Германіі былыя яе саюзнікі — Румынія, Фінляндыя, Балгарыя. Паспяховае наступленне совецкіх войск на Балканах прывяло да выгнання нямецка-фашысцкіх войск, а таксама буржуазіі нямецкага паходжання з Балгарыі і Румыніі. Яно аказала рашаючы ўплыў на зыход барацьбы дэмакратычных вызваленчых сіл Албаніі.

У выніку зімняга наступлення 1945 года Совецкая Армія заняла Усходнюю Прусію, уступіла ў нямецкую Сілезію. Апошні саюзнік гітлераўскай Германіі ў Еўропе — Венгрыя — вышаў з вайны.

Цаною велізарных страт даставалася перамога совецкім воінам на тэрыторыях, вызваленых імі дзяржаў — Польшчы, Чэхаславакіі, Югаславіі, Балгарыі, Румыніі, Венгрыі, Нарвегіі. Але рашымасць выканаць сваю вызваленчую місію, давесці яе да пераможнага канца і дапамагчы народам вызваліцца з-пад фашысцкага ярма, удзесяцяралі сілы совецкіх воінаў.

Мужнасць і доблесць Совецкай Арміі адыгралі рашаючую ролю ў справе вызвалення народаў і такіх еўрапейскіх краін, як Францыя, Бельгія, Галандыя, Люксембург, якія былі заняволены германскім разбойніцкім імперыялізмам. Совецкая Армія з чэсцю выканала сваю гістарычную вызваленчую місію. Увесь свет змог пераканацца ў справядлівасці слоў вялікага Сталіна аб тым, што Совецкая Армія ёсць армія вызвалення народаў, армія аховы міру і дружбы паміж імі. Народы многіх еўрапейскіх краін атрымалі свабоду з рук гераічнай Совецкай Арміі.

* * *

Ваенныя дзеянні Совецкай Арміі працаўжаліся на Захадзе. Вайна вялася ўжо ў логаве фашысцкага звера. Сіла ўдараў нашых войск па нямецка-фашысцкіх захопніках нарастала з дня ў дзень. Гітлераўскія войскі неслі цяжкія паражэнні.

Нарэшце совецкія ўзброеныя сілы нанеслі немцам такі ўдар, якога не ведала яшчэ ваенная гісторыя.

2 мая 1945 года завяршылася капітуляцыя Берліна. Больш сотні тысяч салдат і афіцэраў—рэшткі фашысцкай арміі — здаліся нашаму камандаванню. Многія тысячы гітлераўцаў знайшлі сабе магілу ў дні бітвы за Берлін. Чырвоны сцяг, сцяг перамогі, узвіўся над цытадэллю фашызма — Берлінам. Праз тыдзень гітлераўская Германія, разгромленая совецкім народам і яго ўзброенымі сіламі пад геніяльным кіраўніцтвам вялікага Сталіна, безагаворачна капітуліравала. Вайна з Германіяй закончылася. Нямецкая армія была разбіта.

Увесь свет пазнаў сілу і магутнасць соцыялістычнай дзяржавы і яе ўзброеных сіл. «Цяпер, — гаварыў таварыш Сталін, — усе прызнаюць, як прыяцелі, так і ворагі, што Чырвоная Армія аказалася на вышыні сваіх вялікіх задач... Чырвоная Армія з'яўляецца першакласнай арміяй, у якой можна было-б павучыцца многаму» [1]).

Совецкую Армію, як вялікую вызваліцельніцу, народы Еўропы сустракалі з уздымам і лікаваннем. Усюды, дзе яна прайшла, быў ліквідаван фашысцкі «новы парадак». Народы раду дзяржаў цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй Еўропы, вызваленыя совецкімі войскамі, узялі ў свае рукі лёс сваіх краін і свайго жыцця. Яны ўстанавілі ў сябе новыя дэмакратычныя парадкі і сталі на новы шлях — шлях самастойнага дзяржаўнага развіцця. Яны расправіліся са здраднікамі, з манархічнай часткай афіцэрства, ліквідавалі памешчыкаў і манаполіі. Яны многае зрабілі ў галіне аднаўлення і развіцця сваёй эканомікі і культуры. Краіны народнай дэмакратыі ідуць да соцыялізма. Іх народы вядуць актыўную барацьбу супроць сіл рэакцыі, падпальшчыкаў новай сусветнай вайны.

З вайны з фашысцкай Германіяй і яе саюзнікамі Совецкі Саюз вышаў яшчэ больш моцным у ваенных і палітычных адносінах. Наша дзяржава ўмацавала і абезапасіла свае граніцы на захадзе. Совецкая Армія адстаяла дзяржаўныя інтарэсы ўсіх народаў, якія насяляюць СССР, іх нацыянальную самастойнасць, свабоду і культуру. Згодна дагавору з дружаственнай нам Польшчай, былі канчаткова вызначаны заходнія граніцы Совецкай Украіны і Совецкай Беларусі. У састаў Совецкага Саюза па дагавору з Чэхаславакіяй

---

[1]) І. Сталін. Прамова на сходзе выбаршчыкаў Сталінскай выбарчай акругі гор. Масквы 9 лютага 1946 года.

увайшла Закарпацкая Украіна і зараз ужо ўсе украінскія землі сабраны ў адзінай дзяржаве — Совецкай Украіне.

У Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспубліцы таксама канчаткова ўз'яднаны ўсе тэрыторыі, неселеныя беларусамі. Совецкая Беларусь стала вялікай шматмільённай дзяржавай.

Пашырылася тэрыторыя Совецкай Літвы, якой вернута Клайпедская вобласць, адабраная ад яе ў мінулым немцамі. Расшырыліся совецкія граніцы ў раёне Балтыйскага мора: да нашай краіны далучана вобласць былога Кенігсберга, зараз Калінінграда, які з'яўляецца добрым незамярзаючым портам у Балтыцы. Была адноўлена совецкая паўночна-заходняя граніца з Фінляндыяй. Тэрыторыя раёна Печэнгі вернута нашай краіне. У адпаведнасці з дагаворам, заключаным з Румыніяй, у састаў нашай Радзімы ўвайшла Паўночная Букавіна. Совецкая Малдавія поўнасцю аб'ядналa ўсе тэрыторыі з малдаўскім насельніцтвам.

Совецкая Армія, умацаваная дзякуючы нястомным клопатам совецкага народа, прадстаўляе сабой магутную, непераможную сілу. Аднак сіла гэтая не з'яўляецца агрэсіўнай. Совецкія войскі—дзе-б яны ні знаходзіліся—служаць толькі працоўным, справе міру, з'яўляюцца апорай дэмакратыі і прагрэсу. Праследуючы ворага ў час Айчыннай вайны, нашы войскі ўступілі на тэрыторыю раду саюзных дзяржаў. Гэта было ў інтарэсах перамогі над злейшым ворагам чалавецтва — германскім фашызмам. Аднак, як толькі была атрымана перамога над ворагам і закончыліся бітвы, нашы войскі пачалі свой адыход з тэрыторый еўрапейскіх краін. Яны былі выведзены з Югаславіі і Нарвегіі, Чэхаславакіі і Балгарыі, Румыніі і Венгрыі, Даніі і іншых краін. Совецкія войскі пакінулі тэрыторыю Ірана, дацкі востраў Барнхольм, Манчжурыю, Паўночную Карэю.

Совецкія воіны, удзельнікі Айчыннай вайны, добра памятаюць, з якой сардэчнасцю і цеплынёй развівалася насельніцтва гэтых краін з сваімі вызваліцелямі. «Рускія прышлі да нас першымі і яны першымі пакідаюць нас, — пісала адна з нарвежскіх газет у сувязі з адыходам нашых войск з Нарвегіі. Няхай рускія, пакідаючы нас, ведаюць, што іх праважае дружаственны народ, які ніколі не забудзе таго, што яны зрабілі для нас, а таксама для агульнай справы перамогі над ворагам».

Больш 100 тыс. жыхароў старажытнай сталіцы Польшчы — Кракава і навакольных сёл прышло праводзіць со-

вецкія войскі. Многія вуліцы горада былі ўпрыгожаны лозунгамі, совецкімі і польскімі флагамі ў чэсць Совецкай Арміі і Генералісімуса Сталіна. Праходзячыя па гораду войскі палякі асыпалі кветкамі, віталі салдат і афіцэраў і абвяшчалі здравіцы ў чэсць нашай Арміі.

* * *

У выніку разгрому гітлераўскай Германіі ў калоніях і залежных краінах разгарнуўся магутны нацыянальна-вызваленчы рух. Узмацнелі і развіваюцца сілы новай дэмакратыі, якія бачаць у асобе нашай краіны і яе арміі магутны аплот трывалага міру, дзяржаўнай незалежнасці і прагрэсу.

Разгром фашысцкай Германіі азначаў ліквідацыю ачага сусветнай агрэсіі на Захадзе. Аднак на Далёкім Усходзе прадаўжалася вайна, развязаная другім ворагам міру і дэмакратыі — японскім імперыялізмам. Совецкае камандаванне рушыла свае войскі супроць гэтага галоўнага саюзніка Германіі, з якім у нашага народа меўся свой асобы рахунак.

Чатыры дзесяцігоддзі назад, у час руска-японскай вайны (1904 — 1905 гг.), японцы захапілі наш Паўднёвы Сахалін, уцвярдзіліся на Курыльскіх астравах, закрыўшы для нашай краіны ўсе выхады ў Ціхі акіян. Японскія імперыялісты прадпрыймалі ў 1918 — 1922 гадах інтэрвенцыю супроць маладой совецкай рэспублікі. У 1929 г. з дапамогай кітайскіх мілітарыстаў яны спрабавалі прашчупаць моцнасць совецкіх граніц. Затым у 1938 г. адбылося ваеннае выступленне ў раёне возера Хасан, а ў 1939 г. — больш буйныя аперацыі ў раёне Манголіі (Халхін-Гол), якія пацярпелі, як і ўсе папярэднія правакацыі, поўны крах.

Японскія імперыялісты скоўвалі вялікія сілы нашых войск у гады Вялікай Айчыннай вайны. Яны трымалі на совецкай граніцы ў Манчжурыі мільённую Квантунскую армію, якая мела на ўзбраенні 15 тысяч гармат, 1000 танкаў, больш тысячы самалётаў і чакала толькі падзення Сталінграда, каб рынуцца на нашу Радзіму.

Аднак у выніку хутка разгарнуўшагася наступлення Совецкая Армія ўшчэнт разбіла гэтую армію — лепшую частку ўзброеных сіл Японіі. У Карэі і на Курыльскіх астравах выкінуты дэсант совецкага Ваенна-марскога флота прымусіў капітуліраваць варожыя гарнізоны. Праведзеныя ў Манчжурыі і Карэі аперацыі Совецкай Арміі былі ўзорам маланкавага разгрому ворага. Нашы войскі вызвалілі Паўднёвы Сахалін і Курыльскія астравы, якія служаць цяпер

сродкам прамой сувязі Совецкай дзяржавы з Ціхім акіянам і базай абароны СССР ад японскай агрэсіі.

Выдатная роля ў разгроме заклятага ворага належыць совецкім узброеным сілам, нашаму гераічнаму народу. Сваёй самаадданай барацьбой яны выратавалі сусветную цывілізацыю ад фашысцкіх пагромшчыкаў, паказаўшы ўсяму свету нябачаную стойкасць, дысцыплінаванасць, мужнасць, высокія баявыя якасці і масавы гераізм. Гераізм совецкіх людзей у тылу, нашых воінаў на фронце не мае сабе роўнага ў гісторыі.

Выхаваныя партыяй Леніна — Сталіна, нашы войскі паказалі жалезную стойкасць і мужнасць і ў абароне і ў наступленні. Нямеркнучай славай пакрылі сябе мужныя абаронцы гарадоў-герояў: Одэсы, Севастопаля, Ленінграда і Сталінграда. Мужна адстайвалі, стаялі на смерць совецкія войскі, якія абаранялі сталіцу нашай Радзімы — Маскву. Натхнёныя гарачай любоўю да мацеры-Радзімы, выхаваныя ў духу нянавісці да капіталізма, нашы воіны біліся з ворагам да апошніх магчымасцей і паміралі, калі гэтага патрабавалі абставіны, як героі-панфілаўцы, Віктар Талаліхін і тысячы іншых верных сыноў нашай Радзімы.

Сапраўды з'яўляюцца вялікімі, бяспрыкладнымі поспехі і майстэрства совецкіх войск на ўсіх франтах Айчыннай вайны ў пабеданосных наступальных бітвах. Сыны і дочкі ўсіх народаў Совецкага Саюза, праяўляючы жалезную стойкасць, мужнасць і адвагу, бралі прыклад са свайго старэйшага брата — вялікага рускага народа, як самага выдатнага, самага мужнага сярод усіх роўнапраўных народаў Совецкага Саюза. За перыяд Айчыннай вайны за доблесць і гераізм мільёны совецкіх воінаў былі ўдастоены высокіх урадавых узнагарод.

«Наш совецкі народ, — гаварыў таварыш Сталін, віншуючы 2 верасня 1945 года нашых людзей з перамогай над Японіяй, — не шкадаваў сіл і працы ў імя перамогі. Мы перажылі цяжкія гады. Але цяпер кожны з нас можа сказаць: мы перамаглі. Ад гэтага часу мы можам лічыць нашу Айчыну вызваленай ад пагрозы нямецкага нашэсця на захадзе і японскага нашэсця на ўсходзе. Надышоў доўгачаканы мір для народаў усяго свету».

У Вялікай Айчыннай вайне Совецкая Армія паказала не толькі сваю непараўнальную маральную перавагу над праціўнікам. Яна прадэманстравала разам з тым сваю поўную перавагу над ім і ў эканоміцы, у баявой тэхніцы.

Совецкія ўзброеныя сілы на ўсім працягу вайны адчувалі штодзённую дапамогу свайго народа, згуртаванага комуністычнай партыяй і самааддана працаваўшага на шчасце сваёй соцыялістычнай айчыны.

За перыяд Айчыннай вайны соцыялістычная прамысловасць вытварыла больш, чым дарэволюцыйная прамысловасць за перыяд першай сусветнай вайны: артылерыйскіх гармат — у 29 разоў, мінамётаў — у 89 разоў, кулямётаў—у 78 разоў, артылерыйскіх снарадаў — у 8,2 раза, розных патронаў — у 6,9 раза [1]). Да гэтага колькаснага росту ўзбраення і боепрыпасаў трэба дадаць і велізарныя якасныя змяненні ваеннай тэхнікі СССР у параўнанні з ваеннай тэхнікай дарэволюцыйнай Расіі.

Поспехі соцыялістычнай эканомікі нашай краіны фашысты сталі востра адчуваць разам з першымі магутнымі ўдарамі Совецкай Арміі.

Совецкая Армія не адчувала недахопаў у боепрыпасах. У перыяд Айчыннай вайны яна атрымала ад сваёй соцыялістычнай прамысловасці сотні мільёнаў артылерыйскіх снарадаў і мін. «Гэта лавіна металу і агню,—піша таварыш Вазнесенскі,—увабрала ў сябе гнеў совецкага народа і яго непераможную сілу ў барацьбе за перамогу над гітлераўскім разбойніцкім імперыялізмам»[1]). Ужо ў заключнай бітве, якую вяла наша армія за Берлін, на ворага быў накіраваны агонь 41 тысячы ствалоў нашай артылерыі і мінамётаў, больш 6300 сучасных танкаў прарыву; у небе Берліна дзейнічала 8400 самалётаў, якія дапаўнялі з паветра сакрушальныя ўдары артылерыі і танкаў. Уся гэтая выдатная зброя была створана рукамі совецкага народа, яго гераічнай працай. Выкананне перадваенных пяцігодак забяспечыла тэхніка-эканамічную незалежнасць нашай краіны, ператварыла яе ў вялікую індустрыяльна-калгасную дзяржаву, падрыхтавала яе да актыўнай абароны.

Перамога соцыялізма ў СССР прывяла да росквіту эканамічнай і ваеннай магутнасці нашай Радзімы, да далейшага росту боездольнасці Совецкай Арміі, далейшага ўдасканалення і памнажэння яе ўзбраення. Баявая магутнасць Совецкай Арміі пераўзышла баявую сілу фашысцкіх полчышчаў, якія скарысталі вытворчыя рэсурсы амаль усёй Еўропы.

Совецкая ваенная эканоміка здолела, не гледзячы на цяжкія ўмовы ваеннага часу, забяспечыць няўхільнае колькаснае

[1]) **Н. Вазнесенскі.** Ваенная эканоміка СССР у перыяд Айчыннай вайны, стар. 87.

і якаснае нарастанне вытворчасці першакласнай баявой тэхнікі і ў найкарацейшы тэрмін аснасціць ёю совецкія ўзброеныя сілы. Нашы воіны эфектыўна прымянілі гэтую тэхніку на палях гістарычных бітваў; яны здолелі да дна скарыстаць яе сілу для разгрому ненавіснага ворага.

Дзякуючы калгаснаму ладу паспяхова была вырашана ў перыяд вайны праблема харчавання для фронта і тылу і сельскагаспадарчай сыравіны для прамысловасці. Калгасны лад вытрымаў усе цяжкія выпрабаванні гэтай вайны і дзякуючы самаадданай працы калгаснікаў Совецкая Армія не мела недахопу ў харчаванні.

Такім чынам, узначальваемы вялікай партыяй Леніна — Сталіна наш народ уласнымі сіламі, рэсурсамі сваёй растучай народнай гаспадаркі, мабілізацыяй унутраных рэзерваў атрымаў эканамічную перамогу над нямецкім імперыялізмам. Без самаадданай дапамогі ўсяго совецкага народа нашы ўзброеныя сілы не маглі-б пераадолець такога злоснага ворага, як нямецкі імперыялізм і японскі мілітарызм.

«... Чырвоная Армія змагла паспяхова выканаць свой абавязак перад Радзімай і выгнала немцаў з межаў совецкай зямлі,—указваў таварыш Сталін,—дзякуючы таму, што яе беззаветна падтрымлівала з тылу ўся наша краіна, усе народы нашай краіны. Самаадданая работа ўсіх совецкіх людзей—рабочых, сялян, інтэлігенцыі, таксама як кіруючая дзейнасць нашых дзяржаўных і партыйных органаў праходзіла... пад сцягам — «усё для фронта!»[1]). Усе сілы совецкай дзяржавы партыя большэвікоў, на чале з вялікім Сталіным, накіравала да дасягнення адной мэты: разграміць і знішчыць злобнага і моцнага ворага—нямецкія полчышчы і іх саюзнікаў. Дзе-б ні знаходзіліся совецкія людзі—на фронце ці ў тылу,—яны былі поўны рашымасці агульнымі намаганнямі заваяваць перамогу.

* * *

У нечувана цяжкой вайне з фашысцкай Германіяй—краінай найбольш разбойніцкага імперыялізма—перамог совецкі грамадскі і совецкі дзяржаўны лад. Гэты лад аказаўся больш жыццездольным і ўстойлівым, чым усякі іншы несовецкі лад. У Айчыннай вайне праявілася перавага соцыялістычнага ладу над прагніўшай наскрозь капіталістычнай сістэ-

[1]) І. Сталін. Аб Вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза, стар. 128, 1948 г.

май, перавага маральных сіл совецкіх воінаў над маральнымі сіламі салдат армій імперыялістычных краін.

Дзяржава моцна свядомасцю шырокіх мас. Як указваў вялікі Ленін, яна моцна тады, калі масы ўсё ведаюць, аб усім могуць меркаваць і ідуць на ўсё свядома. Парадзіўшы новы соцыялістычны лад, Кастрычніцкая рэволюцыя стварыла новыя ўмовы жыцця і быту працоўных Совецкага Саюза, яна забяспечыла патрэбныя прадпасылкі для выхавання ў нашай краіне новых людзей—свядомых, самаадданых, актыўных будаўнікоў соцыялістычнага грамадства, палымяных патрыётаў сваёй Радзімы. Такімі людзьмі і моцна наша Совецкая Армія.

Совецкі лад, які аказаўся лепшай формай мабілізацыі краіны для разгрому ворага, «... даказаў сваю найвялікшую трываласць, аснаваную на кіраўніцтве выпрабаванай у баях нашай партыі Леніна—Сталіна, аснаваную на перамозе соцыялізма, саюзе рабочых і сялян, на адзінстве народаў Совецкага Саюза» (Вазнесенскі).

У Айчыннай вайне перамаглі ўзброеныя сілы СССР, перамагла мудрая палітыка партыі Леніна—Сталіна.

Кіруемая большэвіцкай партыяй, вялікім Сталіным Совецкая Армія вышла з вайны яшчэ больш магутнай і загартаванай у бітвах з ворагамі чалавецтва.

Совецкі народ і наша армія, узначальваемыя большэвіцкай партыяй, з чэсцю вытрымалі суровыя выпрабаванні вайны, пакрыўшы нашу зброю нямеркнучай славай.

Варожыя полчышчы былі разбіты Совецкай Арміяй на палях бітваў Айчыннай вайны не толькі магутнасцю сучаснай баявой тэхнікі, але і той сілай, якую прадстаўляе наша перадавая, рэволюцыйная ідэалогія. «Партыі большэвікоў належыць чэсць і слава перамогі, бяспрыкладнай у гісторыі чалавечага грамадства. Найвялікшая вытрымка, непераўзыйдзенае майстэрства ў кіраўніцтве ваеннай гаспадаркай і тытанічная воля к перамозе забяспечылі сканцэнтраванне ўсіх сіл народаў СССР для сакрушальнага ўдару па ворагу» (Вазнесенскі).

Совецкія ўзброеныя сілы з'яўляюцца дзецішчам вялікай партыі большэвікоў. Наша партыя, узначальваемая таварышам Сталіным, пастаянна расціла і ўмацоўвала іх сілу, багатырскую магутнасць. Яна выхоўвала совецкіх воінаў у духу вернасці вялікай справе Леніна—Сталіна, у духу перадавой,

рэволюцыйнай ідэалогіі, усведамлення сваёй праваты, адданасці Радзіме, нашай партыі, вялікаму Сталіну.

Асабісты прыклад комуністаў, гатоўнасць іх пайсці на любыя афяры ў імя перамогі, іх палымянае большэвіцкае слова і гераізм у баю натхнялі ўсіх воінаў на смелую і самаадданую бітву з ворагамі айчыны. Яны натхнялі франтавых байцоў і працаўнікоў тылу на бяспрыкладныя подзвігі у славу Радзімы. Звыш 11 мільёнаў совецкіх воінаў узнагароджаны ордэнамі і медалямі за доблесць, мужнасць і гераізм, праяўленыя на палях сражэнняў. Высокага звання Героя Совецкага Саюза было ўдастоена 10 943 чалавекі. Сярод іх—героі абароны Ленінграда, Сталінграда, абаронцы Одэсы і Севастопаля, героі штурма Берліна—прадстаўнікі літаральна ўсіх нацыянальнасцей і нацый, насяляючых СССР.

У першыя-ж дні вайны ўся краіна даведалася аб подзвігу сталінскага сокала, вернага сына беларускага народа капітана Гастэла. Калі яго падбіты самалёт быў ахоплены полымем, ён накіраваў яго ў калону нямецкіх баявых машын. Совецкі патрыёт загінуў, але ён даў узор гераічнага выканання свайго абавязку да канца. А хіба мала такіх фактаў дала Айчынная вайна? Успомнім радавога Матросава, закрыўшага сваім целам амбразуру нямецкага дзота, подзвіг слаўнага беларускага партызана Заслонава, 28 гвардзейцаў-панфілаўцаў, якія ўступілі ў адзінаборства з дзесяткамі нямецкіх танкаў на подступах да Масквы, лабавыя атакі і паветраны таран, які прымянялі совецкія лётчыкі ў бітвах з фашысцкімі сцярвятнікамі.

Маральна-палітычнае адзінства совецкага грамадства, дружба народаў СССР, гарачы совецкі патрыятызм, высокае ўсведамленне праваты сваёй вялікай справы—такая вось аснова масавага, нябачанага гераізма, які стаў у дні Айчыннай вайны нормай паводзін як совецкіх воінаў на фронце, так і совецкіх працаўнікоў у тылу. Усе яны разам кавалі перамогу над ворагам.

Мы ўзнялі нашу слаўную радзіму да небывалых ў гісторыі вышынь сілы і магутнасці пад мудрым кіраўніцтвам большэвіцкай партыі, нашага правадыра і настаўніка, геніяльнага палкаводца Сталіна. Усе перамогі Совецкай Арміі неразрыўна звязаны з яго іменем. Пад яго вадзіцельствам Совецкая Армія, авіяцыя і флот разгромілі ворага, з чэсцю выканалі свой патрыятычны абавязак, сваю высокую вызваленчую місію. «Вытрымка ў барацьбе з нямецкімі полчышчамі і ўпэўненасць у перамозе нашай справядлівай справы ад вялікага

Сталіна пашыралася па ўсёй краіне, згуртоўвала народ і армію, ператвараючы СССР у непрыступную крэпасць»[1]).

Таварыш Сталін узброіў нашу армію самай перадавой ваеннай навукай і навучыў яе біць ворага наверняка. Пад кіраўніцтвам таварыша Сталіна, дзякуючы яго генію, ваеннае майстэрства Совецкай Арміі стала самым перадавым майстэрствам сучаснасці. Яго палкаводчы геній, яго ваеннае майстэрства праявіліся ў абароне і наступленні велізарных людскіх мас і тэхнікі. У жорсткіх бітвах з ворагам нашы войскі ўмела спалучалі актыўную абарону з падрыхтоўкай контрнаступлення, а наступленне—з моцнай абаронай. Таварыш Сталін па-майстэрску распрацаваў і прымяніў новую тактыку—тактыку манеўравання, адначасовага прарыву фронта на некалькіх участках, каб не даць магчымасці праціўніку сабраць свае рэзервы ва ўдарны кулак; сталінская новая тактыка спалучэння агню і манеўра ўзбагаціла нашу армію той найвялікшай сілай, якая была накіравана на знішчэнне праціўніка.

Велізарнай заслугай таварыша Сталіна перад совецкім народам з'яўляецца падбор, выхаванне і вылучэнне на адказныя пасты новых кіруючых ваенных кадраў. Сярод іх—маршалы і генералы: Булганін, Васілеўскі, Конеў, Говараў, Ватуцін, Чэрняхоўскі, Антонаў, Сакалоўскі, Мерэцкоў, Ракасоўскі, Маліноўскі, Воранаў, Талбухін, Якаўлеў, Малінін, Галіцкі, Трафіменка, Гарбатаў, Штэменка, Курасаў, Вяршынін, Галаванаў, Федарэнка, Рыбалка, Багданаў, Катукоў, Лелюшэнка і многія іншыя, якія вынеслі на сваіх плячах цяжар незвычайна суровай вайны. Усе яны — выхаванцы таварыша Сталіна.

Пад кіраўніцтвам правадыра і геніяльнага палкаводца таварыша Сталіна Совецкая Армія разбіла немцаў пад Масквой, устроіла ім сталінградскае пабоішча, разграміла нямецкія полчышчы ў белгарадска-курскіх бітвах і ў Беларусі, выгнала ворага з межаў совецкай зямлі і разграміла канчаткова на яго ўласнай тэрыторыі.

Кіруемыя вялікім Сталіным совецкія ўзброеныя сілы адстаялі ў вайне вялікія заваяванні Кастрычніка і дапамаглі заняволеным Германіяй народам Еўропы скінуць з іх ярмо фашысцкага рабства. Атрыманыя совецкім народам пад кіраўніцтвам Сталіна перамогі ў вайне ўмацавалі ваенную і палітычную магутнасць совецкай дзяржавы.

[1]) **Н. Вазнесенскі.** Ваенная эканоміка СССР у перыяд Айчыннай вайны, стар. 8.

Разграміўшы галоўныя ачагі імперыялістычнай агрэсіі—фашысцкую Германію на Захадзе і Японію—на Усходзе, совецкія ўзброеныя сілы заслужылі ўдзячнасць і павагу народаў усіх краін свету. «У прызнанні таго факту, што совецкі народ выратаваў цывілізацыю Еўропы ад фашысцкіх пагромшчыкаў, народы ўсяго свету бачаць таксама прызнанне выключных заслуг правадыра комунізма і вялікага палкаводца Совецкага Саюза Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна»[1]).

★

[1]) **В. Молатаў.** 30-годдзе Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэвалюцыі.

# СОВЕЦКАЯ АРМІЯ НА ВАРЦЕ ЗАВАЯВАНАГА МІРУ

З пабеданосным сканчэннем Айчыннай вайны наш народ зноў вярнуўся да мірнай працы. Совецкі народ прадаўжае сваю мірную, творчую работу і паспяхова вырашае задачы будаўніцтва комуністычнага грамадства. Мы ўпэўнена ідзем па шляху завяршэння будаўніцтва соцыялістычнага грамадства і паступовага пераходу ад соцыялізма да комунізма ў нашай краіне. Грандыёзную праграму гэтай творчай стваральнай работы намеціў таварыш Сталін у сваёй прамове перад выбаршчыкамі Сталінскай выбарчай акругі горада Масквы 9 лютага 1946 года. Тут, як і ў дакладзе на XVIII з'ездзе ВКП(б) у 1938 годзе, ён указаў той шлях, якім ідзе наш народ да комунізма. «Што датычыць планаў на больш працяглы перыяд,—гаварыў таварыш Сталін у сваёй прамове,— то партыя мае намер арганізаваць новы магутны ўздым народнай гаспадаркі, які даў-бы нам магчымасць узняць узровень нашай прамысловасці, напрыклад, утрая ў параўнанні з даваенным узроўнем. Нам трэба дабіцца таго, каб наша прамысловасць магла даваць штогод да 50 мільёнаў тон чыгуну, да 60 мільёнаў тон сталі, да 500 мільёнаў тон вугалю, да 60 мільёнаў тон нафты. Толькі пры гэтай умове можна лічыць, што наша Радзіма будзе гарантавана ад усякіх выпадковасцей. На гэта пойдуць, бадай, тры новыя пяцігодкі, калі не больш. Але гэтую справу можна зрабіць, і мы павінны яе зрабіць».

У гэтых велічных сталінскіх прадначартаннях дана праграма стварэння матэрыяльных асноў комуністычнага грамадства. Першым значным крокам намечанай таварышам Сталі-

ным праграмы з'яўляецца датэрміновае выкананне плана пасляваеннай пяцігодкі. Сталінскі пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі СССР на 1946 — 1950 гады, які быў прынят Вярхоўным Советам СССР у сакавіку 1946 года, указаў у якасці асноўнай задачы—аднавіць пацярпеўшыя раёны краіны, аднавіць даваенны ўзровень прамысловасці і сельскай гаспадаркі і затым перавысіць гэты ўзровень у значных размерах. За гэтую пяцігодку наш народ павінен не толькі аднавіць разбураныя прадпрыемствы, але і пабудаваць тысячы новых фабрык, заводаў, машынна-трактарных станцый. Наша краіна змагаецца за тое, каб не толькі ўзняць совецкую прамысловасць і сельскую гаспадарку да ўзроўню 1940 года, але і перавысіць гэты ўзровень, дабіцца рэзкага ўздыму матэрыяльнага добрабыту совецкага народа і яшчэ больш узняць узровень навукі і культуры.

Пяцігадовы план аднаўлення і развіцця народнай гаспадаркі Совецкай Беларусі прадугледжвае перавышэнне ўзроўню прамысловай вытворчасці 1940 года на 16%. У пасляваеннай пяцігодцы ў рэспубліцы ствараецца магутная энергетычная база (магутнасць электрычных станцый вырасце ў 2,2 раза ў параўнанні з даваенным узроўнем). Разам з гэтым значна ўмацоўваецца паліўная база. На аснове торфу будуць створаны газавая і іншыя галіны хімічнай прамысловасці. Побач з поўным аднаўленнем усіх галін прамысловасці рэспублікі, якія існавалі да вайны, пяцігодка забяспечвае стварэнне раду новых галін—трактарабудаўніцтва, аўтабудаўніцтва, вытворчасць веласіпедаў, лакамабіляў, новых тыпаў станкоў і іншых — невядомых раней Беларусі. Новая пяцігодка карэнным чынам мяняе індустрыяльнае аблічча Совецкай Беларусі, узнімае агульны ўзровень сацыялістычнай індустрыі рэспублікі і культурны ўзровень беларускага народа.

Гіганцкімі тэмпамі павялічваецца аб'ём капіталаўкладанняў. За пяцігодку ён дасягне 7 мільярдаў рублёў, перавысіўшы аб'ём капіталаўкладанняў за тры перадваенныя пяцігодкі, разам узятыя.

У дні пасляваеннай мірнай стваральнай працы Совецкі Саюз і яго састаўная частка—Беларусь дэманструе перад усім светам сваю магутную сілу, якую даў яму пароджаны геніем Леніна—Сталіна сацыялістычны лад. Ворагі нашай дзяржавы разлічвалі на тое, што тыя найвялікшыя страты, якія прычынены Совецкаму Саюзу мінуўшай вайной, а таксама выключная засуха 1946 года падарвуць совецкую гаспа-

дарку, жыццездольнасць совецкай эканомікі. Яны разлічвалі, што гаспадарчыя цяжкасці прымусяць Совецкую дзяржаву пайсці ў кабалу да імперыялістаў ЗША. Але яны пралічыліся. Наш совецкі народ, выхаваны і кіруемы большэвіцкай партыяй, мае сваю выдатную традыцыю: пакладацца на ўласныя сілы. Наш народ за прайшоўшыя дзесяцігоддзі навучыўся пераадольваць усе і ўсялякія перашкоды на шляху да перамогі.

Прайшло толькі тры гады, як наш народ прыступіў да мірнага будаўніцтва на аснове пасляваеннай сталінскай пяцігодкі. Але і за гэты кароткі тэрмін адбыліся велізарныя перамены: у нашай краіне зроблен новы гіганцкі крок уперад па шляху аднаўлення і далейшага развіцця народнай гаспадаркі і культуры народаў Совецкага Саюза.

З года ў год ідзе на ўздым совецкая прамысловасць, наш транспарт, калгасная сельская гаспадарка. Дзякуючы самаадданай працы совецкіх людзей план 1948 года па валавой прадукцыі ўсёй прамысловасцю СССР быў выканан на 106%, павялічыўшыся ў параўнанні з 1947 годам на 27%, у тым ліку Беларусь выканала свой план на 106%. План першых трох год пасляваеннай пяцігодкі (1946—1948 гг.) па выпуску валавой прадукцыі ўсёй прамысловасці Совецкага Саюза выканан на 103%. Паспяхова перамагаючы цяжкасці пасляваеннага перыяда, наша краіна ў 1948 годзе не толькі дасягнула даваеннага ўзроўню развіцця народнай гаспадаркі, але і перавысіла яго. У рэкордна кароткі тэрмін наша прамысловасць перавысіла ўзровень даваеннага 1940 года на 18%.

Вельмі паказальна тое, што ў тых раёнах, якія падвяргаліся нямецкай акупацыі, валавая прадукцыя прамысловасці павялічылася за год на 41%, а ў БССР—на 44%. Датэрмінова выканалі свой план трэцяга, рашаючага года пяцігодкі такія важнейшыя галіны нашай індустрыі, як металургічная, вугальная, хімічная, машынабудаўнічая і іншыя, даўшыя гіганцкія тэмпы развіцця. Дастаткова, напрыклад, указаць, што выплаўка чыгуну павялічылася ў 1948 годзе ў параўнанні з 1947 годам на 22%, вытворчасць сталі і пракату — на 28%, вытворчасць рэек чыгуначных—на 34%, труб жалезных—на 39% і т. д. У велізарных размерах выросла наша машынабудаўніцтва, у асаблівасці транспартнае і сельскагаспадарчае (напрыклад, вытворчасць камбайнаў зернавых павялічылася ў 5,1 раза, трактараў—падвоілася, плугоў трактарных—на 124%, малатарань складаных — на 167% і т. д.). Паказальна тое, што па Міністэрству лясной і папяровай прамысловасці,

тэкстыльнай, харчовай прамысловасці БССР план 1948 года быў перавыканан па большасці галоўных вырабаў. У цэлым па Саюзу выпушчана звыш плана значная колькасць каляровых металаў, вугалю, бензіну, электраэнергіі, дызеляў, нафтавых рухавікоў, электраматораў, шарыкападшыпнікаў, металарэжучых станкоў, пародапагрузачных машын, насосаў, кампрэсараў, паравозаў, пасажырскіх вагонаў, тралейбусаў, аўтобусаў, экскаватараў і іншых машын і станкоў. Грузаабарот чыгуначнага транспарта за 1948 год павялічыўся на 27% і перавысіў даваенны ўзровень. Гіганцкі размах набылі будаўнічыя работы (за 3 гады адноўлена, пабудавана і ўведзена ў дзеянне каля 4 000 дзяржаўных прамысловых прадпрыемстваў). Усё гэта яшчэ больш умацоўвае магутнасць нашай Радзімы.

* * *

Натхнёны сталінскімі клопатамі беларускі народ паспяхова аднаўляе разбураную вайной і разграбленую гітлераўцамі народную гаспадарку, упэўнена ідзе па шляху далейшага няўхільнага ўздыму прамысловасці, сельскай гаспадаркі, транспарта і культуры БССР. Да дня 30-годдзя Беларускай ССР працоўныя рэспублікі пад кіраўніцтвам большэвіцкай партыі дабіліся буйных поспехаў. У першыя два гады пасля Айчыннай вайны былі адноўлены і пачалі даваць прадукцыю буйнейшыя прадпрыемствы рэспублікі—Гомельскі шклозавод імені Сталіна, Гомсельмаш, рад станкабудаўнічых заводаў у Мінску, Гомелі і Віцебску; пачалі дзейнічаць Валкавыскі цэментны завод, асноўныя прадпрыемствы лёгкай і мясцовай прамысловасці, а таксама прамысловасці будаўнічых матэрыялаў. З попелу і руін узнімаліся сотні і тысячы адноўленых прадпрыемстваў — фабрык, заводаў, машына-трактарных майстэрань, якія сталі яшчэ больш тэхнічна аснашчонымі, чым яны былі да вайны. Рэспубліка будуе сотні новых прадпрыемстваў.

Аб'ём прамысловай прадукцыі ў 1946 годзе ў параўнанні з 1945 годам склаў 155,4%, а ў 1947 годзе ў параўнанні з 1946 годам — 146%. План прамысловай вытворчасці ў 1948 годзе значна перавыканан; валавая прадукцыя прамысловасці ў параўнанні з 1947 годам складае 144%—яна дала самы вялікі прырост у СССР! Ужо адноўлены і даюць прадукцыю звыш 6 тыс. прамысловых прадпрыемстваў Беларусі. Дзейнічаюць заводы сельскагаспадарчага машынабудаўніцтва, станкабудаўнічыя заводы і многія іншыя прадпрыемствы.

Вытворчасць асноўных будаўнічых матэрыялаў у рэспубліцы перавысіла даваенны ўзровень. Адноўленыя электрасганцыі Беларусі на 16,3% перавысілі сваю даваенную магутнасць. Здабыча торфу мясцовай паліўнай прамысловасці перавысіла даваенны ўзровень на 16,7%, а мясцовая прамысловасць па выпуску валавой прадукцыі—на 66%. У велізарных размерах вырасла вытворчасць запалак, фанеры, нарыхтоўка драўніны; на прадпрыемствах Беларусі выпушчана звыш плана значная колькасць рознага роду станкоў, машын, у тым ліку саломарэзак, малатарань, дрэваапрацоўчых станкоў, радыёпрыёмнікаў, паперы, баваўняных, ільняных і шоўкавых тканін, верхняга трыкатажу; выпуск шарсцяных тканін супроць 1947 года павялічыўся ў 5,8 раза, а каўровых вырабаў—у тры разы. Рэзка ўзрасла вытворчасць кансерваў, прэсаваных дражджэй, жывёльнага масла, спірту і іншых відаў прамысловай прадукцыі.

Пры дапамозе вялікага рускага народа і другіх брацкіх народаў СССР у рэспубліцы адбываецца далейшы працэс індустрыялізацыі. Ствараюцца буйныя прадпрыемствы—трактарны, аўтамабільны, веласіпедны заводы на ўскраінах Мінска; вырастаюць домабудаўнічыя камбінаты ў Мазыры і Рэчыцы, узнікаюць суконныя фабрыкі, прадпрыемствы харчовай і лёгкай індустрыі. Пасля вайны пабудаваны і ўжо даюць прадукцыю краіне тонкасуконны камбінат, заводы інструментальны, гіпсавы і аўтагенны ў Мінску, завод «Строймашына» і лакамабільны ў Магілеве і інш.

Прамысловасць Беларусі хутка расце. Яна паспяхова з года ў год выконвае і перавыконвае дзяржаўныя планы вытворчасці. Згодна даных Дзяржплана, прамысловасць горада Мінска ўжо ў кастрычніку 1948 года па выпуску прадукцыі дасягнула даваеннага ўзроўню.

Выдатнай асаблівасцю соцыялістычнага спаборніцтва ў 1948 годзе з'явілася ўкараненне прагрэсіўных тэхніка-эканамічных норм, магутны ўсенародны рух за строгі рэжым эканоміі, за мабілізацыю ўнутраных рэсурсаў, рэнтабельную работу нашых прадпрыемстваў і звышпланавыя накапленні. Агульная звышпланавая эканомія ад зніжэння сабекошту прамысловай прадукцыі склала па СССР у 1948 годзе звыш 6 млрд. руб. Гэта яркае сведчанне нашых поспехаў мінуўшага

года. У іх мы бачым праяўленне перавагі совецкага ладу над гніючым ладам капіталізма.

За апошнія два гады велізарныя поспехі дасягнуты ў сельскай гаспадарцы нашай краіны. Яе валавая прадукцыя за 1947 год павялічылася ў параўнанні з 1946 годам на 32%. У гэтай галіне гаспадаркі на аснове ажыццяўлення гістарычных рашэнняў Лютаўскага пленума ЦК ВКП(б) былі дасягнуты ў мінулым годзе новыя вялікія поспехі. Не гледзячы на неспрыяльныя метэаралагічныя ўмовы ў большасці раёнаў Паволожжа, валавы ўраджай зерня ў цэлым па СССР склаў звыш 7 млрд. пудоў і амаль дасягнуў узроўню даваеннага, 1940 года. Сярэдняя ўраджайнасць зерневых культур з аднаго гектара перавысіла даваенны ўзровень.

Дзякуючы ўздыму зерневай гаспадаркі краіны былі паскораны ў мінуўшым годзе тэмпы развіцця грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах; значна павялічылася пагалоўе жывёлы і дасягнута сур'ёзнае павышэнне прадуктыўнасці жывёлагадоўлі.

Сур'ёзных поспехаў дасягнула і сельская гаспадарка Беларусі. Адноўлены ўсе калгасы, МТС і соўгасы. Рэспубліка атрымала велізарную колькасць жывёлы, насення, сельскагаспадарчага інвентара, выдзеленых саюзным урадам. К вясновай сяўбе 1948 года магутнасць трактарнага парка Беларусі павялічылася ў параўнанні з 1947 годам на 87,1%. Пасеўныя плошчы ў мінулым годзе дасягнулі 91,4% даваенных размераў, а па пасевах зерневых было перавышана заданне, устаноўленае планам на 1950 год. Пасеўныя плошчы ў калгасах за 1944 — 1948 гг. амаль падвоіліся; поўнасцю адноўлены даваенныя плошчы пад бульбай. План пасеву азімых культур пад ураджай 1949 года выканан калгасамі на 104%, а зяблевае ворыва на 115%. У БССР была адноўлена асушальная сістэма плошчай у 137 тыс. *га*. На калгасныя палі вывезена ўгнаенняў у два разы больш, чым у 1947 г. Калгасы рэспублікі ў мінулым годзе сабралі багаты ўраджай.

Паскоранымі тэмпамі развіваецца грамадская жывёлагадоўля на Беларусі. Пасля вызвалення рэспублікі ад нямецка-фашысцкіх войск пагалоўе буйнай рагатай жывёлы ў калгасах павялічылася ў 4 разы, свіней—у 12 разоў, авечак і коз — у 3,6 раза. Было арганізавана 25 тысяч жывёлагадоўчых ферм і пабудавана больш 25 тысяч гаспадарчых будынкаў для гэтых ферм.

Кіруемыя большэвікамі працоўныя Беларусі з чэсцю стрымалі слова, данае таварышу Сталіну: яны датэрмінова вы-

каналі план збожжанарыхтовак 1948 года к 25 жніўня — на два тыдні раней, чым у 1947 годзе. Такіх высокіх тэмпаў збожжанарыхтовак рэспубліка не ведала раней. Калгаснікі і сяляне-аднаасобнікі Беларусі чэсна выконваюць свае абавязацельствы перад совецкай дзяржавай па пастаўках усіх сельскагаспадарчых прадуктаў. У прайшоўшым годзе рэспубліка датэрмінова выканала свае планы нарыхтовак бульбы і гародніны, ільну і прадукцыі жывёлагадоўлі. Аб бліскучых выніках работы большэвікоў Беларусі сведчыць той факт, што ў 1948 годзе здана збожжа дзяржаве значна больш, чым у 1947 годзе, і на 4,6 мільёна пудоў больш, чым у 1940 годзе.

У пасляваеннай пяцігодцы хуткім тэмпам праводзіцца электрыфікацыя сельскай гаспадаркі БССР. К пачатку гэтага года вытворчасць электраэнергіі сельскіх электрастанцый рэспублікі вырасла ў 1,5 раза ў параўнанні з даваенным, 1940 годам. Шырокім фронтам разгортваюцца работы па асушцы балот Палескай нізіны.

У заходніх абласцях ідзе калектывізацыя сельскай гаспадаркі. Тут у бясспрэчных перавагах калгаснай сельскай гаспадаркі, аснаванай на буйнай машыннай тэхніцы і калектыўнай працы, пераконваюцца ўсё больш і больш шырокія слаі працоўных сялян. К лютаму 1949 года ў заходніх абласцях было створана 1060 сельскагаспадарчых арцелей, усяго ў БССР налічваецца 10 838 калгасаў, 337 МТС і 98 соўгасаў.

«На вялікім уздыме, — гаварыў таварыш Молатаў, — знаходзіцца наша краіна, дзе сям'я совецкіх народаў спаяна дружбай і сумеснай працай на карысць Радзімы, паказваючы нябачаны ў гісторыі прыклад супрацоўніцтва і брацкіх адносін паміж народамі многамільённага Совецкага Саюза» [1]).

У авангардзе барацьбы за датэрміновае выкананне пасляваеннай пяцігодкі ідуць працоўныя Масквы і Маскоўскай вобласці, у лістападзе выканаўшыя план 1948 года, узяўшыя на сябе абавязацельства выканаць пяцігадовы план па ўзроўню вытворчасці ў 3,5 года. Іх самаадданая барацьба за датэрміновае выкананне пасляваеннай пяцігодкі з'яўляецца натхняючым прыкладам для ўсіх працоўных нашай краіны.

Следуючы выдатнаму прыкладу масквічоў, ахопленыя пачуццём высокага патрыятызма, працоўныя БССР аддаюць усе свае сілы, розум і здольнасці для паспяховага выканання і перавыканання пяцігадовага плана аднаўлення і развіцця

---

[1]) **В. Молатаў.** 31-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі.

народнай гаспадаркі, за ўмацаванне эканамічнай і ваеннай магутнасці СССР.

Соцыялістычным спаборніцтвам ахоплены мільёны людзей. Дзесяткі тысяч рабочых БССР перавыконваюць нормы выпрацоўкі; тысячы стаханаўцаў прамысловасці і транспарта выканалі па 3—5 і 7 гадавых норм. Шырока разгарнулася спаборніцтва на прадпрыемствах, транспарце і ў сельскай гаспадарцы ў чэсць XIX з'езда Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі. Самаадданай барацьбой беларускага народа створаны ўсе прадпасылкі для новага, яшчэ больш магутнага ўздыму соцыялістычнай народнай гаспадаркі рэспублікі.

Рашэнні XIX з'езда Комуністычнай партыі (большэвікоў) Беларусі мабілізуюць партыйныя арганізацыі, усіх працоўных на яшчэ больш паспяховую барацьбу за датэрміновае выкананне новай сталінскай пяцігодкі, за новыя перамогі соцыялістычнай Радзімы. У чацвертым годзе пасляваеннай пяцігодкі Беларусь хутка ідзе па шляху далейшага ўздыму.

Растуць нашы гарады. За тры гады пяцігодкі ў гарадах і рабочых пасёлках СССР было пабудавана і адноўлена жылля агульнай плошчай каля 51 млн. кв. метраў. У сельскіх мясцовасцях за той-жа час пабудавана і адноўлена больш 1 600 тысяч жылых дамоў. Значна расшырылася сетка і палепшылася работа ўстаноў асветы і аховы здароўя, навукі і культуры.

Хуткімі тэмпамі аднаўляюцца і рэканструіруюцца совецкія гарады і рабочыя пасёлкі Беларусі. Па сваёй архітэктуры узноўленыя гарады будуць больш прыгожымі, чым былі да вайны. У асноўным вырашана задача ліквідацыі зямлянак — гэтага цяжкага выніку вайны. У сёлах пабудавана ўжо 375,5 тысячы дамоў. Узніклі тысячы новых добраўпарадкаваных сёл, больш 2 000 сёл і вёсак былі пабудаваны занава; з зямлянак у новыя, добрыя дамы за кароткі тэрмін пераселена больш двух мільёнаў сельскіх жыхароў. Разам з гэтым у велізарных маштабах разгарнулася жыллёвае будаўніцтва ў гарадах і рабочых пасёлках рэспублікі. Тут пабудавана ўжо і адноўлена каля 3 млн. кв. метраў жылой плошчы.

За адзін толькі 1948 год было ўведзена ў дзеянне дзяржаўнага жылога фонда 247 тыс. кв. метраў. Апрача таго, насельніцтвам за кошт уласных зберажэнняў і крэдытаў дзяржавы пабудавана ў гарадах і пасёлках гарадскога тыпу жылых дамоў агульнай плошчай 168,8 тыс. кв. метраў і ў сельскай мясцовасці — 48,6 тыс. дамоў.

Праяўляючы клопаты аб працоўных Беларусі, совецкі

ўрад выдаў забудоўшчыкам 648 млн. руб. доўгатэрміновага крэдыту, адпусціў (бясплатна) 15 млн. кубаметраў лесу.

У БССР гераічнай працай яе народа адноўлены школы, тэхнікумы, інстытуты, разгарнула сваю работу Акадэмія навук БССР; працуюць клубы, тэатры, кіно, музеі і іншыя культурныя ўстановы. Зараз у рэспубліцы дзейнічаюць 27 вышэйшых і 110 сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў — у іх займаецца студэнтаў больш, чым да Айчыннай вайны, працуюць звыш 11 788 школ, у якіх навучаецца каля 1,5 млн. дзяцей. Поўнасцю адноўлена дашкольная сетка. Значных поспехаў дабіліся беларуская совецкая літаратура і мастацтва, дасягненні якіх былі паказаны нядаўна ў Маскве.

«У гэтай вялікай стваральнай працы рэспубліка штодзённа адчувае падтрыманне Цэнтральнага Камітэта партыі, совецкага ўрада і асабіста таварыша Сталіна. Усе брацкія народы Совецкага Саюза ўдзельнічаюць у аднаўленні прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі і культуры Беларусі... З асаблівай удзячнасцю адзначаюць працоўныя Беларусі дзейсную дапамогу вялікага рускага народа, які на працягу ўсёй гісторыі беларускага народа быў яго незамянімым і верным другам. Дзякуючы брацкай дапамозе рускага народа Беларусь была вызвалена ад фашысцкай акупацыі, а цяпер паспяхова залечвае цяжкія раны, нанесеныя вайной. Брацтва рускага і беларускага народаў, усіх народаў нашай краіны непарушна!» [1]).

Заслугі беларускага народа ў барацьбе і працы высока ацэнены совецкім урадам і нашай партыяй. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Совета Саюза ССР у сувязі з 30-годдзем БССР было ўзнагароджана ордэнамі і медалямі каля 26 тыс. лепшых сыноў і дочак беларускага народа.

Ва ўсім гэтым наглядна відаць глыбокія сталінскія клопаты нашай партыі і ўрада аб совецкім чалавеку, аб уздыме яго матэрыяльнага добрабыту і задавальненні яго растучых культурных патрэбнасцей.

Кіруемы комуністычнай партыяй беларускі народ прыкладае ўсе намаганні да таго, каб датэрмінова выканаць пасляваенную пяцігодку, яшчэ больш умацаваць магутнасць совецкай Радзімы.

У багатых гаспадарчых выніках 1948 года зноў знаходзіць

---

[1]) «Слаўны юбілей Беларусі». Перадавы артыкул газеты «Правда» ад 2 студзеня 1949 года.

сваё выражэнне мудрасць нашай партыі, большэвіцкае кіраўніцтва ўсімі галінамі нашага жыцця, перавагі совецкай планавай эканомікі, жыватворчы совецкі патрыятызм нашага гераічнага народа.

Усе галіны соцыялістычнай эканомікі — прамысловасць, транспарт, сельская гаспадарка — няўхільна паднімаюцца ўгору.

У выніку бесперапыннага росту прадукцыйнасці працы, павелічэння выпуску тавараў шырокага спажывання, хуткага росту вытворчасці наогул—наша дзяржава дабілася ў мінулым годзе значнага павышэння жыццёвага ўзроўню працоўных. Накапленне патрэбных рэзерваў прадуктаў харчавання і прамысловых тавараў дало нам магчымасць адмяніць карткі, перайсці ад нарміраванага размеркавання да разгорнутага гандлю, ажыццявіць грашовую рэформу і правесці зніжэнне цэн на прадметы шырокага спажывання. А гэта садзейнічае далейшаму павышэнню ўзроўню матэрыяльнага добрабыту совецкіх людзей, аднаўленню і развіццю соцыялістычнай эканомікі і культуры, далейшаму ўмацаванню эканамічнай магутнасці соцыялістычнай дзяржавы.

У выніку зніжэння дзяржаўных рознічных цэн на прадукты харчавання і прамысловыя тавары, а таксама зніжэння цэн у кааператыўным гандлі і на калгасным рынку пакупная здольнасць совецкага рубля павысілася ў два разы. Разам з тым рэальная заработная плата рабочых і служачых павысілася ў 1948 годзе ў параўнанні з 1947 годам больш чым у два разы. Прадукцыйнасць працы рабочых у прамысловасці ўзрасла ў мінулым годзе супроць 1947 года на 15% і перавысіла даваенны ўзровень.

* * *

У выніку другой сусветнай вайны вырас і ўмацаваўся аўтарытэт Совецкага Саюза. Нязмерна ўзмацнілася совецкая дзяржава—сусветная крэпасць соцыялізма. У той-жа час устоі капіталізма яшчэ больш расхісталіся. Ад капіталістычнай сістэмы адпалі ў выніку вайны краіны цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй Еўропы, якія парвалі з імперыялізмам. У іх узнікла і развіваецца новая народная дэмакратыя; гэтыя краіны ўжо трывала ўступілі на шлях соцыялізма. У выніку вайны самыя рэакцыйныя, найбольш агрэсіўныя імперыялістычныя краіны—Германія, Італія і Японія, якія склалі аплот міжнароднай рэакцыі ў Еўропе і Азіі, былі разбіты. Глыбока патрасёна ўся

каланіяльная сістэма свету. У калоніях і залежных краінах разгортваецца і нарастае магутны нацыянальна-вызваленчы рух. Агульны крызіс капіталістычнай сістэмы яшчэ больш абвастрыўся.

Са сканчэннем другой сусветнай вайны паявіліся новыя прэтэндэнты на сусветнае панаванне. Месца фашысцкай Германіі і Японіі імкнуцца заняць імперыялісты ЗША, якія вядуць падрыхтоўку да новай сусветнай вайны. Распальваючы падрыхтоўку да новай вайны, буржуазія Амерыкі імкнецца закабаліць і заняволіць усе краіны свету. Як відаць, урокі гісторыі — крушэнне фашысцкай Германіі і яе пасобнікаў па разбою — нічаму не навучылі імперыялістычную буржуазію ЗША і Англіі.

Антыімперыялістычны і дэмакратычны лагер расце і мацнее, ён усё цясней згуртоўвае свае баявыя рады, дае адпор імперыялістам Амерыкі і іх пасобнікам. Мільённыя масы працоўных узнімаюцца на абарону сваёй нацыянальнай незалежнасці і суверэнітэта краін, на абарону элементарных правоў. На чале гэтага магутнага антыімперыялістычнага лагера стаіць наша соцыялістычная дзяржава, якая ўказвае народам шлях да лепшага будучага і прагрэса. Народныя масы ўсіх краін, вырасшыя за час вайны ў палітычных адносінах, бачаць у асобе вялікага Сталіна народнага сцяганосца дэмакратычнага міру і бяспекі, няўхільнага і вернага абаронцу свабоды і незалежнасці народаў.

Совецкі Саюз, які вынес на сваіх плячах увесь цяжар другой сусветнай вайны супроць найбольш разбойніцкага імперыялізма, вядзе міралюбівую палітыку, змагаецца за ўстанаўленне трывалага дэмакратычнага міру і дружбы паміж народамі ўсіх краін свету. Гэтая міралюбівая палітыка соцыялістычнай дзяржавы адпавядае карэнным інтарэсам і патрабаванням совецкага народа, які заняты аднаўленнем сваёй эканомікі і культуры. Наша соцыялістычная Радзіма, кіруемая многамільённай партыяй Леніна—Сталіна, узначальвае антыімперыялістычны і дэмакратычны лагер, які паставіў асноўнай мэтай падрыў імперыялізма, умацаванне дэмакратыі і ліквідацыю рэштак фашызма. Сілы соцыялізма і дэмакратыі растуць і мацнеюць з кожным днём.

Злучаныя Штаты Амерыкі і Англія ўтварылі імперыялістычны і антыдэмакратычны лагер. Яго мэта — устанаўленне сусветнага панавання амерыканскага імперыялізма, разгром дэмакратыі і народна-вызваленчага руху. Совецкі Саюз і кра-

іны новай дэмакратыі з'яўляюцца галоўнай перашкодай на шляху ажыццяўлення гэтых планаў. Таму супроць нашай сацыялістычнай дзяржавы і краін новай дэмакратыі, якія змагаюцца за трывалы мір, паўстаюць імперыялістычныя палітыкі як у ЗША, так і ў Англіі. Імперыялістычныя сілы разгортваюць сваю агрэсіўную палітыку, актывізуючыся адначасова па трох напрамках: ваенна-стратэгічныя мерапрыемствы, эканамічная экспансія, ідэалагічная барацьба.

У Злучаных Штатах Амерыкі праводзіцца мілітарызацыя ўсяго жыцця. Каля палавіны прамысловых прадпрыемстваў пераключана на вытворчасць ваенных матэрыялаў. У велізарных размерах выраслі расходы на армію, авіяцыю і флот. Імперыялістычная буржуазія і ваеншчына ЗША адрадзілі праслаўтую «тэорыю» маланкавай вайны. Таму совецкі народ павінен трымаць порах сухім.

Нажыўшая велізарныя багацці на крыві і пакутах народаў, імперыялістычная буржуазія ЗША і Англіі вынашвае ўжо планы новай вайны супроць нашай радзімы і краін народнай дэмакратыі. Імперыялісты лютуюць з поваду таго, што народы краін цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй Еўропы ў якасці вядучай сілы і благароднага маяка ў сваім руху наперад выбралі Совецкі Саюз. Але як-бы ні шаленствавалі падпальшчыкі і правакатары вайны, на прыкладзе краін новай народнай дэмакратыі яны ўбачаць пацверджанне прароцкіх слоў вялікага Леніна аб тым, што «ўсе нацыі прыдуць да соцыялізма, гэта немінуча, але ўсе прыдуць не зусім аднолькава, кожная ўнясе своеасаблівасць у тую або іншую форму дэмакратыі, у тую або іншую рознавіднасць дыктатуры пролетарыята, у той або іншы тэмп соцыялістычных пераўтварэнняў розных бакоў грамадскага жыцця» [1]).

У выніку вайны як ніколі ўмацавалася магутнасць і небывала ўзраслі аўтарытэт і ўплыў нашай соцыялістычнай дзяржавы ва ўсіх міжнародных справах—вялікіх і малых. Вайна многаму навучыла еўрапейскія народы. Узяўшы ўладу ў свае рукі ў радзе краін цэнтральнай і паўднёва-ўсходняй Еўропы, яны паставілі на чале ўрада комуністаў, якія з'яўляюцца надзейнымі барацьбітамі за новае жыццё, за нацыянальную незалежнасць і суверэнітэт сваіх дзяржаў.

Рэакцыянеры, імперыялістычная буржуазія пераацэньвалі свае сілы, палохаючы чалавецтва атамнай бомбай. Але народы не хочуць вайны. Усе сілы, якія стаяць за мір, ужо да-

[1]) Ленін. Творы, т. XIX, стар. 230.

статкова моцны; яны мужнеюць і мацнеюць. «У выніку другой сусветнай вайны,—гаварыў А. А. Жданаў,—умацаваліся пазіцыі соцыялізма. Пытанне аб соцыялізме пастаўлена ў парадак дня ва многіх краінах Еўропы». Вырваўшыся з імперыялістычнай кабалы, працоўныя краін народнай дэмакратыі закладваюць асновы свайго развіцця па новаму соцыялістычнаму шляху. Яны дабіліся ў мінулым годзе значных поспехаў. Ажыццёўленыя тут глыбокія палітычныя пераўтварэнні, нацыяналізацыя буйнай прамысловасці, радыкальная аграрная рэформа, ажыццяўленне палітыкі абмежавання і выцяснення капіталістычных элементаў, першыя крокі па шляху стварэння і росту сельскагаспадарчай кааперацыі, актывізацыя і аб'яднанне сіл рабочага класа—усё гэта стварыла трывалую аснову для паспяховага развіцця гэтых краін, для пабудовы ў іх фундамента соцыялістычнай эканомікі. Пры велізарным падтрыманні Совецкага Саюза краіны народнай дэмакратыі ажыццяўляюць пераход ад капіталізма да соцыялізма, апіраючыся на рэжым народнай дэмакратыі, які з поспехам выконвае функцыі дыктатуры пролетарыята для падаўлення і ліквідацыі капіталістычных элементаў і арганізацыі соцыялістычнай гаспадаркі.

Наша соцыялістычная дзяржава—магутны аплот вызваленчага руху ва ўсім свеце ў барацьбе супроць панавання імперыялізма—ажыццяўляе велічную праграму будаўніцтва комуністычнага грамадства, начартаную таварышам Сталіным. Мы жывем у такі час, калі век капіталізма падыходзіць к канцу. І асабліва цяпер з усёй сілай гучаць словы В. І. Леніна аб непераможнасці комунізма. «Няхай,—гаворыць ён,—буржуазія шаленствуе, злобствуе да памяшання... Буржуазія паступае, як паступалі ўсе асуджаныя гісторыяй на гібель класы... Ва ўсіх выпадках і ва ўсіх краінах комунізм загартоўваецца і расце, карэнні яго такія глыбокія, што праследаванні не аслабляюць, не знясільваюць, а ўзмацняюць яго» [1]).

Капіталізм гніе і гіне. Яму ўжо не змогуць дапамагчы ніякія намаганні яго слуг і лакеяў з лагера правых соцыялістаў—гэтых «саўдзельнікаў зверстваў і злачынстваў буржуазіі» *(Ленін)*. Сілы імперыялістычнай буржуазіі слабеюць з кожным днём, а сілы дэмакратыі і соцыялізма растуць і мацнеюць. Мудрая ленінска-сталінская знешняя палітыка соцыялістычнай дзяржавы згуртоўвае, цэментуе і натхняе ўвесь антыімперыялістычны, дэмакратычны лагер. Нашу мірную палітыку,

[1]) **Ленін. Творы, т. XXV, стар. 235.**

як указваў Ленін, ухваляе велізарнейшая большасць насельніцтва зямлі. І як-бы ні спрабавалі імперыялісты ЗША і Англіі «аб'еднаць» увесь свет (гэта значыць заняволіць яго) пры дапамозе страху, — цяпер ужо нельга запалохаць атамнай бомбай мільёны і сотні мільёнаў простых людзей. Таварыш Сталін указаў на тое, чым можа скончыцца палітыка падпальшчыкаў новай сусветнай вайны.

«Гэта можа скончыцца,—гаварыў таварыш Сталін,—толькі ганебным правалам падпальшчыкаў новай вайны. Чэрчыль, галоўны падпальшчык новай вайны, ужо дабіўся таго, што пазбавіў сябе давер'я сваёй нацыі і дэмакратычных сіл усяго свету. Такі-ж лёс чакае ўсіх іншых падпальшчыкаў вайны. Вельмі яшчэ жывы ў памяці народаў жахі нядаўняй вайны і вельмі вялікі грамадскія сілы, якія стаяць за мір, каб вучні Чэрчыля па агрэсіі маглі іх адолець і павярнуць у бок новай вайны». Вялікія бяссмертныя ідэі Леніна і Сталіна згуртоўваюць і аб'едноўваюць народы ўсяго свету. Арганізуючыся і згуртоўваючыся пад сцягамі комуністычных і рабочых партый, шырокія слаі працоўных ва ўсіх краінах свету выражаюць сваю непахісную волю да рашучага абвуздання рэакцыі з імперыялістычнага лагера. Ва ўсім свеце ідзе зараз магутны рост і кансалідацыя ўсіх сіл дэмакратыі і соцыялізма.

Вялікі правадыр і геніяльны палкаводзец Сталін вядзе совецкі народ па шляху да комунізма. «Імя Сталіна, акружанае бязмежнай павагай і любоўю народа, выражае веліч пабеданоснага Совецкага Саюза і кліча да барацьбы за шчаслівае будучае чалавецтва»,—указвае таварыш Молатаў. Велізарныя перавагі соцыялістычнай сістэмы даказаны на справе перад усім чалавецтвам. У наш век усе дарогі гістарычнага развіцця вядуць да комунізма. Мінулы, 1948 год, цалкам пацвердзіў словы таварыша Сталіна аб перавазе сіл міру над сіламі вайны, сіл дэмакратыі і соцыялізма над сіламі рэакцыі і імперыялізма. У далейшым сілы і арганізаванасць рабочага класа, сілы і згуртаванасць усяго дэмакратычнага лагера будуць расці, мацнець, у той час, як сілы імперыялістычнага лагера ўсё больш слабеюць, знясільваюцца.

Цяпер дэмакратычны, антыімперыялістычны лагер з поўнай упэўненасцю ў свае сілы глядзіць наперад. Але мы ведаем, што імперыялістычныя драпежнікі не ўступалі і не ўступяць сваіх пазіцый без жорсткай барацьбы. У новых умовах, умовах мірнага будаўніцтва, Ленін і Сталін заўсёды напамінали совецкім людзям, што наша краіна прадаўжае жыць і працаваць у капіталістычным акружэнні. Таму небяспека ве-

раломнага нападу з боку знешніх ворагаў не мінавала. «Узяўшыся за наша мірнае будаўніцтва,—гаварыў В. І. Ленін,—мы прыкладзем усе сілы, каб яго прадаўжаць бесперапынна. У той-жа час, таварышы, будзьце напагатове, захоўвайце абароназдольнасць нашай краіны і нашай Чырвонай Арміі, як зяніцу вока»... [1]).

Наша партыя, кіруемая вялікім Сталіным, свята выконвае ўказанні В. І. Леніна аб развіцці і ўмацаванні магутнасці нашых доблесных совецкіх узброеных сіл. Таварыш Сталін вучыць нас, што пакуль існуе імперыялізм і застаецца капіталістычнае акружэнне,—ёсць небяспека нападу нашых ворагаў на краіну соцыялізма, небяспека ўзнікнення новай вайны. Жадаючы бачыць свае ўзброеныя сілы яшчэ больш магутнымі, совецкі народ робіць усё неабходнае для аснашчэння іх дасканалай баявой тэхнікай, для далейшага ўмацавання і развіцця усіх родаў войск. На ўтрыманне ўзброеных сіл СССР у мінулым годзе наша дзяржава адпусціла па бюджэту 66,1 мільярда рублёў. Самаадданая праца совецкіх людзей развівае і рухае ўперад усе галіны совецкай гаспадаркі, культуры і тэхнікі. Мы ведаем, што папярэдзіць новую сусветную вайну можа толькі тая краіна, якая мае моцную эканоміку і першакласную армію.

Совецкія людзі з небывалай творчай энергіяй і сілай змагаюцца за аднаўленне і далейшае хуткае развіццё нашай народнай гаспадаркі, падымаючы ўсё вышэй магутнасць нашай краіны. Яны самааддана змагаюцца за датэрміновае выкананне плана пасляваеннай сталінскай пяцігодкі, за паспяховае завяршэнне будаўніцтва соцыялізма і паступовы пераход ад соцыялізма да комунізма. Наш народ, совецкія воіны, спаяныя непарушным маральна-палітычным адзінствам і нерастаржымай дружбай, натхнёныя гарачым совецкім патрыятызмам у барацьбе за новыя поспехі, не забываюць мудрых слоў, сказаных таварышам Сталіным:

«Развіваючы мірнае соцыялістычнае будаўніцтва,—вучыць нас вялікі Сталін, — мы ні на мінуту не павінны забываць аб прошуках міжнароднай рэакцыі, якая вынашвае планы новай вайны. Неабходна памятаць указанні вялікага Леніна аб тым, што, перайшоўшы да мірнай працы, трэба заўсёды быць напагатове, берагчы, як зяніцу вока, узброеныя сілы і абароназдольнасць нашай краіны» [2]).

---

[1]) Ленін. Творы, т. XXVII, стар. 120.

[2]) Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Міністра Узброеных Сіл Саюза ССР № 7 ад 1 мая 1946 года. Газета «Правда» ад 1 мая 1946 г.

Совецкі народ поўны рашымасці і зробіць усё, каб поўнасцю ажыццявіць гэтае ўказанне. Абараняць сваю Радзіму наш народ заўсёды лічыў сваім свяшчэнным абавязкам. У патрэбны момант ён узнімаўся на абарону сваёй нацыянальнай незалежнасці і чэсці, ішоў у бой за незалежнасць сваёй вялікай Айчыны.

Совецкія людзі добра разумеюць, што чым больш паспяхова мы выканаем пасляваенную пяцігодку, тым больш будзе здабыта вугалю, нафты, вытварана металу, машын, станкоў, хлеба, бавоўны, ільну, мясамалочных і іншых прадуктаў. Чым багацей і мацней будзе наша соцыялістычная Радзіма, тым менш шансаў у імперыялістаў развязаць новую сусветную вайну. Гэта ўмацуе абароназдольнасць краіны, зробіць непрыступнымі для нашых ворагаў рубяжы вялікай соцыялістычнай дзяржавы.

У большэвікоў існуе выдатная традыцыя. Вялікія правадыры працоўных, стваральнікі нашых узброеных сіл вучаць совецкіх воінаў і ўсіх совецкіх людзей не ганарыцца дасягнутымі перамогамі, не зазнавацца і не самасупакойвацца, не спыняцца на дасягнутым. Бо спыніцца ў ваеннай справе—значыць адстаць. А адсталых, як вядома, б'юць.

Вялікія і пачэсныя задачы совецкіх узброеных сіл! У мірны перыяд Радзіма заклікала сваю армію і флот цвёрда стаяць на варце міру і бяспекі, служыць справе абароны нашай Айчыны, быць пільнымі вартавымі па ахове вялікіх заваёў Кастрычніцкай рэволюцыі, мірнай працы совецкага народа, суверэннасці нашай соцыялістычнай дзяржавы, міру і бяспекі ва ўсім свеце.

«Мы, ваенныя людзі,—гаварыў Маршал Совецкага Саюза Н. А. Булганін,—не забываем, што жыццё ідзе наперад, што ваенная справа бесперапынна і хутка развіваецца. Таму, каб заўсёды быць на вышыні сваіх задач, нашы ваенныя кадры павінны далей развіваць і рухаць уперад совецкую ваенную навуку, — самую перадавую ваенную навуку, адпавядаючую нашаму прагрэсіўнаму грамадскаму ладу».

Наша вялікая Радзіма перажывае велізарны ўздым палітычнай актыўнасці і творчай ініцыятывы мас. Большэвіцкая партыя пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна вывела нашу краіну на шлях бязмежнага росту совецкай прамысловасці, сельскай гаспадаркі, навукі, тэхнікі, культуры. Гіганцкія пераўтваральныя работы ў нашай краіне, перамога соцыялізма, пасляваенныя поспехі прамысловасці, земляробства, навукі, тэхнікі, літаратуры і мастацтва, велізарны ўздым усёй ідэалагіч-

най работы ў краіне, рост матэрыяльнага добрабыту совецкага народа—усё гэта стварыла неабходныя ўмовы для бурнага развіцця прадукцыйных сіл нашай Радзімы. У цяперашніх умовах задача Совецкай Арміі ясна і зразумела. Яна сфармулявана ў загадзе № 85 Міністра Узброеных Сіл Саюза ССР ад 7 лістапада 1948 года:

«Увесь асабовы састаў сухапутных войск, ваенна-паветраных сіл і ваенна-марскіх сіл,—сказана ў загадзе,—абавязан і далей упорна працаваць над удасканальваннем свайго ваеннага майстэрства і палітычнай падрыхтоўкі, асвайваць і рухаць уперад совецкую ваенную навуку, узнімаць сваю тэхнічную культуру, умацоўваць дысцыпліну і павышаць пільнасць».

Інтарэсы Радзімы патрабуюць ад совецкіх воінаў нястомна рухацца ўперад па шляху ўдасканалення сваіх ведаў, павышэння арганізаванасці, умацавання воінскай дысцыпліны. Воіны Совецкай Арміі павінны дасканала авалодаць сваёй зброяй, бесперапынна павышаць сваё ваеннае майстэрства, асвайваць багаты вопыт Айчыннай вайны. Абавязак камандзіраў — вучыць войскі таму, што патрабуецца на вайне. У ваеннай справе нельга стаяць на месцы—трэба настойліва і ўпорна павышаць якасць баявой вучобы і палітычнай падрыхтоўкі.

Пастаянная і напружаная вучоба, асваенне сучаснай баявой тэхнікі, няспыннае асваенне вопыту Айчыннай вайны, павышэнне ваеннага майстэрства, ідэйна-тэарэтычнага ўзроўню — вось галоўныя задачы, якія стаяць зараз перад кожным воінам Совецкай Арміі.

Галоўнай умовай боездольнасці совецкіх войск з'яўляецца цвёрдая воінская дысцыпліна, аснаваная на высокай камуністычнай свядомасці і палітычным выхаванні нашых воінаў. Доблесныя сыны нашай слаўнай Радзімы павінны быць узорам арганізаванасці і дысцыплінаванасці. Нястомна і самааддана працаваць над выкананнем патрабаванняў Генералісімуса Совецкага Саюза вялікага Сталіна, загадаў Міністра Узброеных Сіл СССР, статутаў і настаўленняў, аддаваць усе свае веды і сілы на ўмацаванне ваеннай магутнасці соцыялістычнай дзяржавы—свяшчэнны абавязак совецкіх воінаў.

Выхаваны мудрай партыяй Леніна—Сталіна совецкі воін добра разумее, што кожны наш новы поспех у галінах гаспадарчай, ваеннай і культурнай работы совецкага народа пад вадзіцельствам правадыра партыі і народа, геніяльнага стратэга пролетарыята, найвялікшага палкаводца ўсіх часоў і народаў таварыша Сталіна набліжае нас да комунізма. А па меры на-

шага пабеданоснага набліжэння да комунізма «усё большае значэнне набывае комуністычнае выхаванне працоўных, барацьба з перажыткамі капіталізма ў свядомасці людзей. Выхаванне мас на ідэях ленінізма—вось галоўная ўмова ўсіх нашых далейшых поспехаў! Авалоданне ўсёперамагаючым вучэннем Леніна—Сталіна з'яўляецца жыццёвай патрэбнасцю для ўсіх будаўнікоў комуністычнага грамадства і перш за ўсё для нашых партыйных і совецкіх кадраў, для ўсёй нашай совецкай інтэлігенцыі» [1]). Комуністычнае выхаванне нашых воінаў у духу совецкага патрыятызма, нацыянальнай гордасці за сваю вялікую Радзіму, у духу ненавісці к капіталізму—у гэтым адна з важнейшых умоў далейшага ўмацавання магутнасці ўзброеных сіл Саюза ССР. Совецкія воіны свята выконваюць свой воінскі абавязак, развіваюць у сабе законнае пачуццё совецкай ваеннай гордасці. Яны даражаць чэсцю і баявой славай совецкіх узброеных сіл, беражна захоўваюць і памнажаюць слаўныя баявыя традыцыі Совецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.

Створаная Леніным і Сталіным, выпеставаная нашай партыяй Совецкая Армія—уступіла ў 32-і год свайго існавання на варце мірнай стваральнай працы народаў Совецкага Саюза, на варце ўсеагульнага міру і бяспекі. Усё прагрэсіўнае чалавецтва вітае і славіць гераічную армію, як вялікую армію соцыялістычнай дзяржавы, якая вызваліла свет ад пагрозы фашысцкага заняволення. Выхаваная ў духу бязмежнай любві да сваёй маці-Радзімы, большэвіцкай партыі, свайго народа, яна надзейна нясе ахову бяспекі і дзяржаўных інтарэсаў СССР. «Совецкі народ,—гаворыцца ў прывітанні масквічоў нашай арміі,—не сумняваецца, што ўзброеныя сілы нашай краіны будуць таксама непахісна стаяць на варце міру і бяспекі СССР, як стаялі на працягу 30-ці год».

Нашы совецкія воіны, выхаваныя большэвіцкай партыяй, не пашкадуюць сіл для таго, каб дастойна апраўдаць давер'е народа. Загад Міністра Узброеных Сіл Саюза ССР абавязвае нашых салдат і матросаў, сяржантаў і старшын, усе нашы ваенныя кадры «свята выконваць свой воінскі абавязак, настойліва вучыцца ваеннай справе і быць гатовымі ў любых умовах і любой цаной абараняць інтарэсы і чэсць совецкай дзяржавы».

Узброеныя сілы Совецкага Саюза, акружаныя клопатамі большэвіцкай партыі, совецкага ўрада і ўсяго совецкага на-

[1]) Газета «Правда» ад 21 студзеня 1949 года. Перадавы артыкул: «Пад сцягам Леніна, пад вадзіцельствам Сталіна — да перамогі комунізма».

рода, стаяць на варце міру і бяспекі, высока трымаюць пабеданосныя сцягі слаўнай Чырвонай Арміі, Ваенна-Паветраных Сіл і Ваенна-Марскога Флота. Пад кіраўніцтвам геніяльнага правадыра і настаўніка, найвялікшага палкаводца ўсіх часоў і народаў вялікага Сталіна воіны Узброеных Сіл, бязмежна адданыя соцыялістычнай Радзіме, бяссмертнай справе Леніна — Сталіна, справе комунізма, гатовы ў любых умовах адстаяць дзяржаўныя інтарэсы Совецкага Саюза.

★



## ЗМЕСТ


| | Стар. |
|---|---|
| Совецкая Армія — армія новага тыпу . . . . . | 6 |
| Совецкая Армія — надзейная абарона совецкай дзяржавы . . . . . | 16 |
| У гады Айчыннай вайны Совецкая Армія верна служыла Радзіме . . . . . | 31 |
| Перамога Совецкай Арміі ў Беларусі . . . . . | 46 |
| Совецкая Армія на варце заваяванага міру . . . . | 83 |

НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ
Е. Солдатенко
**СОВЕТСКАЯ АРМИЯ — ОСВОБОДИТЕЛЬНИЦА БЕЛОРУССИИ**
Государственное Издательство БССР
Минск 1949 г.

Рэдактар *Б. Зельцар*
Тэхрэдактар *Л. Прагін*
Карэктар *В. Макоўская*

АТ 00825 Падпісана да друку 4/III-49 г. Тыраж 10 000 экз.
Папера 60×84/16. Вуч. выд. арк. 5,3. Друк. арк. 6½. Зак. 82.

Друкарня ім. Сталіна. Мінск, Пушкіна, 55.

Цана 2 руб.

17315